№ 41 (399) 5 лістапада 2004 www.nn.by

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

6. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

Юшчанка перамог
СНД на мяжы геапалітычнага перавароту. старонка 8

Нацыяналізацыя кабэльнага ТБ
на Берасьцейшчыне. старонка 5

Генадзь Вугляніца
яшчэ ня ўсё расказаў. старонка 9

Сяржук Сокалаў-Воюш
«У мяне па-ранейшаму беларускі пашпарт». старонка 14

ПАЛІТЫКА

У руках клеўрэтаў

17 кастрычніка Лукашэнка закрыў шлях да паразуменьня з апазыцыяй. І аддаў свой лёс у рукі ўласных клеўрэтаў. Артыкул Юр'я Хадыкі — **старонка 10.**

З УСІХ СТАРОН

Стратэгія коштам 10 мільёнаў эўра

Эўразьвяз перавызначае стратэгію дачыненьняў зь Беларусяй. «НН» удалося азнаёміцца з новымі прыярытэтамі праграмы TACIS. **Старонка 5.**

МУЗЫКА

Да нас едзе Кавэрдэйл

10 лістапада Менск наведае монстар — Дэвід Кавэрдэйл. **Старонка 13.**

Сусьветная місія

Мэсіянскі выбар Амэрыкі

У адрозьненьне ад Эўропы, у Амэрыцы вера чалавека — зусім не прыватная справа кожнага, і тым больш прэзыдэнта. Ад кожнага кандыдата ў прэзыдэнты Штатаў чакаецца глыбокая павага да веры сваіх суграмадзян. А яны вераць у Бога і ў сусьветную місію ЗША, пакліканых распаўсюдзіць амэрыканскія каштоўнасьці свабоды і дэмакратыі на ўвесь сьвет. Выбар Джорджа Ўокера Буша, серадняка ва ўсім, акрамя палымянай веры ў Амэрыку і яе каштоўнасьці, — гэта выбар грамадзянамі ЗША мэсіянскай ролі для сваёй краіны.

Працяг на старонцы 8.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Беларусь ушанавала Дзядоў. Старонка 4.

Беларусь на парадку дня

Беларуская асацыяцыя журналістаў уганараваная Сахараўскай прэміяй за свабоду думкі. Гэтая прэмія, усталяваная ў 1988 г., штогод прысуджаецца Эўрапарлямэнтам змагарам за правы і свабоды чалавека. Летась яе ляўрэатам была ААН, да таго — лідэр Косава Ібрагім Ругова, а першую прэмію ў свой час атрымаў Нэльсан Мандэла. Дзейнасьць незалежных журналістаў, гэты «крык, што жыве Беларусь», Эўропе бачыцца справай унівэрсальнай вартасьці. Эўрапарлямэнт, дэпутатамі якога ёсьць людзі розных палітычных перакананьняў, на справе прадэманстраваў сваё прынцыповае стаўленьне да нашых праблемаў. Цяпер нават у тых краях, дзе публіка мала абазнаная з нашымі праблемамі, будуць ведаць пра іх. І матэрыяльны бок справы ня менш істотны: 50 тыс. эўра — немалы ўнёсак у справу пашырэньня свабоды слова ў Беларусі. Урачыстая цырымонія ўручэньня прэміі й сьціплага дыплёму з профілем Сахарава адбудзецца ў сьнежні ў Брусэлі.

Дык падпісвайся!

«Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага жыцьця на 16 старонках. Атрымлівай газэту сваёй душы, газэту без чужога слова штотыдзень. Цана падпіскі на месяц — 2700 рублёў на поштах або 1500 рублёў на шапікі «Белсаюздруку» ў Менску. Падпісны індэкс 63125. З Новага году «НН» будзе выходзіць на 24 старонках. Дзе найтаньней выпісаць «НН» — **старонка 16.**

Вяскоўцы зноў схавалі валун Пілсудзкага

Памятны камень з прысьвячэньнем маршалу Пілсудзкаму зьнік зь лесу пад Буцькамі, што на Вялейшчыне, напярэдадні задуманага перавозу яго на тэрыторыю польскага пасольства ў Менску. Амбасада запатрабавала тлумачэньняў ад беларускага МЗС. Валун адшукаў карэспандэнт «НН».



ЯЎГЕН ПЕТРЫКЕВІЧ

Працяг на старонцы 5.

Сызыфаў выбар

Віталь Сіліцкі

17 кастрычніка ўлада не пакінула каменя на камені ад уласнай рэпутацыі. Ці варта зноў хадзіць на выбары? Што рабіць у 2006-м?

Тое, што адбылося ў Беларусі 17 кастрычніка, а таксама да і пасьля яго, прымусіла частку беларускага грамадзтва (кажу цяпер пра тых, хто галасаваў «супраць») задумацца аб тым, што рабіць далей. На гарызонце — Фідэль Кастра ў цэнтры Эўропы, Куба бяз пляжаў і пальмаў, безнадзейнасьць даўжынёю ў жыцьцё. Хтосьці проста працягне жыць як жыў — хіба што будзе імкнуцца пазьбягаць зьяўляцца на вуліцы з «Народнай воляй» у руцэ, гаварыць пра палітыку па-за межамі кухні або заходзіць у госьці да суседа, які ўсё яшчэ ў апазыцыі. Хтосьці паспрабуе ўладкавацца ў жыцьці як яно ёсьць — «заб'е» на папярэднюю дзейнасьць і паспрабуе пайсьці ў дзяржструктуры (цяпер хіба любая праца ў Беларусі — гэта дзяржструктура). Хтосьці будзе шукаць магчымасьці зьехаць.

Раскошу быць нязгоднымі дазволяць сабе няшмат хто. Для іх дылем у жыцьці ўзьнікае яшчэ больш. Пытаньне ня толькі як жыць, але і як дзейнічаць. Ці «забіваць» на палітыку і самавыдаліцца ў дысыдэнцкае існаваньне, стаць апазыцыянэрам адносна ня толькі ўлады, але і ўсяго, што робіцца ў краіне, «выкраіць» для сябе куточак свабоды, хай і абмежаваны чатырма сьценамі кватэры і шасьцю соткамі лецішча? Ці прытрымлівацца «грамадзянскага супраціву», паводзінаў, мэтай якіх зьяўляецца не дасягненьне нейкіх палітычных мэтаў, а імкненьне засьведчыць перад іншымі і самім сабой сам факт пратэсту і няскоранасьці? Альбо працягваць бессэнсоўны па ўсіх вонкавых паказчыках удзел у чужым сьвяце жыцьця, які чамусьці надалей называецца палітыкай? Дэбаты на гэтую тэму ўжо пачаліся. Агучана пазыцыя сп.Шушкевіча, вядомы заклікі «Хартыі'97». Гэты артыкул — не аналітычная запіска на тэму «Як зрабіць так, каб Беларусь ня стала другой Кубай». Маё імкненьне — толькі пазначыць, што ёсьць для дэмакратычных сілаў, грамадзянскай супольнасьці і палітычнай апазыцыі выбар таго ці іншага шляху пасьля 17 кастрычніка.

Працяг на старонцы 3.

Мадам Жураўкова ды іншыя

Абвешчана чарговая спроба арганізаваць у Беларусі вытворчасьць легкавых аўтамабіляў. Іранскіх!.. Называюцца «Пайкан». Зь беларускага боку мэмарандум аб стварэньні ў Беларусі, на базе СЭЗ «Менск» зборачнага цэху іранскай кампаніі «Iran Khodro» падпісаў не дырэктар нейкага там ААТ «Абаранак», а старшыня камісіі палаты прадстаўнікоў Аляксей Ваганаў. Вы гатовыя перасесьці з «Гольфу» на «Пайкан» толькі таму, што пасьля выбыцьця Хусэйна стратэгічным партнэрам Беларусі абраныя аятолы?

Якраз у гэты час у Вярхоўным судзе былая кіраўніца справаў прэзыдэнта Галіна Жураўкова выказала надзею, што КДБ верне ёй $1.633.273. Са словаў абвінавачанай, гэтыя грошы здалі сьледчым яе сябры і сваякі ў якасьці кампэнсацыі за нібыта нанесеную шкоду дзяржаве, якой Г.Жураўкова не прызнае. Яна лічыць, што прыносіла краіне карысьць і стала ахвярай пастаўшчыкоў нафты, якія нікога не дапускаюць на рынак, каб трымаць завышаныя цэны на нафтапрадукты. Пракурор у адказ зьвярнуўся да суду з просьбай агучыць паказаньні, якая Г.Жураўкова давала падчас сьледзтва — і прысутныя ў залі пачулі, як яна езьдзіла ў Нямеччыну, каб атаварыцца ў бутыках, як падначаленыя падарылі ёй 300 тыс. даляраў за паўтара году…

Хто падпісаў указы аб манапольным праве жураўкоўскай «Белай Русі» на імпарт цукру, нафты й тытуню, дзякуючы чаму і зьявілася магчымасьць красьці мільёны па карупцыйнай схеме? Хто зачыняў незалежныя газэты, якія білі ў звон аб стварэньні карупцыйнае схемы? У цывілізаваных краінах палітык, кіраўніцу справаў якога падазраюць на тры мільёны, сыходзіць у адстаўку хоць бы на час сьледзтва. (Хтосьці ў Беларусі верыць, што Г.Жураўкову апраўдаюць?) А палітык, які стварыў карупцыйную схему, мае праблемы з праваахоўнымі органамі. А палітык, які зачыняе незалежныя СМІ, выклікае падазрэньні…

А толькі ў Беларусі ён працягвае кіраваць працэсам і нават, магчыма, хутка перасадзіць нас усіх за руль «Пайканаў». Спадзяюся, што гэта хоць ня гужавы від транспарту.

Барыс Тумар, tumar@tut.by

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Севярынец на волі

У сераду ля спэцпрыёмніку, што на Акрэсьціна, сябры сустракалі лідэра Маладога Фронту Паўла Севярынца і актывіста арганізацыі Артура Фінькевіча. Абодва адседзелі па 15 сутак за ўдзел у акцыі пратэсту супраць фальсыфікацыі вынікаў рэфэрэндуму.

— Каго абралі прэзыдэнтам ЗША? — было першае пытаньне Севярынца па выхадзе з «сутак». Адказам палітык застаўся задаволены.

Павал распавёў, што зь ім гутарылі прадстаўнікі спэцслужбаў, якія цікавіліся зьместам ягонай размовы зь Ерыным, запытваліся ў яго, ці будуць люстрацыі, калі апазыцыя прыйдзе да ўлады, і ці ведае ён, што некаторыя апазыцыянэры крадуць грошы.

Партыяў дэ-факта ня стане

Міністэрства юстыцыі даслала папярэджаньні ўсім дэмакрытычным партыям, што ўваходзяць у «Пяцёрку+» з патрабаваньнем да 1 лютага 2005 г. правесьці перарэгістрацыю нізавых суполак — па офісных памяшканьнях ці прыватных дамах з асобным уваходам. У іншым разе Мінюст пакідае за сабой права рэагаваць «згодна зь дзейным заканадаўствам». Ліст датаваны 18 кастрычніка — адразу па рэфэрэндуме.

Паводле кіраўніка арганізацыйна-праўнай камісіі ПБНФ Уладзімера Лабковіча, перарэгістрацыя закране 90% партыйных суполак, прытым што знайсьці юрыдычныя адрасы для апазыцыйных партый амаль немагчыма. Дагэтуль усе невялікія суполкі былі зарэгістраваныя па хатах. Спыненьне ж рэгістрацыі пазбавіць партыі магчымасьці вылучаць кандыдатаў у адпаведных акругах і ўвогуле дзейнічаць. Такім чынам, дзейнасьць партый будзе спыненая без фармальнае забароны іх Вярхоўным судом.

Аналягічная прычына — «няправільны» юрыдычны адрас — выкарыстоўвалася Мінюстам пры закрыцьці 58 грамадзкіх арганізацыяў у 2003—2004 г.

Лідэры партый выступілі з рэзкім пратэстам, які пакуль ня выклікаў рэакцыі Мінюсту.

Аркадзь Шанскі

Прэмію Янкі Юхнаўца атрымаў Макс Шчур

3 лістапада ў Нью-Ёрку быў абвешчаны першы ляўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Юхнаўца. Ім стаў Макс Шчур з Чэхіі, уганараваны за раман «Там, дзе нас няма». За раман М.Шчура, які нідзе не друкаваўся і быў дасланы на разгляд у рукапісе, прагаласавалі трое зь пяці сяброў Прэміяльнага камітэту.

3 лістапада паэту Янку Юхнаўцу споўнілася б 83 гады.

Алег Раявец

Гутарка зь сябрам прэміяльнае камісіі Сержуком Сокалавым-Воюшам на **старонцы 14.**

Звольнены з «Транзытбанку»

Актывіст Аб'яднанай Грамадзянскай Партыі магістар эканамічных навук Дзяніс Арцюшкевіч, асуджаны за ўдзел у акцыі 19 кастрычніка, 1 лістапада быў звольнены з працы з ЗАТ «Менскі транзытны банк». Іншыя паведамленьні хронікі рэпрэсій і супраціву — **старонка 11.**

Сындром Атрошчанкі

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У выдаўцоў «Белорусской деловой газеты» новы клопат. У судзе Кастрычніцкага раёну сталіцы разглядаецца пазоў кіраўніка тэатру «Хрыстафор» Яўгена Крыжаноўскага да «БДГ» і яе карэспандэнта Сяргея Сацука. Ён патрабуе 100 млн руб. з газэты і 20 млн руб. з карэспандэнта за сакавіцкую публікацыю пра фінансавыя махлярствы ў фірме «Хрыстафор-Клірынг». Раней Крыжаноўскі ўжо выйграў справу аб абароне гонару і годнасьці. «БДГ» тады надрукавала кароткае абвяржэньне, што не задаволіла артыста.

АЛЕСЬ МАТАФОНАЎ

Год «Адкрытаму архіву»

Тэлеперадача «Адкрыты архіў» адзначае першы год свайго існаваньня й аднаўляе выхад. Пастаянная «прапіска» — Першы нацыянальны тэлеканал, час — у 19.35 у першыя два аўторкі кожнага месяца (паўтор — у наступную раніцу). 9 і 16 лістапада выйдзе дзьвюхсэрыйны фільм «У краіне цмокаў» з удзелам археоляга Ніны Здановіч, літаратуразнаўцы Пятра Васючэнкі, герпэтоляга (знаўцы зьмеяў) Руслана Навіцкага. Фільм распавядае пра старажытных міталягічных істот — цмокаў і зьвязаных зь імі яшчараў, зьмеяў і г.д. Здымкі вяліся ў Полацку, а таксама на апетым Янам Баршчэўскім возеры Нешчардзе.

Адам Воршыч

На фота: вядоўца «Архіву» Алесь Матафонаў

Дырэктара сышлі за сумленнасьць

Першай ахвярай выбараў ды рэфэрэндуму ў Воршы стаў дырэктар СШ №20 Уладзімер Юржыц. Ледзь ці не на наступны пасьля 17 кастрычніка дзень ён нечакана падаў заяву аб добраахвотным звальненьні з пасады. Яснага тлумачэньня гэтаму ўчынку пэдагагічны калектыў дагэтуль ня мае. Але кажуць, што галоўнай прычынай раптоўнага сыходу стала галасаваньне, дакладней, ягоныя вынікі, на ўчастках, разьмешчаных у гэтай школе — самай буйной у Воршы. Так, на ўчастку, камісія якога была амаль цалкам сфармаваная з настаўнікаў СШ №20, кандыдат ад улады — начальніца гарадзкога аддзелу адукацыі Людміла Анікеева — набрала амаль столькі ж галасоў, як яе галоўны супернік Генадзь Ананьеў (АГП). Да таго ж, на пытаньне рэфэрэндуму адмоўна адказаў 761 чалавек, у той час як на суседнім участку ў гэтай жа школе, камісія якога была сфармаваная з работнікаў ільнокамбінату, адказалі «не» на пытаньне рэфэрэндуму нібыта ўсяго 119 выбарцаў. Дарэчы, школа, якой апошнія гады ён кіраваў, адна з найлепшых у горадзе, а сам дырэктар распрацаваў кампутарную праграму кіраваньня навучальным працэсам, якая была рэкамэндаваная для ўсёй краіны.

Яўген Жарнасек, Ворша

ПОШТА РЭДАКЦЫІ

Ірваліся да ўлады ці гняліся на гаршку, або Цалаваньне даганяючы

Я сябар адной з антылукашэнкаўскіх партый і таксама расчараваны адсутнасьцю ў маім парткіраўніцтве смаку да барацьбы, азарту змаганьня, волі да перамогі і жаданьня прыйсьці да ўлады. Лукашэнкаўскі штамп занадта перабольшвае, кажучы, што «апазыцыя рвецца да ўлады».

Каб жа рвалася!

Мінулі выбары. Дыктатура прайграла іх дэ-юрэ, але выйграла дэ-факта. Слабая ўцеха.

Апазыцыя не вяла аніякае контрапрапаганды, спасылаючыся на фінансавыя цяжкасьці.

Калі ў вас няма грошай, каб выдаваць хоць бы ўнутрыпартыйны бюлетэнь — вучыцеся ў Леніна! — накладам 4х299 асобнікаў, займайцеся палітыкай з жонкай у кухні! Але так жа ёсьць!

Працяг на старонцы 11.

Самы танны «ARCHE»

Часопіс «ARCHE» абвесьціў падпіску на 2005 год па надзвычай нізкай цане — 2360 рублёў за нумар. Такім чынам рэдакцыя хоча кампэнсаваць нэгатыўны ўплыў на продажы з прычыны забароны прадаваць выданьне ў кнігарнях «Белкнігі». Часопіс выходзіць з пэрыядычнасьцю раз на два месяцы. Падпісны індэкс 00345. Падпіску можна аформіць на ўсіх аддзяленьнях пошты.

ЖАРТ

Заява Цэнтравыбаркаму ЗША

У выбарчай скрыні, якую вазілі ва ўнутраную турму КДБ Беларусі амэрыканскаму грамадзяніну Ілю Мафтэру, былі выяўленыя 310 бюлетэняў. За Керы і за Буша аддадзена па 5 галасоў, і яшчэ трыста — за тое, каб дазволіць Аляксандру Лукашэнку браць удзел у прэзыдэнцкіх выбарах.

Сызыфаў выбар

Працяг са старонкі 1.

Усе пытаньні пра мэтады палітычнай барацьбы зводзяцца да двух. Ці дэмакратычныя сілы ўсё яшчэ разьлічваюць на перамогу пры сваім жыцьці? І ці разьлічваюць яны пры гэтым на ўласны народ? Гэты артыкул — не аналітычная запіска на тэму «Як зрабіць так, каб Беларусь ня стала другой Кубай», а спроба ацаніць, што азначае для грамадзянскай супольнасьці і палітычнай апазыцыі выбар таго ці іншага шляху ва ўмовах, калі ўсе наступныя выбары могуць зводзіцца да канкурэнцыі Лукашэнкі і Гайдукевіча.

Здавалася б, удзел у выбарах, калі іх вынікі становяцца амаль вядомымі за паўгоду, — гэта сьвядомае ўхваленьне карнавалу з выбарчымі скрынкамі і бясплатным пойлам, мастацкай самадзейнасьцю і амонаўскімі дубінкамі, сонечным тварам прэзыдэнта і жалезабэтонным маналёгам аўтараў наступных «Сейбітаў хаосу», спадарыняй Ярмошынай на фоне мультымэдыйных экранаў і спадаром Лябедзькам у інвалідным вазку. Іншымі словамі — наўмысная легітымізацыя, «наданьне высакароднасьці» ўладзе. Да таго ж, неўзабаве могуць зьнікнуць і мэханізмы выкарыстаньня электаральных мерапрыемстваў, арганізаваных уладай, дзеля нейкіх прапагандысцкіх мэтаў. Невядома, ці знойдуць мужнасьць выбаршчыкі адказаць на пытаньні экзыт-полаў праз два гады (да таго ж, ці будуць гэтыя экзыт-полы, калі апошні, вядома, не ЭКАОМаўскі, быў арганізаваны амаль цудам). Невядома, ці ня будуць распрацаваны такія адміністрацыйныя тэхналёгіі, дзякуючы якім страшна будзе паказаць нават фігу ў кішэні ў форме бюлетэня, у якім прастаўлены крыжык насупраць прозьвішча апазыцыянэра. Невядома, ці будзе нават сама магчымасьць праставіць гэты крыжык, — а хто сказаў, што ўсе наступныя выбары ў Беларусі ня будуць праводзіцца з удзелам выключна Лукашэнкі і Гайдукевіча?

Усе пытаньні пра мэтады палітычнай барацьбы зводзяцца да двух. Першае — ці дэмакратычныя сілы ўсё яшчэ разьлічваюць на перамогу пры сваім жыцьці? Другое — ці разьлічваюць яны пры гэтым на ўласны народ? Ціхае дысыдэнцтва — гэта, вядома, адмоўны адказ на абодва пытаньні. У той жа час пераход да вулічнай барацьбы — гэта паварот сьпінай да ўласнага грамадзтва. Адлегласьць ад Чыжоўкі ды Малінаўкі да Кастрычніцкай плошчы вызначаецца зусім не кілямэтрамі ці хвілінамі праезду на аўтобусе — яна мерыцца страхам і нявер'ем у саму магчымасьць зьмен. Стаўшы ў позу «Хай гара ідзе да Магамэта», мы мала каго дачакаемся — як было і некалькі гадоў таму, калі хадзіць на мітынгі было куды бясьпечней. Чарговы пэрформанс з эксклюзіўным правам на інтэрпрэтацыю БТ-1 загоніць беларусаў глыбей у страх і нявер'е. Кадры «слабай» апазыцыі, якая ня мае падтрымкі ў насельніцтва, папоўняцца яшчэ сотнямі мэтраў кінастужкі. Грамадзянскі супраціў заўважаць хіба што за мяжой — і то ня ўсе. У сьвеце хапае дыктатур, дзе прыхільнікі дэмакратыі змагаюцца ў сапраўды нечалавечых умовах.

Нават самыя заўзятыя праціўнікі ўдзелу ў выбарах пагодзяцца, што ўдзел у кампаніі, нават самай безнадзейнай, паходы па кватэрах, нават калі яны суправаджаюцца затрыманьнямі і нападамі а-ля гоп-стоп, усё ж такі лепшы спосаб данесьці альтэрнатыву да грамадзтва, чым зусім ужо ня масавыя акцыі (18 кастрычніка — выключэньне, якое толькі пацьвярджае правіла: гэта была пасьлявыбарчая акцыя). Аднак навошта ўсё гэта, калі ўдзел у выбарах ня мае працягу і ўсе застаюцца пры сваіх — улада пры ўладзе, апазыцыя пры маральнай перамозе, якую акрамя замежжа ніхто не прызнае?

Што ж, давайце паглядзім яшчэ раз, што здарылася 17 кастрычніка і пасьля яго. Абяцалі не пакінуць каменя на камені ад апазыцыі. Аднак застацца без прадстаўніцтва ў парлямэнце — апазыцыі не прывыкаць. Насамрэч улада не пакінула каменя на камені ад уласнай рэпутацыі. Як мінімум — у навакольным сьвеце. Аднак таксама — сярод усіх тых, хто прагаласаваў «супраць». Яны не паверылі — і іх шмат. Нічога лепшага, каб абудзіць масавы недавер да ўлады, каб ня проста паказаць яе як антыдэмакратычную і рэпрэсіўную, а ўзьняць на сьмех унутры і звонку, — нічога больш эфэктыўнага, чым удзел у выбарах, хай і ў выбарчым фарсе, прыдумаць нельга было б. Дарэчы, тое самае тычыцца і афіцыйных СМІ. Улада мусіла рабіць штосьці з апазыцыяй. І мусіла рабіць гэта так, што заўважылі далёка не адзінкі. Хто ўсё яшчэ клапоціцца пра тое, што ўдзел апазыцыі ў лукашэнкаўскіх выбарах прывядзе да яго міжнароднай легітымізацыі, — параўнайце рэакцыю на падзеі 17 кастрычніка і на выбары ў палату ў 2000 г. Тады мы сапраўды былі за два крокі да легітымізацыі — у параўнаньні зь сёлетнімі, безапазыцыйныя (але фармальна не безальтэрнатыўныя) выбары чатырохгадовай даўніны былі амаль чыстымі (у сэнсе, як халасьцякі сартуюць бялізну — брудная і брудная, але можна насіць).

> Адлегласьць ад Малінаўкі да Кастрычніцкай плошчы вызначаецца не кілямэтрамі, а страхам і нявер'ем у саму магчымасьць зьмен.

Вядома, тое, што робіцца ўнутры краіны, нашмат больш важна, чым тое, што аб ёй гавораць звонку. А тут, у Беларусі, за зьмены пакуль яшчэ далёка не абсалютная большасьць. Незалежна ад таго, каму мы больш верым, Гелапу ці Лідзіі Ярмошынай, відавочна — за Лукашэнку ўсё яшчэ галасуюць да халеры шмат. Частка зь іх робяць гэта без усялякага прымусу. Іншыя лёгка паддаюцца прапагандзе ў дзяржаўных мэдыях (ды як такой не паддасіся!). Піяр-кампанія рэжыму была не такой дубовай, як яе часьцяком ацэньваюць незалежныя аналітыкі. Некаторыя з ролікаў, якія шалёна круціліся, пачынаючы з 21:00 7 верасьня, сапраўды выбівалі сьлязу ў памяркоўных беларусаў (як у тым анэкдоце пра тры чэрапы Васіля Іванавіча: «Ну куды вы лезеце, дачнік, лекцыя ж для калгаснікаў!»). Рэйтынг Лукашэнкі нядрэнна паднялі і міліцыянты з аманаўцамі, што старанна адсякалі апошнія наяўныя інфармацыйныя альтэрнатывы (газэты, улёткі) ад выбаршчыкаў. Аднак — паводле зьвестак таго ж Гелапа, з тых заўзятых лукашыстаў, якія пазнаёміліся з апазыцыйнымі праграмамі, з альтэрнатыўным пунктам гледжаньня, амаль чвэрць прагаласавала супраць трэцяга тэрміну! Што з гэтага вынікае? Калі апазыцыя ўсё ж такі разьлічвае на народ, за яго ёй яшчэ трэба доўга змагацца. Але гэтае змаганьне не такое бясплённае, як можа падацца.

Лічбы прыхільнікаў і апанэнтаў зусім не такія неадэкватныя, як здаецца прапанэнтам «грамадзянскага супраціву». Каб такі супраціў меў нейкі плён, апазыцыя (альбо дысыдэнцкі асяродак) павінны мець за сабой велізарны маральны, культурны капітал, які б рабіў іх справу бясспрэчна «правай» з пункту гледжаньня грамадзтва. У ідэале — уласнага Папу. У нас жа нават няма і свайго патрыярха Паўла, які, пасьля доўгага спрыяльнага маўчаньня на адрас Мілошавіча, урэшце дапамог дэмакратычнай рэвалюцыі. Супраць нас і дамінуючая царква, і створаная ўладамі эліта (удзел у выбарах на баку ўлады дырэктара Купалаўскага тэатру — гэта знакавая падзея), і мэдыі, і спартоўцы — акрамя адзінак, якіх, аднак, круцяць па тэлеку толькі ў адмысловых праграмах. Спадзявацца няма на каго. Толькі на саміх сябе. І на тых, хто з намі ў кухонных размовах.

Дарэчы, у таго, што адбылося 17 кастрычніка, ёсьць і яшчэ адна недасказаная гісторыя. Паводле іншых даных таго ж Гелапа, якія не атрымалі вялікага рэзанансу, пераважная большасьць тых, хто на рэфэрэндуме прагаласаваў «супраць», на парлямэнцкіх выбарах галасавалі за прэтэндэнтаў ад дэмакратычных сіл — «Пяцёркі+», Эўрапейскай кааліцыі ды «Рэспублікі». Дэмакратычная апазыцыя сапраўды набірала галасы. Колькі — падлічыце самі, гэта залежыць ад таго, якім зьвесткам аб выніках галасаваньня вы верыце. Але для тых, хто ня згодны з вэрсіяй Лідзіі Ярмошынай, павінна быць відавочна: сярод той часткі грамадзтва, якая не падтрымлівае Лукашэнку, пошук палітычнай альтэрнатывы лягічна прыводзіць да падтрымкі дэмакратаў. Гэтага ня здарылася б, калі б дэмакратаў зусім не было на лякатары грамадзкай увагі альбо калі б яны прысутнічалі выключна ў «пяцімінутках нянавісьці» ў выпусках БТ (з пачатку году ў кожным выпуску штотыднёвай праграмы «Ў цэнтры ўвагі» як мінімум адзін сюжэт быў прысьвечаны выкрыцьцю апазыцыі, і ён працягваўся прыкладна пяць хвілін — Оруэл быў бы ўражаны). Акрамя таго, калі за апазыцыю сапраўды галасавала нямала людзей, гэта сьведчаньне таго, што дзяржаўная прапаганда пры ўсёй неабмежаванасьці рэсурсаў, якія ў яе ўкідваюцца, не спрацоўвала. Удзельнічаючы ў выбарах, нават такіх, якія яны ёсьць сёньня ў Беларусі, апазыцыя можа рэальна пашыраць сваю сацыяльную базу. Хай гэта будуць людзі, якія потым ня выйдуць на вуліцы, каб абараніць сваю волю выбаршчыка, — яны як мінімум будуць ведаць, што Лукашэнку існуе альтэрнатыва, якая гэта альтэрнатыва і што яны яе падтрымліваюць.

Безумоўна, ужо зразумела, што схема «югаслаўскага варыянту» ў Беларусі не спрацоўвае. Безумоўна, вырашыць усе пытаньні выключна выбарамі ня ўдасца. Вядома, што і ўлада ня сьпіць: цяпер, калі праз выбары нельга нават стварыць парлямэнцкую апазыцыю, калі назіраньне пераварылася ў недарэчнасьць, калі да падліку галасоў дапускаецца хіба абмежаванае кола асобных грамадзян (ці асобнае кола абмежаваных грамадзян), — улада сама будзе лічыць кожнага, хто яшчэ хоча ўзяць удзел у выбарах, патэнцыйным рэвалюцыянэрам, як мінімум правакатарам, з усімі наступствамі. Аднак пакуль нас не крытычная маса, пакуль лукашыста можна сустрэць праз крок, пакуль астатнія альбо баяцца, альбо думаюць «А хто яшчэ?» — прыйдзецца займацца сызыфавай выбарчай працай. Адзін раз камень можна будзе і дапхаць да гары — калі і не праз выбары, то шмат у чым дзякуючы ім — праца зь людзьмі ніколі не залішняя. А як сядзець унізе і чакаць пад'ёмнага крана — камень там і застанецца.

> Ціхае дысыдэнцтва, як і пераход выключна да вулічнай барацьбы — гэта паварот сьпінай да ўласнага грамадзтва.

НІСЭПД ставіць пад сумнеў вынікі рэфэрэндуму

НІСЭПД прэзэнтаваў вынікі апытаньня, праведзенага ў час рэфэрэндуму й выбараў. З апытаньняў 37 тыс.чалавек 14—17 кастрычніка вынікае, што «за» на рэфэрэндуме прагаласавалі 48,4% выбарцаў (памылка — менш за 1%), а асобныя кандыдаты ад апазыцыі (напрыклад, Уладзімер Колас) прайшлі ў дэпутаты. Кіраўнік НІСЭПД Алег Манаеў лічыць, што галоўная задача апазыцыі — як мага хутчэй данесьці гэтыя вынікі да грамадзтва.

Вуглік у Мастах

У гарадзенскую абласную больніцу патрапілі 4 жыхары Мастоў з падазрэньнем на вуглік. У Горадню выехала дзяржаўная камісія для праверкі дыягназу.

Літва: кааліцыйныя перамовы ў тупіку

Сацыял-дэмакраты Альгірдаса Бразаўскаса і папулісты зь Сялянскай партыі (Казімера Прунскене) і Партыі працы (Віктар Успаскіх) ня здолелі стварыць уладную кааліцыю. У новым урадзе сацыялісты павінны былі мець 7 міністраў, Партыя працы — 5, Сялянская партыя — 1. Бразаўскасу прызначалася крэсла прэм'ер-міністра, Паўлаўскасу — маршалка Сэйму. К.Прунскене запатрабавала 2 міністэрскія партфэлі, чым сарвала падпісаньне дамовы.

ПБНФ рыхтуецца да 2006 г.

Сойм Партыі БНФ 30 кастрычніка прааналізаваў вынікі выбараў і рэфэрэндуму. Пазытыўнымі вынікамі кампаніі ПБНФ называе няздольнасьць рэжыму сумленна перамагчы на рэфэрэндуме, масавы дыялёг партыі з грамадзтвам, умацаваньне кааліцыі «Пяцёрка+». Прыярытэтам на бліжэйшыя гады названыя ўмацаваньне міжпартыйнай кааліцыі й прарыў інфармацыйнай блякады. На думку фронтаўцаў, ёсьць умовы для дэмакратычных зьменаў у Беларусі ў 2006 г.

Юбілей у Таронце

Найстарэйшая беларуская праваслаўная парафія ў Канадзе — Сьв.Кірылы Тураўскага ў Таронце — адзначыла 50-годзьдзе. У 1954 г. яе заклала паваенная эміграцыя як асяродак Беларускай праваслаўнай аўтакефальнай царквы на чужыне.

Новае пра Луцкевіча

Знайшліся новыя дакумэнты, датычныя сьмерці прэм'ера БНР Антона Луцкевіча ў сталінскай вязьніцы. Ягоная сваячка Маргарыта Пярова адшукала сьведчаньні, што ён памёр 23 сакавіка 1942 г. ад паралюшу сэрца і пахаваны ў Саратаве на зачыненых могілках. У труну паклалі шыльду з прозьвішчам і нумарам справы — 1100. На магіле паставілі шыльду зь літарай «Б».

Галадоўка ў Ваўкавыску

Працягваецца галадоўка пратэсту Мікалая Аксаміта. Гэты назіральнік на выбарах патрабуе разбору фактаў фальсыфікацый у Ваўкавыскім раёне. Да яго далучыліся актывісткі дэмакратычных партый Валянціна Салдатава й Сьвятлана Хасанава.

Эбадзі супраць ураду ЗША

Нобэлеўская ляўрэатка Шырын Эбадзі падала ў суд на ўлады ЗША, якія не дазваляюць друкаваць яе ўспаміны ў Амэрыцы. Эканамічныя санкцыі супраць Ірану распаўсюджваюцца таксама на друк і продаж кніг, напісаных іранскімі грамадзянамі.

АШ; БелаПАН, svaboda.org, gazeta.pl

ЮЛІЯ ДАРАЦКЕВІЧ

Быкаўскі камень

Увечары на Дзяды, 2 лістапада, пры сьвятле зьнічоў і тэлевізійных юпітэраў на магіле Васіля Быкава быў асьвячоны надмагільны камень.

З прамовай выступіў пасол Фінляндыі ў Літве і па сумяшчальніцтве ў Беларусі Ціма Лахелма, што прыехаў на ўрачыстасьць зь Вільні. Як вядома, надмагільны валун быў прывезены зь Фінляндыі да Вільні на сродкі гораду Хельсынкі. Пад бел-чырвона-белымі сьцягамі пашану слыннаму пісьменьніку аддалі паслы ЗША, Расеі, Італіі, Францыі, Літвы, Нямеччыны, Чэхіі, Латвіі, Вялікабрытаніі, Славакіі, генконсул Эстоніі, прадстаўнік польскага пасольства. «Васіля Быкава лічаць сумленьнем Беларусі. Я часта сьцьвярджаю ў сваіх інтэрвію, што, як мне здаецца, Беларусь — гэта сумленьне Эўропы», — зазначыў у сваёй прамове, як заўжды, па-беларуску, амэрыканскі пасол Джордж Крол. І як заўжды, нікога не было ад улады.

Словы памяці сказалі сябры Быкава Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Валянцін Тарас. Р.Барадулін прачытаў адмыслова напісаны верш «Векамень»:

Векамень — сын ледавіка сівога,
На пасьвішчах сьцюдзёных гадаваны,
Падушкай мулкаю людзкой пашаны
Лёг, каб прысьніла зябкі сон трывога.
З апосталам зажураным трывога
Маўкліва лёс выгнаньніцкі дзяліла.
Трымацьме ўкамянелы сум магіла,
Каб сьветла йсьці душы да Пана Бога.

Прамаўлялі маладзейшыя літаратары — старшыня Саюзу пісьменьнікаў Алесь Пашкевіч і паэт Андрэй Хадановіч. «Прыкладаў, каб надмагільле пісьменьніку ахвяравалася сталічным горадам іншай дзяржавы, не было ў гісторыі літаратуры — ня толькі беларускай, але і сусьветнай. Хай жа гэты камень застанецца загадкай Быкава», — зазначыў Уладзімер Няклаеў.

Удава Быкава спн.Ірына моўчкі стаяла ўсю цырымонію, прыкрываючы твар каўняром паліто. Толькі ў вільготных вачах адбіваліся агеньчыкі шматлікіх сьвечак.

Зьміцер Дзядзенка

Маўклівыя Дзяды

Сёлетнія Дзяды ў Курапатах упершыню сталіся «маўклівымі»: абласныя і раённыя ўлады не дазволілі мітынгу. Традыцыйнае шэсьце ад гадзіньнікавага заводу сабрала напачатку каля 300 чалавек. Шэсьце гарадзкія ўлады дазволілі, але таксама з абмежаваньнем — не выходзіць на праезную частку (зазвычай усё ж адну паласу дарогі вылучалі). Забарона на мітынг у Курапатах выкарыстоўваецца ўпершыню. Некалькі гадоў таму ўлады забаранілі шэсьце, але дазволілі мітынг. Сёлета арганізатарам адмовілі, матывуючы адсутнасьцю дамовы з мэдыкамі й міліцыяй. «Я спытаў: з каго вы хочаце грошы ўзяць за наведваньне Курапатаў? Са сьвятара Сабілы, які 13 гадоў адседзеў у ГУЛАГу? З Маі Кляшторнай, якая страціла тут свайго бацьку? У прыватных размовах яны ўсё разумеюць, але дазволу не даюць», — распавёў заяўнік акцыі, лідэр Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі Юрась Беленькі.

Як заўжды, па дарозе на Курапаты шэсьце вырасла — да паўтысячы ўдзельнікаў. Гэткай жа традыцыяй становіцца праезд каго-небудзь з удзельнікаў у тралейбусе ўздоўж калёны з вывешаным у акно бела-чырвона-белым сьцягам.

Не было відаць у «дзядоўскім» шэсьці палітыкаў — апрача актывістаў КХП-БНФ, у калёне ішоў толькі Мікола Статкевіч. Затое былі грамадзкія дзеячы — Алег Трусаў, Лявон Баршчэўскі, Эдвард Зайкоўскі. Шыхтамі пад вялізным нацыянальным сьцягам ішлі каля трох дзясяткаў «зуброўцаў» — у тым ліку і ўдзельнікі нядаўніх акцый на Кастрычніцкай плошчы, якія толькі-толькі вызваліліся пасьля адседкі.

Адметнасьцю сёлетніх Дзядоў стала і празьмерная колькасьць «сілавікоў». У дварах вуліцы Мірашнічэнка каля Курапатаў стаялі шматлікія аўтобусы АМАПу і машыны ўнутраных войскаў. Некалькі машын і аўтобусаў яшчэ стаялі й каля саміх Курапатаў. Але пакуль шэсьце наблізілася, амапаўцы і ўнутраныя войскі былі адвезеныя па кальцавой дарозе крыху ўбок.

Мітынгу не было. Нават малебну ня ладзілі. Пасьля супольнай малітвы за Беларусь над Курапатамі залунаў «Магутны Божа». Шматлікія «хранікёры ў цывільным» адзьнялі для гісторыі і малітву, і ўсталяваньне крыжоў, якім скончылася акцыя.

Аркадзь Шанскі

ЮЛІЯ ДАРАЦКЕВІЧ

АДУКАЦЫЯ

Акадэмік Міхайлаў: Міністэрства спорту ня можа прызначыць чэмпіёна сьвету

«КОМСОМОЛЬСКАЯ ПРАВДА»

«У глябальным грамадзтве адзіным крытэрам зьяўляецца прызнаньне прафэсійнай супольнасьці». Акадэмік Анатоль Міхайлаў, рэктар Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту, які знаходзіцца на навуковай стажыроўцы ў Гарвардзкім унівэрсытэце ў ЗША, адказвае на пытаньні «НН».

ЭГУ шукае формы дзейнасьці безь ліцэнзіі Мінадукацыі

— Сп. Анатоль, большасьць студэнтаў ЭГУ перайшла ў іншыя ВНУ ў Беларусі, але значная частка выехала на далейшае навучаньне за мяжу. Ці ідзе праца над стварэньнем унівэрсытэту ў выгнаньні?

— Мы атрымоўваем усё новыя прапановы з розных унівэрсытэтаў. Гэта ўнікальны прыклад акадэмічнай салідарнасьці. Нас змусілі пайсьці зь Беларусі. Але мы жывём у такія часы, калі любая лякальная легітымізацыя дзейнасьці — акрэдытацыя, дзяржаўнае прызнаньне — мае адносны характар. Мы жывём у глябальным грамадзтве. Адзіным сапраўды важным крытэрам зьяўляецца прызнаньне прафэсійнай супольнасьці. Нельга загадам Міністэрства спорту прызначыць кагосьці на Беларусі чэмпіёнам сьвету. На жаль, Міністэрства адукацыі дзейнічае менавіта так, і, калі яно кажа «прызнаныя дзяржавай дыплёмы», я хацеў бы задаць пытаньне: якая сапраўдная якасьць гэтых прызнаных дзяржавай дыплёмаў у галіне гуманітарных і сацыяльных навук, калі ўсё ў іх было зьнішчана і сёньня няма нічога супольнага з тым, што называецца філязофіяй, эканомікай або правам у цывілізаваным грамадзтве? Такім чынам падыходзячы да гэтай праблемы, мы вырашылі знайсьці спосаб стварэньня праграм, якія не падлягаюць кантролю міністэрства. Ня ўсё, што адбываецца ў сусьветнай адукацыйнай прасторы, рэгламэнтуецца беларускім Міністэрствам адукацыі. Ёсьць іншыя краіны, іншыя прынцыпы ацэнкі і іншыя крытэры адбору — ёсьць Сарбона, Гарвард, Кембрыдж. А тое, што робяць мясцовыя чыноўнікі і што яны кажуць пра дзяржаўнае прызнаньне дыплёмаў, няхай спачатку прызнае сусьветнае грамадзтва. Я думаю, што з гэтага крызісу мы выйдзем больш моцнымі.

— Якім чынам можа выглядаць навучаньне ў новых умовах?

— Мы цяпер ствараем тое, што называецца «distance learning» (навучаньне на адлегласьці). Ужо дзейнічае наша інтэрнэт-старонка (www.ehu-international.org), каб студэнты ня трацілі кантакту паміж сабой.

Мы знойдзем таксама і спосаб існаваньня ў Беларусі. Нас пазбавілі ліцэнзіі, але яна нам не патрэбна, бо нясе за сабой абсурдныя патрабаваньні з боку міністэрства. Ёсьць іншыя спосабы прызнаньня прафэсіяналізму. Дыплёмы Гарварду ці Бэрклі ў ЗША ня мусяць мець дзяржаўнага прызнаньня, яны маюць прафэсійнае прызнаньне. Цяпер сумесна з нашымі партнэрамі мы ствараем такія праграмы, каб якасьць нашага дыплёму была непараўнальная з тым, які прызнаецца беларускім міністэрствам.

— Якой вы бачыце пэрспэктыву для студэнтаў, што навучаюцца за мяжой, пасьля вяртаньня ў Беларусь?

— Мы робім гэта для Беларусі. Без падрыхтоўкі людзей, якія інакш думаюць, у дзяржаве ня можа быць пазытыўных трансфармацый. Адзінай стратэгіяй у гэтай сытуацыі зьяўляецца памнажэньне крытычнай масы тых, хто можа прафэсійна падысьці да справы. У нас хворы сацыяльны арганізм, які за доўгі час давялі да такога стану, што ён практычна ня дзейнічае. Таму патрэбны прафэсійныя намаганьні, каб гэты арганізм вылечыць.

Размаўляла Надзея Галубовіч, Франкфурт-на-Одэры

P.S. Паводле інфармацыі «НН», цяпер разглядаецца варыянт стварэньня ЭГУ ў выгнаньні з базай у Вільні.

ГАЗЭТА ВЫСТУПІЛА. ШТО ЗРОБЛЕНА?

Скрабутан адноўлены

«Зуброўца» Яўгена Скрабутана, звольненага ўлетку за надпісы «Спыніць русіфікацыю» («НН», №29 за 6 жніўня), аднавілі ў Гарадзенскім унівэрсытэце. Загад зьявіўся пры канцы кастрычніка. Сам хлопец наведваў заняткі з сваімі аданкурсьнікамі з 1 верасьня, таму акадэмічных запазычанасьцяў ня мае. (Ягоны «падзельнік» Алесь Курсевіч вырашыў пераехаць на вучобу ў Польшчу.) Праз «НН» Яўген перадае падзякі ўсім родным, блізкім, аднакурсьнікам і выкладчыкам — хто падтрымаў яго парадай, цёплым словам, а таксама практычным учынкам.

АШ

Стратэгія коштам 10 000 000 эўра

Эўразьвяз перавызначае кірункі ўкладаньняў у Беларусь. «НН» удалося азнаёміцца з праектам новай стратэгіі праграмы TACIS

22 лістапада Эўразьвяз мае прыняць новую стратэгію ў дачыненьні да Беларусі. На яе грунце будуць акрэсьленыя прыярытэты праграмы фінансавай дапамогі TACIS для нашай краіны на 2005—2006 г.

На асноўнае пытаньне «Колькі дадуць грошай?» адказ дакладны: 10 млн эўра цягам наступных двух год. У дакумэнце адзначана, што «ў выпадку значных зьмен ва ўнутранай сытуацыі ў Беларусі памеры фінансаваньня могуць быць перагледжаны», аднак у які бок — не ўдакладняецца. Разьмяркоўвацца сродкі будуць зыходзячы з доўгатэрміновай мэты ЭЗ — дэмакратычнай Беларусі, якая будзе мець з ЭЗ ня толькі супольныя межы (гэты элегантны ангельскі зварот можна разумець ва ўсіх сэнсах), але й супольныя каштоўнасьці.

Сфэра супрацоўніцтва	Дапамога (млн эўра)
1. Падтрымка грамадзянскай супольнасьці і дэмакратызацыі (дапамога недзяржаўным аб'яднаньням, прапаганда эўрапейскіх каштоўнасьцяў, спрыяньне выкананьню міжнародных канвэнцый)	4,7
2. Вышэйшая адукацыя	1,9
3. Дапамога рэгіёнам, забруджаным радыяцыяй	2,8
4. Падтрымка NCU	0,6
Усяго	10,0

Ва ўмовах, калі падзелу ўладаў у краіне практычна не існуе, у беларускай сыстэме «стрымак ды процівагаў» засталіся толькі два элемэнты — дзяржава ды НДА. Адорваць дзяржаву не выпадае, таму галоўную падтрымку прапануецца накіраваць у недзяржаўны сэктар. Таксама новая стратэгія надае ўвагу вышэйшай адукацыі ды міжнародным акадэмічным абменам — менавіта гэта, мяркуюць у TACIS, створыць падмурак для дэмакратызацыі Беларусі. Дапамога чарнобыльскім раёнам — традыцыйны складнік фінансавых патокаў TACIS. Апошні пункт табліцы вызначае выдаткі на мэнэджмэнт грантаў: Нацыянальная каардынацыйная адзінка (National Co-ordinating Unit — NCU) — гэта «сувязная» структура, якая каардынуе праект.

Гісторыя адносінаў паміж ЭЗ ды беларускім урадам няпростая. Яны былі ўзаемапрыхільнымі ў 1992—1995 г., калі Беларусь атрымала ад TACIS каля 75 млн эўра. Але праз вядомыя палітычныя падзеі выдзяленьне чарговых 37 млн эўра на 1996—1999 г. было замарожана. Цяпер фінансаваньне адбываецца ў значна меншых аб'ёмах. Асабліва адчувальна гэта адбілася на дапамозе ў агульнай стабілізацыі нашай гаспадаркі. Так, з 55 млн эўра 10-гадовай пазыкі на макраэканамічнае разьвіцьцё Беларусь атрымала толькі 30 млн (у 1995 г.). Яшчэ 25 млн эўра чакаюць свайго часу — пачатку рэформаў. Аднак на абарону сябе ад непажаданых гасьцей Эўропа грошы дае ахвотна, ня дужа зважаючы на рэжым краіны. На ўпарадкаваньне беларускіх межаў і стварэньне інфраструктуры для ўтрыманьня ўцекачоў ды нелегальных мігрантаў было выдзелена 16,5 млн эўра (1997—2003).

У праекце стратэгіі няма згадкі пра дыскрымінацыю беларускай культуры і мовы, нават у разьдзелах «Грамадзянская супольнасьць, правы чалавека» ды «Вышэйшая адукацыя». Такім чынам, умацаваньне нацыянальнае ідэнтычнасьці па-ранейшаму не разглядаецца Эўразьвязам як прыярытэт. У TACIS сьцьвярджаюць, што аналізавалі толькі тыя бакі беларускага жыцьця, якія «непасрэдна зьвязаныя з інтарэсамі праграмы». Нібыта пагарда з боку дзяржавы да культуры тытульнай нацыі аніяк не адбіваецца на разьвіцьці дэмакратыі ды грамадзянскай супольнасьці.

Пастулюецца зьмена прыярытэтаў, але прапануецца захаваць спосаб дзейнасьці нязьменным. Выніку трэба чакаць адпаведнага. Мяркуючы па праекце, эфэктыўнасьць беларускіх праграмаў застанецца ранейшаю.

Алесь Кудрыцкі

Януш Анышкевіч: «З Захадам на ўсход!»

Перад польскай замежнай палітыкай стаіць новая важная мэта. Гэта спрыяньне інтэграцыі ў NATO і Эўразьвяз Украіны, а пазьней і Беларусі. «Трэба пераканаць Зьвяз у такой праграме ўсходняй палітыкі», — піша ў артыкуле ў «Газэце выборчай» намесьнік старшыні Эўрапарлямэнту Януш Анышкевіч.

«Засяроджанасьць на Расеі можа вярнуць да жыцьця палітыку, вядомую зь мінулага як «Russia first» («Перш за ўсё Расея»), вынікам якой зьяўляецца падпарадкаваньне праблематыкі Украіны ці Беларусі разгляданым у першую чаргу інтарэсам Расеі.

Таму на нас, а таксама на іншыя дзяржавы, дзе панує аналягічны падыход, — краіны Балтыі? Вугоршчыну? Славакію? — кладзецца абавязак выпрацоўкі і прасоўваньня праграмы для Украіны. А таксама для Беларусі, якую нельга папросту сьпісаць з рахункаў.

Вялікая палітычная мэта вымалёўваецца, такім чынам, цалкам выразна. Цяжка было б увасобіць такую праграму ў жыцьцё бязь цеснага супрацоўніцтва з ЗША. Амэрыка ўжо даўно праяўляе палітычны і фінансавы клопат пра Украіну, а апошнія рашэньні прэзыдэнта Буша і Кангрэсу сьведчаць пра гатоўнасьць зрабіць энэргічныя захады і ў дачыненьні да Беларусі. Адчуваная ўсюды патрэба ў паляпшэньні трансатлянтычных адносін вымагае вяртаньня веры ў сэнс, магчымасьць і неабходнасьць сумесных дзеяньняў Эўропы і ЗША. Сумесныя ініцыятывы ў дачыненьні да Украіны і Беларусі могуць быць такой супольнай праграмай. У яе рэалізацыі роля Польшчы можа быць ключавой».

МЭДЫІ

Нацыяналізацыя кабэльнага ТБ

У Берасьцейскай вобласьці рыхтуецца нацыяналізацыя сетак кабэльнага тэлебачаньня. Такое рашэньне прыняў аблвыканкам.

Рашэньне №640 мае назву «Пра арганізацыю работы па абслугоўваньні насельніцтва, стан працоўнай дысцыпліны ў сфэры ЖКГ вобласьці». Цяпер да 1 лістапада ва ўсіх мураваных дамах вобласьці павінна была адбыцца інвэнтарызацыя кабэльных сетак і «прыняцьце іх на балянс у бязвыплатным парадку згодна з існуючым заканадаўствам».

Усе кіраўнікі баранавіцкіх кабэльных сетак лічаць, аднак, што пастанова аблвыканкаму, наадварот, парушае існуючыя законы. Спасылаюцца на Грамадзянскі кодэкс, які забараняе між арганізацыямі якія-кольвек падарункі й дармавыя пагадненьні. Як вынік — дырэктарат кабэльных сетак зьбіраецца зьвяртацца ў суд.

Камунальшчыкі ж апэлююць да таго, што кабэльшчыкі, пракладаючы свае сеткі, наўмысна панішчылі калектыўныя антэны. У тых дамах, дзе яны засталіся, ніякай нацыяналізацыі ня будзе. Апошнія 10 год, аднак, ніхто з камунальных службаў не цікавіўся лёсам старых калектыўных антэн.

Як лічыць уладальнік адной з баранавіцкіх кабэльных сетак тэлебачаньня, якія апошнім часам сталіся вельмі папулярнымі сярод народу, рашэньне берасьцейскіх уладаў — толькі пачатак кампаніі па абмежаваньні распаўсюду інфармацыі. Акрамя таго, як ужо павялося, дзяржаўныя ўстановы, што ня ў стане самі зарабіць грошы, пачынаюць падграбаць пад сябе «прыбытковыя», на іх погляд, сфэры бізнэсу. Гэта прывядзе да падражаньня кошту паслуг, зьніжэньня якасьці й зьмяншэньня колькасьці каналаў, дазволеных для прагляду.

Сёлета супрацоўнікі і гледачы кабэльнага тэлебачаньня ўжо зьмірыліся з тым, што глядзець можна толькі каналы, дазволеныя Міністэрствам інфармацыі. З экранаў зьніклі расейскія ОРТ, РТР, СТС, польская «Polonia», шэраг украінскіх каналаў, затое абавязковымі зрабіліся БТ, АНТ, «Лад». Дарэчы, у той час, калі расейскія і польскія каналы зьнікаюць з тэлевізараў, шмат якія студыі рэтрансьлююць «BBC-News». Нядзіва, што хутка гледачы пачнуць вучыць замежныя мовы.

Відаць, улады непакоіць тое, што сярод беларусаў цяпер усё больш пашыраецца тэза «Беларускае ТБ махлюе». Спадарожнікавыя рэсывэры пакуль ня для большасьці людзей задарагія, а вось кабэльнае тэлебачаньне дазваляла ў тых самых Баранавічах глядзець ад 12 да 18 каналаў.

Руслан Равяка, Баранавічы

СПАДЧЫНА

Вяскоўцы зноў схавалі валун Пілсудзкага

Працяг са старонкі 1.

У красавіку амбасада Польшчы ў Беларусі пры падтрымцы Міністэрства культуры Польшчы атрымала ад уладаў Вялейскага раёну згоду на перанясэньне 800-кіляграмовага валуна з прысьвячэньнем маршалу Пілсудзкаму. Знайшоўся і спонсар, які меўся ажыцьцявіць транспартаваньне. Калі прадстаўнік пасольства выехаў на месца, аказалася, што каменя няма.

Камень быў усталяваны ў гэтым глухім кутку Вялейшчыны ў 1935 г., пасьля сьмерці Начальніка Дзяржавы. Ініцыятыва сыходзіла ад мясцовага насельніцтва. Помнік складаўся з трох частак, да нашага часу захавалася цэнтральная — валун з шыльдай на польскай мове: «Маршалку Юзафу Пілсудзкаму, 1935, які даў Польшчы свабоду, межы, моц і пашану». Вышэй надпісу мелася выява ордэну «Virtuti militari». Ля мясцовай школкі помнік і прастаяў да прыходу Чырвонай Арміі.

Новая ўлада сьцягнула яго за вёску, вайной згарэла школа, а камень на доўгія гады застаўся за гародам жыхаркі Буцькаў, якая й глядзела яго, не даючы схавацца пад дзірваном. Апроч навакольных сялян аб існаваньні яго ведалі толькі краязнаўцы-аматары.

Са словаў дарадцы амбасады Марка Буцькі, дыпляматаў непрыемна ўразіў той факт, што валун зьнік сама перад перавозам. Польская амбасада 2 лістапада зьвярнулася з просьбай высьветліць сытуацыю ў МЗС Беларусі, дзе сустрэла жаданьне дапамагчы ў гэтай справе. Польская прэса пабачыла ў зьнікненьні «крайні прыклад непаважнасьці да польскай гісторыі і традыцыі».

«НН» удалося высьветліць, што ў зьнікненьні помніка няма ні выпадковасьці, ні вандалізму. Камень быў проста перахаваны мясцовымі актывістамі-краязнаўцамі ў надзейнае месца — каб не дазволіць гістарычнаму помніку Вялейшчыны пакінуць бацькаўшчыну. Як паведамілі самі ўдзельнікі выкраданьня, імёны якіх са зразумелых прычынаў мы назваць пакуль ня можам, аніякіх карысьлівых намераў «выкрадальнікі» ня маюць. Яны толькі хочуць дачакацца афіцыйнага рашэньня ўлад пакінуць помнік на сваім месцы з прызнаньнем яго гістарычнае каштоўнасьці менавіта для Вялейшчыны — пра што маюць хадайнічаць. На іх думку, каменю трэба знайсьці пачэснае месца ў межах раёну, а ня ў Менску. Гэтага яны дамагаліся на пачатку 90-х. Да 1994 г. не пасьпелі, а са зьменаю палітычнае сытуацыі ў Беларусі гэта стала немагчыма. Няхай камень пачакае лепшых часоў у полі, меркавалі мясцовыя актывісты. Ляжаў 60 гадоў, паляжыць яшчэ дзясятак. Аднак ідэю вывазу памяткі зь беларускай на «польскую тэрыторыю» яны не прынялі.

А як ставіцца польская амбасада да такога жаданьня вялейскае грамадзкасьці? Сп.Буцька пакуль у размове з карэспандэнтам «НН» выказаў пэўны недавер да нашай інфармацыі, абгрунтаваўшы яго тым, што калі 70 год ніхто не выказваў цікавасьці да каменя, то няўжо цяпер нехта мог гэта зрабіць.

Усевалад Сьцебурака

Газэта-мільянэр зьмяніла рэдактара

Паводле статыстыкі Open.by, 31 кастрычніка на сайт «Беларускіх навінаў» завітаў мільённы наведвальнік. Пра гэта можна прачытаць і на самім сайце «Навінаў». Нельга затое нічога даведацца пра зьмену галоўнага рэдактара гэтае самае папулярнае інтэрнэт-газэты. Між тым стваральніка выданьня Аляксандра Класкоўскага замяніў на гэтай пасадзе **Кірыла Пазьняк (на здымку)**. А.Класкоўскі вярнуўся на пасаду кіраўніка аналітычнае службы агенцтва БелаПАНу. Ходзяць чуткі, што гэта адбылося пад ціскам з адміністрацыі прэзыдэнта. Ці так гэта? — мы зьвярнуліся з пытаньнем да дырэктара БелаПАНу Алеся Ліпая. Ён растлумачыў замену ўнутрырэдакцыйнымі перастаноўкамі і абвергнуў наяўнасьць любога вонкавага ўплыву на рашэньне зьмяніць рэдактара сайту.

Алесь Трафіменка

Высакосны год футбольнага сэзону

7 лістапада матчамі 30-га туру завершыцца 14-ы нацыянальны чэмпіянат, а 11 лістапада сустрэчамі кубку — футбольны сэзон. Пераможцы чэмпіянату — сталічнае «Дынама».

PHOTO.BYMEDIA.NET

31 кастрычніка ў Менску прайшоў «залаты матч». Сталічнае «Дынама» перамагло зь лікам 2:0 барысаўскае БАТЭ і ў сёмы раз заваявала чэмпіёнскі тытул. У БАТЭ — срэбра, на трэцім месцы — салігорскі «Шахцёр». Чэмпіён мінулага году «Гомель» зойме выніковае пятае ці шостае месца.

Засталося толькі вызначыць другога няўдачніка, які пакіне эліту. За некалькі тураў да фінішу «забраніравала» сабе месца ў першай лізе бабруйская «Белшына», чэмпіён Беларусі 2001 г. Толькі ў нядзелю стала ясна, што застаецца ў эліце мазырская «Славія», двухразовы чэмпіён (1996, 2000).

Кампанію «Белшыне» могуць скласьці менскі МТЗ-РІПА, віцебскі «Лякаматыў» ды «Зорка-ВА-БДУ». Цікава, што першыя дзьве каманды толькі сэзон знаходзіліся ў вышэйшым дывізіёне. Вяртаюцца ў вышэйшы дывізіён менскі «Лякаматыў» і рэчыцкі «Ведрыч-97».

Кажуць, што высакосны год нешчасьлівы. Прынамсі, так сталася для беларускага футболу. Гэта і няўдалы выступ зборнай на моладзевым чэмпіянаце Эўропы ў канцы траўня — пачатку чэрвеня. Ехалі ж, як мінімум, па пуцёўку на Атэнскую алімпіяду! Потым — паразы ў першым раўндзе эўракубкаў. Няўдалы старт «маладзёжкі» ў новым адборачным цыкле.

А раніцай 29 кастрычніка футбольную грамадзкасьць скаланула нечаканая вестка: напярэдадні ад сардэчнага прыступу на 58-м годзе пайшоў з жыцьця Вячаслаў Хрусталёў. Для адных ён быў перадусім галкіпэрам менскага «Дынама» і магілёўскага «Дняпра» ў 70-х — пачатку 80-х гадоў, для іншых — дырэктарам галоўнае футбольнае арэны краіны.

Вось і апошнія свае дні сп.Хрусталёў рыхтаваў стадыён «Дынама» да «залатога» матчу нацыянальнага першынства. Думаецца, менчукі сваю нядзельную перамогу прысьвяцілі памяці «свайго вялікага сябра, які не дажыў тры дні да перамогі».

Пры ім арэна ператварылася ў стадыён эўрапейскага ўзроўню. Хрусталёў марыў, што калі-небудзь на ім будзе праведзены фінал Лігі чэмпіёнаў.

Ядвігін Ш. у пачатку мінулага стагодзьдзя напісаў: «…Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя — гояцца, па іх астаюцца рубцы. Большыя — заўсёды крывавяцца. Гэтак на сэрцы. Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя — заўсёды крывавяцца. Большыя — залечвае толькі… сьмерць. Гэтак на душы».

У Вячаслава Хрусталёва хапала рубцоў і на сэрцы, і на душы. Апошнія месяцы яму ставілі ў віну кепскі стан газону. Маўляў, нельга гуляць на такім полі. Сэрца і ня вытрывала.

Другая сьмерць за сэзон. Трыма з паловай месяцамі раней ад нас пайшоў трэнэр жодзінскага «Тарпэда» 42-гадовы Якуб Шапіра. У 1984 г. ён стварыў прыватны (!) дзіцячы футбольны клюб «Атака», вырас зь імі да вышэйшай лігі нацыянальнага чэмпіянату, дзе каманда правяла тры сэзоны (1995—1997). З 2001 г. Шапіра трэніраваў жодзінскае «Тарпэда». На апошніх хвілінах матчу «Тарпэда»—«Нёман» (10 ліпеня) жодзінцы забілі гол, трэнэр пабег абдымаць сваіх гадаванцаў, але нечакана яму зрабілася кепска. На наступны дзень яго ня стала.

Журналістам Я.Шапіра падабаўся за добрае пачуцьцё гумару, а ягоныя дасьціпныя жарты ўпрыгожвалі пасьляматчавыя прэс-канфэрэнцыі. Мне імпанавалі і ягоныя рэпартажы аб гульнях сэрыі «А» італьянскага чэмпіянату. Поўная адсутнасьць банальнасьцяў, чаго бракуе некаторым сёньняшнім камэнтатарам.

Вось такі 2004 г. для футбольнай Беларусі. Можа, наступны год будзе шчасьлівейшым — і ў футбольным, і ў каляфутбольным пляне?

Алег Раявец

НА ПРАВОХ РЭКЛЯМЫ

Ці магчымае пашырэньне ЭЗ на Беларусь?

Аб'яднаная грамадзянская партыя прапануе Эўразьвязу праграму інтэграцыі Беларусі ў ЭЗ, разьлічаную на 15—20 гадоў. Адным з галоўных аўтараў праграмы зьяўляецца намесьнік старшыні АГП эканаміст **Яраслаў Раманчук**:

— Гэты дакумэнт адрозьніваецца ад тых, на падставе якіх будуюцца ўзаемаадносіны паміж краінамі, урады якіх дэкларуюць гатоўнасьць і жаданьне стаць сябрамі ЭЗ. Польшча, Літва, Чэхія хацелі зьліцца з Эўразьвязам. Сытуацыя ў Беларусі выглядае прынцыпова інакш, бо Беларусь яшчэ не прайшла этапу дэмакратызацыі. Гэты факт ЭЗ ігнаруе, і таму прапанаваныя ім працэдуры не прывядуць Беларусі да такой жа мэты, як іншыя краіны.

Мы павінны перш за ўсё прайсьці этап дэмакратызацыі. Неабходна, каб ЭЗ выпрацаваў праграму, якая б уключала ў сябе інструмэнты, палітыку й мэтодыку дэмакратызацыі нашай краіны. Гэта павінна быць супрацоўніцтва з грамадзянскай супольнасьцю, палітычнымі партыямі, моладзевымі рухамі, адукацыйнымі ўстановамі — з усімі, хто можа данесьці да беларускага чалавека інфармацыю пра ЭЗ, пра тое, чаму нам карысна там быць.

Мы прапанавалі два этапы інтэграцыі. На першым неабходна Беларусь дэмакратызаваць, а на другім — давесьці да ўніфікацыі як заканадаўства, так і іншыя аспэкты.

Мы прапануем, каб ЭЗ адчыніў тут офіс альбо амбасаду. Калі гэта немагчыма — каб Эўразьвяз адчыніў офіс у суседзкай зь Беларусяй Польшчы, або ў Літве, або ў Латвіі. Гэтая ўстанова павінна працаваць у рамках праграмы «Новае суседзтва», прынятай Эўракамісіяй, якая прадугледжвае, каб краіны суседзі ЭЗ таксама маглі карыстацца чатырма свабодамі эўрапейскай супольнасьці — перамяшчэньнем тавараў, паслуг, людзей і грошай.

— У дачыненьнях паміж Беларусяй і ЭЗ вы прапануеце формулу, дзе ізаляваліся б толькі А.Лукашэнка й ягоныя найбліжэйшыя супрацоўнікі. Ці не здаецца вам, што беларуская ўлада гэтага не дапусьціць?

— Калі ўлады Горадні ці Берасьця будуць ведаць, што ЭЗ прапанаваў рэалізацыю праграмы па экалёгіі ў памеры 50—100 млн даляраў, а Лукашэнка заблякаваў, то гэта будзе працаваць супраць уладаў і будзе прымушаць даваць больш паўнамоцтваў на ўзровень грамадзянскай супольнасьці. Калі ЭЗ ня будзе супрацоўнічаць зь беларускай грамадзянскай супольнасьцю, падтрымліваць моладзевыя структуры, незалежную прэсу, працаваць з палітычнымі партыямі ці навукова-дасьледчымі цэнтрамі толькі таму, што ёсьць Лукашэнка, то гэта грубая памылка. Не абавязкова прыехаць у краіну і перш-наперш сустракацца ў Адміністрацыі прэзыдэнта з Лукашэнкам, а толькі потым ісьці на спатканьне з палітычнымі партыямі. Ёсьць тэрарызм, міграцыя, арганізаваны крымінальны гандаль — супраць іх трэба працаваць супольна. Ёсьць экалёгія й іншыя справы, якія ня маюць палітычнай афарбоўкі.

— Дагэтуль Беларусь выказвала жаданьне інтэграваць з Расеяй. Сяброўства ў ЭЗ — гэта цалкам іншы кірунак.

— Лукашэнка хацеў выйсьці на расейскую палітычную прастору й адтуль будаваць Савецкі Саюз-2. Гэта ў яго ня выйшла. Калі я гавару пра стратэгічную скіраванасьць у ЭЗ, то я маю на ўвазе стратэгічныя інтарэсы Беларусі. Я гавару пра новы ўрад Беларусі, які будзе сябраваць як з Захадам, так і з Усходам. Гэта не выключае сувэрэнітэту краіны. У інтэграцыі, у адкрытасьці гарантыя таго, што беларусы будуць паўнапраўным партнэрам ЭЗ, а таксама Расеі.

— Стратэгія далучэньня Беларусі да ЭЗ разьлічана на бліжэйшыя 15—20 гадоў. Гэта рэальны тэрмін ці заданьне навыраст, якое толькі вызначае напрамак?

— У сярэднім перамовы ў эўрапейскіх краінах вяліся 9—12 гадоў. Калі Беларусь пачне перамовы ў 2007 годзе і будзе рыхтавацца выканаць палітычныя, эканамічныя й інстытуцыянальныя крытэры, то нам хопіць 10—15 гадоў. Гэта рэальны тэрмін. Я размаўляў з прадстаўнікамі Македоніі, Харватыі. Мы спадзяёмся, што працэс інтэграцыі не завершыцца на Баўгарыі й Румыніі і ў найбліжэйшыя 10 гадоў ЭЗ яшчэ пашырыцца. Дзьверы для Беларусі і Украіны пры нашых супольных намаганьнях таксама будуць адчынены.

— Ці здолеюць беларусы пераключыцца на капіталістычны лад мысьленьня?

— Беларусы ўжо даўно пераключыліся на гэты лад мысьленьня. Гэта спосаб, які прадугледжвае адказнасьць за свае дзеяньні. Мы маем шанец зрабіць так, каб ЭЗ быў намі зацікаўлены, каб тут існавала больш эфэктыўная падатковая прастора, больш канкурэнтаздольны бізнэс-клімат.

Мы будзем у Эўропе. Няма ў нашым мэнталітэце нічога такога, што сьведчыла б пра нашу «дрымучую саўдэпію».

Паводле радыё «Палёнія»
http://www.radio.com.pl/polonia

НАВІНЫ СПОРТУ

Трапілі ў пральную машыну

30 кастрычніка БГК імя Мяшкова прайграў у чарговым матчы Лігі чэмпіёнаў у гасьцях славенскаму «Гарэньо». Берасьцейцы нічога не змаглі супрацьпаставіць братам-славенцам — 17:27. Цяпер беларусы займаюць апошняе, чацьвёртае месца ў падгрупе «С». Толькі цуд можа вярнуць іх на трэцяе. Наступны матч 6 лістапада ў Менску супраць лідэраў — «Гудмэ» з Даніі.

Каб ня біліся

У мінулым нумары «НН» пісала пра бойку падчас матчу футбольнага першынства паміж «Тарпэда-СКА» і «Зоркай-ВА-БДУ». Дысцыплінарны камітэт Беларускае фэдэрацыі футболу дыскваліфікаваў чатырох гульцоў (трох аўтазаводцаў, аднаго «студэнта») на 10 матчаў, пяцёра гульцоў — на тэрмін ад пяці да васьмі матчаў. Трэнэр «Тарпэда» Сяргей Падпалы за нецэнзурную лаянку на адрас судзьдзі дыскваліфікаваны на тры матчы. Дасталося і арбітру Мікалаю Мяцельскаму, якога адлучылі ад абслугоўваньня матчаў да канца сэзону. Менавіта ягонае некваліфікаванае судзейства і справакавала беспрэцэдэнтную для беларускага футболу сытуацыю.

Мірнаму не шанцуе

На Адкрытым чэмпіянаце Санкт-Пецярбургу дуэт Максім Мірны (Беларусь) — Міхаіл Южны (Расея) меў шанцы перамагчы ў фінале. Але падвяло калена беларускага тэнісіста. Праз праблемы зь ім Мірны і Южны зьняліся са спаборніцтваў у 1/2 фіналу.

Працягваецца падзеньне Мірнага ў сусьветным рэйтынгу, сьвежы ліст быў абнародаваны ў панядзелак. У чэмпіёнскай гонцы беларус апусьціўся з 61-га на 64-е месца. Па выніках 52 апошніх тыдняў Мірны знаходзіцца на 71-м месцы.

Пунтус зрабіў сваю справу

На прэс-канфэрэнцыі пасьля «залатога» матчу «Дынама»—БАТЭ трэнэр барысаўскага клюбу і моладзевай зборнай Юры Пунтус заявіў, што сыходзіць з клюбу як мінімум на год. Пунтус трэніраваў БАТЭ з часу яго адраджэньня — 1996 г.

«Miensk Open»

У Менску прайшоў міжнародны жаночы тэнісны тунір (прызавы фонд — 25 тыс. даляраў). Гаспадыня корту Настасьця Якімава саступіла ў фінале ўкраінцы Вользе Саўчук — 4:6, 4:6, але перамагла разам з суайчыньніцай Дар'яй Куставай у парным разрадзе.

Хандогіну засьпелі на допінгу

Міжнародны саюз біятлністаў на два гады дыскваліфікаваў беларуску Сьвятлану Хандогіну, пазбавіўшы яе чатырох узнагарод чэмпіянату сьвету па летнім біятлёне, што прайшоў у славацкім Орсблі. Допінг-проба паказала наяўнасьць у арганізме забароненага фурасэміду. Спартоўка кажа, што лячыла прэпаратамі, якія ўтрымлівалі фурасэмід, ныркі.

АР

Бельская сэксуальная рэвалюцыя

Усе прызы «Бардаўскай восені» дасталіся дзяўчатам

РАМАН ЛІХАЦАЎКА

11-ы бардаўскі фэстываль у Бельску-Падляскім 22—24 кастрычніка стаў дэманстрацыяй эмансыпацыі беларускай тусоўкі. Мала таго, што тры першыя месцы занялі прадстаўніцы прыгажэйшай паловы чалавецтва, дык яшчэ і агульны іх век складае ўсяго толькі 61 год. Гэта пры тым, што, скажам, 51-гадовы бард з Залесься Сяргей Верамейчык і песень напісаў больш за ўсю дзявочую тройцу, узятую разам, і гітарай выкшталцона-гішпанскай валодае так, што дзяўчатам яшчэ расьці і расьці… Мо журы вырашыла перапрафіляваць традыцыйны фэст бардаў у конкурс прыгажосьці? Так бы думаў і я, калі б ня бачыў таго, што адбылося насамрэч.

Гран-пры-2004 студэнтка БДПУ **Тацяна Беланогая (на здымку)** «ўзяла» энэргетыкай. На сцэне Бельску Тацяна паказала рэдкую для беларусаў здольнасьць выкладвацца да канца. Гэткая канцэнтрацыя пачуцьцяў пры небанальных тэкстах заканамерна ўвасобілася ў перамогу.

Другое месца і магчымасьць запісаць аўдыёальбом на радыё «Беласток» дасталіся таксама студэнтцы БДПУ Жэні Собаль. Гэтая рэкордна высокая (182 см) дзяўчына зь дзяцінства сьпявала чужыя песьні, атрымлівала нейкія прызы ды прызнаньне ў тусоўках, а тут напісала разам з братам блюз, прасьпявала і… што называецца, «у яблык» — самая прыгожая песьня фэстывалю.

Трэцяя прызёрка — Вольга Казанцава зь Віцебску — добра ведае эксклюзіўнасьць і моц свайго вакалу. Якая спакуса для маладой дзяўчыны замест кантакту з заляй залюбавацца сваім тэмбрам! Вось і трэцяе месца пры ўсіх дадзеных для першага.

Мужчыны аказаліся ніжэй пераважна за кошт сьціпласьці сцэнічнай падачы — і Сяргей Верамейчык, і Алесь Наркевіч, і Яўген Валошын. І калі першага лепш слухаць камэрна, а другому крыху замінае тэмбр ды задоўгая дарога сьпяваных у Бельску песень да слухача (вось калі б гадоў на 6—7 раней!), то апошні зь нейкіх прычын як бы выбудаваў вакол сябе абарончую абалонку, сьпяваў, як з рэзыстарам на выхадзе.

Павал Карпаў стварае ўражаньне значнага патэнцыялу. Мяркую, што праз пэўны час мы яго будзем і чуць, і бачыць на сцэне ў «зоркавым» статусе. Проста час яшчэ не надышоў.

Ужо на адборачным туры ў Менску слухачы пачалі выказваць сымпатыі да вясёлай, хаця і «недасьпетай» каманды «Пяцёрка + Андрэй Такінданг». 21-гадовы вяснушкаваты афрабеларус Такінданг назьбіраў у сваю «5+» рознахарактарных асобаў. Тут і падобны да поп-куміра Робі Ўільямса гісторык, археоляг і бубнач Раман Ліхашапка (іграў ды сьпяваў у праекце «Легенды Вялікага Княства»), і жвавая 18-гадовая скрыпачка Арына Шыкурава, чарнявая вакалістка Марыя Сільвановіч, сьветлавалосы гітарыст Мікола Кішоў ды анархічны бас Кастусь Лісецкі. Разам — часам уражаньне какафоніі і нестыкоўкі, а часам нішто сабе. Калі надалей не перасварацца, абяцае быць штось цікавае.

Па сканчэньні фэстывальнай праграмы такінданг ўцы завіталі яшчэ і ў Бельскую іканапісную школу, і калі гэты ўчынак надалей не атрымае працягу ў шэрагу іншых беларускіх бардаў, то я гатовы буду зьесьці якісь са сваіх гальштукаў…

Апроч конкурсу, Бельскі фэстываль парадаваў тамтэйшых выступамі гасьцей — «Уліса», беластоцкага рок-гурту «085» з прыпанкаваным мастаком Юркам Асеньнікам у ролі саліста, Зьмітра Вайцюшкевіча, Віктара Шалкевіча ў трохі «ажлабелым» іміджы і Касі Камоцкай. Апошняя зладзіла прагляд фільму «Вяртаньне» пра Васіля Быкава, чым, магчыма, паклала пачатак відэатрадыцыі «Бардаўскай восені».

Андрэй Мельнікаў, Бельск—Гомель

«Атлянтыка» прарвалася ў Эўропу

Беларускай музыкі ня ставілі на буйных FM-станцыях Эўропы з часоў «Крамы» у 1993 г. Першымі, хто прарваў «заслону» ў новым стагодзьдзі, стаў гурт «Атлянтыка», што патрапіў у буйную сусьветную рассылку кампаніі «Radio Ventures». Першай радыёстанцыяй, дзе «Атлянтыка» трапіла ў жорсткую ратацыю, стала польскае «Музычнэ рад'ё». Песьня «Shivering» гучыць там чатыры разы на дзень.

Тэатар на «Fromby»

Інтэрнэт-партал Fromby.net адкрыў новы сайт «Наш тэатар»: http://theatre.fromby.net. На старонцы можна знайсьці ўсё, што датычыцца беларускага тэатру — гістарычныя даведкі, афішу, навіны і рэцэнзіі. Усё па-беларуску. Асаблівую падзяку аўтары сайту выказваюць Максіму Гарэцкаму — менавіта ён сваім артыкулам «Наш тэатар» натхніў іх на працу. Самы пасьпяховы дагэтулешні праект парталу — музычны «Тузін гітоў».

Дыскусія вакол рукапісаў Гербэрта

Удава польскага паэта Зьбігнева Гербэрта абвясьціла, што перадасьць ягоныя рукапісы ў бібліятэку Ейльскага ўнівэрсытэту, дзе захоўваюцца таксама архівы Вітальда Гамбровіча й Чэслава Мілаша. Грошы, атрыманыя за перадачу архіву, маюць пайсьці на карысьць фонду Гербэрта і стыпэндыю ягонага імя. Польскія дзеячы літаратуры й навукі настойваюць, што архіў павінен застацца ў Польшчы.

Год Андэрсэна

2005 год у Даніі абвешчаны годам Ганса Крысціяна Андэрсэна: вялікаму казачніку споўніцца 200 гадоў. На ягонай радзіме ў горадзе Одэнсэ і ў Капэнгагене з 31 сакавіка да 3 красавіка адбудзецца карнавал, на арганізацыю якога выдаткоўваюць 34 млн даляраў. Грошы даюць грамадзкія й прыватныя фонды.

АВ, СБ; Gazeta.pl

Музэйнік

100 год з дня нараджэньня Мар'яна Пецюкевіча (1904—1983)

Ягонае імя зьвязана зь Беларускай гімназіяй у Вільні, у якой ён вучыўся, зь Беларускім інстытутам гаспадаркі і культуры, філію якога арганізаваў у сваіх родных Цяцерках на Браслаўшчыне, з Этнаграфічным музэем Віленскага ўнівэрсытэту, дзе ў міжваенны час была сабрана выдатная калекцыя беларускай этнаграфіі, зь Беларускім музэем імя І.Луцкевіча, дырэктарам якога яму выпала быць у ваенны час. Перад вайной ён супрацоўнічаў зь віленскімі «Беларускай крыніцай» і «Шляхам моладзі», а з канца 1950-х — зь беластоцкай «Нівай», у якой друкаваўся да канца жыцьця.

Пасьля сталінскіх лагераў М.Пецюкевіч пераехаў у Польшчу. Тут ён трапіў у сяброўскае асяродзьдзе былой віленскай унівэрсытэцкай інтэлігенцыі і працаваў у Торунскім этнаграфічным музэі. Ён марыў быць пахаваным на роднай зямлі, але ягоны прах спачывае на торунскіх могілках пад бярозамі. На надмагільным помніку беларускай лацінкай выбіта яго імя.

Этнаграфічны музэй у Торуні, дзе зьберагаюцца рукапісы М.Пецюкевіча, 22 кастрычніка адзначыў сотыя ўгодкі з дня нараджэньня свайго былога супрацоўніка навуковай сэсіяй «Мар'ян Пецюкевіч. Жыцьцё і дзейнасьць» з удзелам гасьцей зь Беларусі і Беластоку. Новыя матэрыялы аб Пецюкевічу прадставілі на канфэрэнцыі супрацоўнікі кафэдры беларускай культуры Беластоцкага ўнівэрсытэту: Гражына Харытанюк і Лена Глагоўская.

На сэсіі прысутнічалі дзьве дачкі М.Пецюкевіча — пані Міраслава, якая жыве ў Торуні, і Марыя, якая спэцыяльна прыехала з Рыму. Былі таксама тры ягоныя ўнучкі, праўнучка і праўнук. У акадэмічным касьцёле адбылася імша ў памяць М.Пецюкевіча. На ягоную магілу лёг вянок зь бела-чырвона-белых кветак.

Вольга Лабачэўская, Торунь.
Партрэт аўтарства Пятра Сергіевіча

ДЫСКАГРАФІЯ

Тра-та-та

«Narisovana». «Bez bileta», 2004

Гэта другі паўнавартасны альбом менскай каманды, якая трымаецца па-за ўсялякімі тусоўкамі, альбомы выдае самастойна і любіць сварыцца з журналістамі. Па якасьці запісу ён у шэрагу самых лепшых, а што да музыкі, то яна на аматара.

Плытка «Narisovana» стылістычна абсалютна не падобная на папярэдні альбом каманды «На неба». Ранейшыя песьні калектыву граліся ў больш традыцыйным рэчышчы — як фольк ці брыт-поп, сьвежыя творы вытрыманы ў досыць рэдкай у нас ірванай «цягучай» стылістыцы зь нечаканымі музычнымі хадамі і вакальнымі «замарочкамі» Віталіка «Артыста». Тут знаходзіцца месца і акустычным гукам гітары, флейты, віялянчэлі, і электрычным сэмплам, і псыхадэлічным сола, і прыпанкаваным бубнам. Магчыма, гэта тлумачыцца абноўленым складам, магчыма, тым, што група не стаіць на месцы.

Амаль палова альбому «Narisovana» была экранізавана. Цягам працы над дыскам музыканты яшчэ й здымалі відэашэрагі да новых песень — на дыску можна знайсьці гэтыя кліпы.

Музыканты кажуць, што пішуць песьні на той мове, на якой падабаецца і якая падаецца найбольш гарманічнай. Відаць, што беларускую за гарманічную яны ня лічаць, бо альбом — расейскамоўны (за выняткам адной песьні). На папярэднім дыску групы палова песень была на роднай мове.

Сяргей Будкін

Дзеяслоў. 2004. №11(4)

Новы «Дзеяслоў»

У новым «Дзеяслове» — пяць новых вершаў Юр'я Пацюпы, успаміны Аляксандра Дракахруста, творчы партрэт Заіра Азгура, творы Васіля Быкава з архіву пісьменьніка. Пачатае друкаваньне «Спрэчак за літоўска-беларускую спадчыну» Тыматы Снайдэра. Зьвяртае ўвагу дэбют паэткі Ганны Яцкевіч.

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Брыль Я. Блакітны зьніч: Лірычнае. — Менск: Про Хрысто, 2004. — 92 с. — (Б-ка час. «Наша вера»). 3000 ас.

Лірычная споведзь майстра беларускае прозы пра сябе й сьвет. У «Кнігарні пісьменьніка» цана 2720 руб.

Гарады й вёскі Беларусі: Энцыкл. Т. 1. Кн. 1. Гомельск. вобл. / С.Марцалеў; Рэдкал. Г.Пашкоў і інш. — Менск: Беларуская энцыкляпэдыя, 2004. — 632 с.: іл. 4000 ас.

Новае энцыкляпэдычнае выданьне заплянаванае як фундамэнтальная крыніца інфармацыі пра ўсе населеныя пункты Беларусі — нават тыя, што перасталі існаваць. Першы том прысьвечаны адзінаццаці раёнам Гомельскай вобласьці. Цана блізу 15000 руб.

Нанканфармізм у Беларусі: 1953—1985: Даведнік. Т. 1 / Аўт.-уклад. А.Дзярновіч. — Менск: Athenaeum, 2004. — 252 с. — (Том IX; Калекцыя «Архіў найноўшай гісторыі»). 2000 ас.

У прадмове да выданьня адзначана: «Няма патрэбы ствараць міт пра шырокі антытаталітарны рух у Савецкай Беларусі 1953—1985 г., але такімі ж неадэкватнымі зьяўляюцца ўяўленьні пра суцэльную апатыю беларускага грамадзтва». Аўтарамі даведніка выступілі У.Арлоў, С.Дубавец, В.Скалабан, В.Чамярыцкі ды інш. Цана ў «Акадэмкнізе» 7670 руб.

Панізьнік С. Пры сьвячэньні…: Зб. вершаў. — Вільня: Наша будучыня, 2004. — 222 с. 500 ас.

«Мацярык на падкове Дзьвіны», «кальчуга Слова», «радаводны бераг», «сьвежае тысячагодзьдзе», «сьвятло лучнасьці», «курганы на праспэкце», «мэмарыяльная Сасна спатканьня» — гэта вобразы з кнігі. Тут аўтаравы продкі, што «напружана маўчаць на фатаздымках», суседнічаюць з Усяславам Чарадзеем, Купалам, Багдановічам…

Шамякіна А. «Вобразы мілыя роднага краю…»: Прастора й час у трылёгіі Якуба Коласа «На ростанях» / Нац. акад. навук Беларусі; Ін-т літ. імя Янкі Купалы. — Менск: Беларуская навука, 2004. — 175 с.

Тацяна Вабішчэвіч

Юшчанка перамог

У сераду ўкраінскі Цэнтравыбаркам так і не далічыў апошніх галасоў у Кіеве і заходніх абласьцях — там, дзе Віктар Юшчанка ўпэўнена выпераджае дзейнага прэм'ера Віктара Януковіча. Менавіта іх падлік можа вывесьці Юшчанку наперад, і прадстаўнікі ягонага штабу зьвінавачваюць улады ў наўмысным замаруджваньні падліку з псыхалягічнымі мэтамі. На сёньня абодва кандыдаты, што выйшлі ў другі тур, маюць, паводле зьвестак ЦВК, па 39% галасоў. Юшчанка перамог у 17 абласьцях Захаду, Цэнтру і Поўначы ад Закарпацьця да Чарнігава й Сумаў. Януковіч — у 10 абласьцях Поўдня і Ўсходу. Улічваючы імаверныя фальсыфікацыі на карысьць кандыдата ад улады (назіральнікі ацэньваюць іх на 3—4% галасоў), можна гаварыць пра сапраўдны электаральны прарыў нацыянал-дэмакратаў.

Раніцай у сераду ад ЦВК Украіны адвялі войскі й прыбралі калючы дрот. На суботу 6 лістапада юшчанкаўская кааліцыя «Сіла народу» пляную вялікі мітынг у Кіеве на майдане Незалежнасьці.

На думку кіеўскага палітоляга Ўладзімера Палахалы, Віктар Юшчанка мае вялікія шанцы на канчатковую перамогу, асабліва з улікам таго, што яго падтрымаў сацыяліст Аляксандар Мароз (3-е месца з 5,7% галасоў), тады як камуніст Пятро Сіманенка (5% галасоў) заклікае галасаваць супраць абодвух кандыдатаў. Паводле ўкраінскага заканадаўства, у другім туры 21 лістапада пераможа той, хто набраў простую большасьць галасоў. У выпадку фальсыфікацый улада можа сутыкнуцца з выбухам пратэстаў у Кіеве і сталічнай вобласьці, дзе Віктар Юшчанка набраў 57—68% галасоў супраць 13—19% у Януковіча.

Вынік першага туру выклікаў шок у Расеі, прэзыдэнт якой адкрыта агітаваў за Януковіча, і непрыхаванае расчараваньне Эўропы і ЗША, на думку якіх «гэтыя выбары ўяўляюць сабою крок назад у параўнаньні з выбарамі-2002».

Перамога Юшчанкі можа выклікаць рэзкую рэакцыю Расеі і дэзінтэграцыю СНД.

Мікола Бугай

Сусьветная місія

Працяг са старонкі 1.

Джорджа Буша і амэрыканцаў не зразумець без паваротнай падзеі найноўшай гісторыі Штатаў — атакі на Сусьветны гандлёвы цэнтар. Яна стала вызначальнай ня толькі ў палітычнай дзейнасьці прэзыдэнта, але таксама для яго асабістых поглядаў і нават веры. 11 верасьня стала своеасаблівым днём перамяненьня амэрыканскага мэсіянізму. Час выбраў Буша, а Буш убачыў сваю місію ня толькі ў абароне ўласнай краіны ад тэрарызму, але ў поўнай перамозе над сусьветнымі сіламі зла. Вайна ў Іраку мела для амэрыканскага прэзыдэнта прынцыповае значэньне.

Рэлігійнасьць Джорджа Буша супадае з агульнай рэлігійнасьцю амэрыканцаў. Ён зьяўляецца вернікам традыцыйнай амэрыканскай Мэтадыстцкай царквы. У сваёй праграме Буш заўсёды падкрэсьліваў, што зьяўляецца староннікам моцнай сям'і, дый сам ён надзейны сем'янін. Са сваёй жонкай Лаўрай яны разам ужо 27 гадоў, маюць дзьве дачкі. Вядомае нэгатыўнае стаўленьне Буша да гомасэксуальных шлюбаў. Зь іншага боку, ён прыхільнік сьмяротнага пакараньня. Як губэрнатар Тэхасу, Буш не падпісаў ніводнага памілаваньня, а ў штаце было выканана найбольш сьмяротных прысудаў у Амэрыцы. Бо Буш ведае, што такое дабро і што такое зло, ён не з эўрапейцаў і ня з постмадэрністаў, для якіх усё адносна і няма абсалюту, акрамя чалавечага жыцьця. І Бушава дабро лічыць патрэбным змагацца са злом любымі сродкамі, у тым ліку агнём і мячом. Гэтае змаганьне будзе рухаць сусьветную гісторыю наступныя чатыры гады. За Багдадам прыйдзе чарга Тэгерану, а мо і Пхеньяну. Амэрыка гатовая несьці свае каштоўнасьці на ўсе кантынэнты. Яна верыць у Буша і сябе.

Алесь Трафіменка, Мікола Бугай

WWW.USOFFCEPRISTINA.RPO.AT

Кіраўнік новага тыпу

У сьвеце зьмянілася стаўленьне да палітычных лідэраў. Гэта раней ніхто ня ведаў мэдыцынскага дыягназу Мітэрана. Цяпер жа на ўвесь сьвет трансьлююць казаньні безнадзейна хворага Яна Паўла II ды пераезд у шпітальнай піжаме Арафата відавочна неадэкватнага выгляду. На тэлеэкране то аднаго палітыка вядуць пад рукі, то другога. Пішуць пра хваробы й сямейныя праблемы ці ня кожнага больш-менш значнага палітыка. І гэта ня толькі не прыміншае іхняе ролі, а наадварот, надае лідэрам адмысловы арэол.

У гэтую тэндэнцыю цалкам упісваецца й Джордж Буш-малодшы: праблемы з маўленьнем, колішні алькагалізм. Напрадвесьні свайго прэзыдэнцтва ён нават прызнаўся, што спрабаваў наркотыкі, хоць ніхто за язык не цягнуў. Пасьля то бублікам падавіцца, то руку вывіхне. А раз нават запытаўся ў прэзыдэнта Бразыліі, ці жывуць там нэгры.

Журналісты ў Вільні кпілі падчас цырымоніі ўваходжаньня краін Балтыі ў NATO, што Буш гаворыць па-ангельску горш за прэзыдэнтаў Літвы й Латвіі. А ўсё працуе на яго карысьць. Яго любяць, бо ён свойскі. Ён — тыповы прадстаўнік мільёнаў, звычайны просты амэрыканец. Вось такі новы тып кіраўніка. І, выглядае, гэта ня толькі амэрыканская тэндэнцыя.

Гары Куманецкі

Амэрыканцы ў Беларусі галасавалі праз пошту

У амбасадах ЗША ўчасткаў для галасаваньня няма. Каб узяць удзел у выбарах, амэрыканскія грамадзяне за мяжой павінны загадзя (у залежнасьці ад заканадаўства штату, звычайна за 30 дзён да галасаваньня) паведаміць уладам адрас, на які ім дасылаюць бюлетэнь для галасаваньня. Калі выбарац своечасова заявіў аб намеры ўдзельнічаць у галасаваньні за мяжой, але не пасьпеў атрымаць бюлетэнь, ён можа спампаваць бюлетэнь у Інтэрнэце і раздрукаваць яго. Бюлетэнь дасылаюць поштай, паштовы штэмпэль мусіць быць пастаўлены не пазьней за час сканчэньня галасаваньня ў ЗША. Выбарчыя камісіі будуць чакаць лістоў з галасамі замежных выбарцаў аж дзесяць дзён пасьля заканчэньня галасаваньня.

Некаторыя штаты, напрыклад, Каліфорнія, дазволілі сваім грамадзянам дасылаць запоўненыя бюлетэні факсам на адмысловыя бясплатныя нумары. У гэтым выпадку разам зь бюлетэнем трэба даслаць заяву аб адмове ад права на таемнае галасаваньне.

Алесь Пяткевіч

Валадар цыклаў

Віталь Цыганкоў

Адразу пасьля шматпакутнай перамогі Джорджа Буша на прэзыдэнцкіх выбарах у 2000 г. я напісаў артыкул, дзе ўзяў на сябе сьмеласьць сьцьвярджаць, што Буш абавязаны перамагчы ў 2004 г., што б ні адбылося ў ЗША за гэтыя чатыры гады. Вядома ж, сьцьвярджаў я гэта не ад вялікага захапленьня супярэчлівай, скажам так, асобай Буша, а выключна праз сваю веру ў ідэю гістарычных цыклаў.

У палітычным жыцьці, як і ў прыродзе, ёсьць свае вёсны, восені і зімы. Пэрыяды стабільнасьці, пасіўнасьці, грамадзкай абыякавасьці так ці інакш прыводзяць да назапашваньня рэфармісцкай энэргіі, зьяўленьня нездаволенасьці існуючым станам рэчаў. Сэнс кансэрватыўнага цыклу — вяртаньне да таго, што было разбурана папярэднім рэвалюцыйным пэрыядам, але часьцей за ўсё рэгрэс не заходзіць вельмі далёка, не зьнішчае ўсіх здабыткаў папярэдняй эвалюцыі — іначай не было б грамадзкага прагрэсу.

Вядома ж, тэорыя цыклаў — не аксіёма, а толькі тэндэнцыя, але якраз найлепшы прыклад гэтай тэорыі — ЗША, дзе пэрыяды рэвалюцыйных рэформаў і кансэрватызму зьмянялі адзін аднаго зь сярэдняй пэрыядычнасьцю 12—16 гадоў — хаця «рэвалюцыйныя» пэрыяды звычайна карацейшыя за пэрыяды «стабільнасьці». Часта, але не заўсёды, пэрыяды цыклаў супадаюць з кіраваньнем адпаведна дэмакратаў (рэфарматары) і рэспубліканцаў (кансэрватары). Прэзыдэнцтва дэмакрата Клінтана, што пачалося ў 1992 г., вылучалася моцным рэфармісцкім запалам — назавём хіба спробы Клінтана пераўтварыць сыстэму адукацыі і аховы здароўя, надаць новую ролю жанчынам і меншыням — сэксуальным і нацыянальным. У час выбараў у 2000 г. рэфармісцкая тэндэнцыя ўжо заціхала і многія сярэднія амэрыканцы адчулі стомленасьць ад бурлівай клінтанаўскай эры.

Пішучы гэтыя радкі, я яшчэ ня ведаю, хто з кандыдатаў перамог 2 лістапада (хаця я паставіў свае грошы на Буша). Але пра пэўныя кансэрватыўныя тэндэнцыі амэрыканскай грамадзкай думкі можна гаварыць ужо цяпер. З усіх патэнцыйных прэтэндэнтаў у кандыдаты ад Дэмакратычнай партыі прыхільнікі дэмакратаў выбралі менавіта Джона Керы — найменш радыкальнага ў сваіх поглядах.

Керы настойліва даказваў выбаршчыкам, што будзе біць тэрарыстаў лепш за Буша. Паказальна, што «маральныя каштоўнасьці» цяпер мала турбуюць амэрыканцаў — усяго 12% назвалі іх найбольш важнымі, а першыя месцы занялі эканоміка, вайна з тэрарызмам і Ірак. (Тое, што людзей мала турбуюць маральныя каштоўнасьці, — красамоўны прыклад кансэрватыўнага пэрыяду мэркантыльных інтарэсаў.) Але і ў многіх каштоўнасных праблемах Керы і Эдвардз

> Хто б ні перамог у ЗША, ён будзе даволі кансэрватыўным прэзыдэнтам.

падобныя на Буша — Чэйні: напрыклад, яны таксама выступалі супраць легалізацыі аднаполых шлюбаў — адрозьненьні хіба ў тым, што Буш прапанаваў дзеля гэтага ўнесьці адпаведныя праўкі ў Канстытуцыю.

Такім чынам, хто б ні перамог 2 лістапада — ён ня стаў бы лібэральным рэфарматарам, бо павінен улічваць сёньняшнія настроі амэрыканцаў. Іх пацьвярджаюць вынікі выбараў у Кангрэс.

А на заканчэньне колькі слоў пра тое, чаму я галасаваў бы за Буша, а дакладней, за кандыдата ад Рэспубліканскай партыі, і чаму за яго прагаласавалі каля 60—65 працэнтаў белых амэрыканцаў. Можа, яны адчуваюць сябе абражанымі тым, што дэмакратычнай адміністрацыяй Клінтана былі ўведзены істотныя льготы выключна для нацыянальных меншынь — чорных і лацінас?

Я за мультыкультуралізм у сьвеце, але не ўнутры асобных цывілізацый. Калі Эўропа і Амэрыка стануць «мультыкультурнымі», дзе захаваецца ўнікальная заходняя цывілізацыя зь яе прыярытэтам свабоды і правоў чалавека? У сёньняшняй Эўропе, дзе антыамэрыканізм стаўся модным мэйнстрымам, я хачу, каб Амэрыка заставалася Амэрыкай. Каб яна розьнілася ад сёньняшняй левай Эўропы зь яе паліткарэктным тэрорам, калі ў Францыі замест ангельскай прапануюць вывучаць арабскую мову, калі палестынцы сталі недатыкальнымі героямі, а кандыдата на пасаду ў Эўракамісію адхіляюць толькі за тое, што ён выказаў сваю ўласную нэгатыўную думку пра гомасэксуалізм. Не хачу, каб амэрыканцы сталі падобнымі на эўрапейцаў, што, здаецца, адзіным спосабам вырашэньня праблем лічаць адступленьне і здачу пазыцый. Эўрапейцы адхіляюць вайну як спосаб вырашэньня праблем. Але вайна не пытаецца іх і не пакідае шанцаў слабым.

Генадзь Вугляніца яшчэ ня ўсё расказаў

Генадзь Вугляніца жыве ў Нарвэгіі пад зьмененым імем. Мне прыйшлося доўгімі шляхамі шукаць нумар ягонага сотавага тэлефона. Але адказаць на мае пытаньні ён пагадзіўся ахвотна, і прагаварылі мы зь ім дзьве гадзіны.

«НН»: Вы жывяце пад зьмененым імем, але ня дужа хаваеце нумару свайго тэлефона, раз я яго ўрэшце адшукаў. Чаму не баіцеся лёсу Юшчанкі?

Г.В.: Калі чалавека хочуць знайсьці, яго знойдуць. Я адсочваю: мяне пакуль не шукаюць. Калі б я жыў адзін у лесе і ні з кім не кантактаваў, тады мо й можна было б мяне прасаваць, а я навідавоку ў людзей. Традыцыя прасаваць такіх людзей, як я, ці іхных блізкіх — нядобрая традыцыя, таму яна не прыжывецца, тым больш калі такія людзі маюць досыць матэрыялу, каб іх баяліся чапаць.

«НН»: Вы маеце яшчэ нейкі важны матэрыял? Ці маральна яго хаваць ад грамадзтва ў такім разе?

Г.В.: У мэтах асабістай бясьпекі вымушаны хаваць. Калі аддаць усё, што маеш, траціш перавагу над праціўнікам. Мы ўжо зрабілі памылкі тры гады таму, і я не хачу паўтараць памылак цяпер. Я не пужаю, у мяне гэта не з таго шэрагу, што скрынка кампрамату Лукашэнкі на Шушкевіча ў 1994-м… Я тады галасаваў за Шушкевіча, дарэчы.

«НН»: Няўжо такіх тады бралі ў КДБ?

Г.В.: Тады бралі любых, гады былі цяжкія, не хапала кадраў. А я чалавек апалітычны, і ў гэтым сэнсе падыходзіў.

«НН»: Ваша імя ў чарговы раз згадалі па БТ у фільме «Кансьпіралёгія». Паводле іхнай вэрсіі, вы па службе мелі кантакты з супрацоўнікамі замежных выведак і ўрэшце перабеглі на Захад, атрымаўшы палітычны прытулак, хоць пошукі ва ўказанымі вамі месцы не далі вынікаў. Як вы можаце гэта пракамэнтаваць?

Г.В.: Няпраўда гэта. Фантастыка бязглуздых сцэнарыстаў. Я ня меў ніякіх кантактаў з замежнымі спэцслужбамі і ўстановамі. Я быў супрацоўнікам зусім іншага аддзелу, які арыентаваўся на ўнутраныя справы — ахову канстытуцыйнага ладу і барацьбу з тэрарызмам. Што я выехаў зь Беларусі — проста ў мяне былі нейкія веды ці вопыт. Калі ёсьць галава, можаш знайсьці выйсьце зь любога становішча. Наш сыход за мяжу быў папросту спосабам вывесьці з-пад удару максымальную колькасьць людзей. На лепшае мне не хапіла часу. Яшчэ не пара расказаць, якая складаная гульня, як многа ў нашу гісторыю было ўцягнута людзей. Я доўга разважаў над гэтым тут і прыйшоў да высновы, што іншага спосабу дзейнічаць у мяне не было.

«НН»: Вы адсочвалі арганізацыю «Край», і выйшла так, што гэта яны перавэрбавалі вас?

Г.В.: Пасьля нашага ад'езду зьявілася шмат дадумак: «Край» напісаў, што я, як сумленны чалавек, зразумеў, што іхная справа справядлівая, перайшоў на іх бок… Гэта, вядома ж, ня так, ні ў якія арганізацыі я не ўступаў і ні на чый бок не пераходзіў. У той справе кожны меў свае інтарэсы, і я меў свае прафэсіянальныя і асабістыя інтарэсы. Улады кажуць, што гэта была палітычна скіраваная справа. Каб яна была палітычная, мы б за два-тры дні да выбараў яе раскруцілі, усё падрыхтаваўшы. Наадварот, пратачылася інфармацыя, і мы не пасьпелі давесьці справу да канца. А то знайшлі б, і машыну знайшлі б.

«НН»: І ўсё ж, што вамі рухала, калі не ідэя і не замежныя грошы?

Г.В.: Па натуры люблю прыгоды. Паляваньне. І, як чалавек сумленны, маю нейкую агульначалавечую неабыякавасьць. На маю думку, справядлівасьць павінна перабароць бруд. Мне было для сябе цікава адкрыць праўду — ці было забойства. Пасьля месяцаў… Дый ня месяцаў — больш… Выйшлі на чалавека, што супадаў па ўсіх парамэтрах, але ня ён. Урэшце выйшлі на Мяцельскага…

«НН»: Як вы атрымлівалі тую інфармацыю? Цяпер можаце расказаць нешта з таго, чаго два-тры гады таму расказаць не маглі?

Г.В.: Не.

«НН»: А калі зможаце расказаць усё?

Г.В.: Калі ў Беларусі памяняецца сыстэма ўлады і адыдзе шэраг пэрсонаў. Галоўнае, што справа ідзе, — не забывайцеся, што Сівакоў ня выехаў на Алімпіяду.

«НН»: Прабачце, але калі б я ўзяўся разьбіраць такую справу, я б стаў нешта рабіць не з краёўскай «Маладой гвардыяй», а са сваімі хлопцамі з аддзелу, зь якімі разам у спартзалю хаджу. Што ў мяне найбольш недавер выклікае — што вы сталі гэта шукаць з «Маладой гвардыяй». Гэта не ў традыцыях КДБ.

Г.В.: Я вывучаў іх не адзін год і меў звычку грунтавацца на фактах, а не на чутках. Зь некалькіх соцень там сапраўды няшмат было такіх, якія маглі б на высокім узроўні рабіць такую працу, якую трэ было рабіць. Памятаеце, як у той кнізе: ноймем бандытаў, бо яны бяруць нядорага і ніколі не здаюць. І іншае: вораг майго ворага — мой сябар. Калі ёсьць сумесныя інтарэсы, чаму б не папрацаваць. Звонку гэта цяжка зразумець, але гэта адбылося. Дарэчы, каб у нашым грамадзтве гэтак маглі знаходзіць лад розныя сілы!..

Жнівень 2001 году. Генадзь Вугляніца (зьлева) і Яўген Жарнасек абвяшчаюць вынікі свайго расьсьледаваньня зьнікненьня Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага. Цяпер Генадзь Вугляніца жыве ў Нарвэгіі пад зьмененым прозьвішчам.

Я ня меў ніякіх кантактаў з замежнымі спэцслужбамі і ўстановамі.

«НН»: Досьвед такіх людзей, як вы, можа быць запатрабаваны ў спэцслужбах дэмакратычнае Беларусі.

Г.В.: Хутчэй за ўсё, я ніколі не вярнуся да тае працы.

«НН»: А калі Радзіма пакліча за родны змагацца парог?

Г.В.: Нават калі пакліча… Пераезд у Нарвэгію адкрыў для мяне шмат новага. Я ж нават замежнага пашпарту да таго ня меў, не ўяўляў, які гэта сьвет. Мне зь дзяцінства ўбівалі ў галаву, што тут усе капіталісты, злыдні, а аказалася ўсё інакш. Каб у нас такое стала, як тут, у Нарвэгіі, людзі падумалі б, што настаў рай на зямлі. Тут, ведаеце, нявыгадна быць толькі крымінальнікам, усім астатнім жывецца лепш, чым у нас. Тут усё прадумана дзеля чалавека. Тут сыстэма скіравана на тое, каб простым людзям жылося лепей, каб яны адчувалі сябе раўнапраўнымі, абароненымі законам, канстытуцыяй. Тут усё для чалавека!.. Тут чалавека зь дзяцінства прывучаюць жыць з даверам, каб ён давяраў іншым і рабіў так, каб іншыя яму давяралі. Ведаеце, што мяне шакавала? Тут усё так адкрыта… Калі я знайшоў сабе тут першую работу, выйшла так, што я амаль адразу захварэў, расьперажываўся, што страчу працу. Пайшоў да начальніка, а ён мне кажа, што ў Нарвэгіі чалавек мае права чатыры разы на год па тры дні пры хваробе заставацца дома і не прыносіць ніякіх апраўдальных дакумэнтаў. Я пачынаю ганарыцца гэтай краінай…

Вось кіраўнікі КДБ раённага ўзроўню — якія ў іх машыны, кватэры, колькі кватэр у іхных жонак, якога памеру загарадныя дамы.

Калі я чытаю тут выступы Лукашэнкі, мне робіцца сьмешна — тое, што ён прыдумляе пра Захад. Адсюль гэта сьмешна. Як шкада, што беларусы — і простыя рабочыя, і супрацоўнікі спэцслужбаў — ня ведаюць, якога жыцьця іх пазбаўляюць, не даючы народу магчымасьці самому вырашыць свой лёс.

«НН»: Мне сказалі, што вам можна патэлефанаваць толькі ўвечары, бо вы працуеце штодзень ад 7-й ранку да 7-й вечара. І гэта жыцьцё?

Г.В.: Гэта звычайная справа. На нафтавышках выгадна, каб людзі шмат працавалі. Выгадна і прадпрыемству, і людзям, бо болей заробіш. Два тыдні адпрацую, тры буду дома.

«НН»: Вы сказалі, што супрацоўнікі спэцслужбаў ня ведаюць, якога жыцьця іх пазбаўляюць. Што, «крышаваньне» не дае ўжо такога дабрабыту?

Генадзь Вугляніца робіць на нафтавышцы па 12 гадзінаў у дзень. Два тыдні працы — тры тыдні дома.

WWW.FRONSCOTT.COM

Генадзь Вугляніца — у КДБ ад 1994, атрымаў палітычны прытулак у Нарвэгіі ў 2001. Нар. у 1968, бацька паходзіць з Сулічава на Дарагічыншчыне, маці зь Бервішча пад Вуздой.

Г.В.: У мой час у КДБ большасьць была прафэсійных і сумленных людзей. Калі б не яны, наступствы кіраваньня Лукашэнкі былі б нашмат горшыя. Толькі што іх дабрабыт залежыць ад службовага становішча, яны баяцца быць выкінутымі з сыстэмы. Вось некаторыя кіраўнікі сярэдняга зьвяна — гэта так. Правядзіце журналісцкае расьсьледаваньне, якія ў іх машыны, кватэры, колькі кватэр у іхных жонак, якога памеру загарадныя дамы. Я ня маю на ўвазе генэралаў — тым усё дзяржава забясьпечвае, раскапайце на раённым узроўні…

«НН»: Як многа вы страцілі, сышоўшы на Захад… Дарэчы, яшчэ адно цёмнае месца — як вы ўцякалі, гэта ўжо не сакрэт?..

Г.В.: Ні адной кропкі ніякага закону мы не парушылі, адно што я не напісаў рапарту на звальненьне і яны могуць лічыць мяне дэзэрцірам. Мы проста прыехалі ў Маскву, а гэта ўжо другая краіна, і там ужо дзейнічаюць іншыя законы. Паколькі ўдалося пакінуць Беларусь спакойна, астатняе вырашылася само сабой. А што пакінулі спакойна, дык, дзякуй богу, мяне сяму-таму навучылі на працы. А ў Беларусі мае сябры застануцца мне сябрамі. І я яшчэ вярнуся ў Беларусь.

«НН»: А калі б напісалі рапарт аб звальненьні, ці былі б цяпер у жывых?

Г.В.: Было б нешта іншае. Ня ведаю.

«НН»: Беларуская мова захоўваецца ў сям'і?

Г.В.: Дачка гаворыць на нарвэскай пераважна. У сына шмат беларускіх кніг, «Адкуль наш род» Арлова яму дзед Радзім прывёз, дык ён яе амаль вывучыў на памяць. Жонка мая па-беларуску зусім не гаворыць, таму дома беларуская мова амаль не гучыць.

«НН»: А ў вас самога беларуская мова бездакорная.

Г.В.: У школе меў пяцёрку па ёй. Пасьля праца ў мяне была такая — зь беларускамоўнымі кантактаваць.

Зрэшты, перад маім прыходам у КДБ там дакумэнтацыя вялася па-беларуску, людзі залікі здавалі на веданьне мовы.

«НН»: Парайце мне як чалавек, які працаваў у аддзеле па ахове канстытуцыйнага ладу, чаго мне не рабіць, каб не зрабіць… ммм… памылак у жыцьці?

Г.В.: Адзін мой начальнік, якога я вельмі паважаю, часта паўтараў фразу, якую я назаўжды запомніў: галоўнае заставацца сумленным і сумленна рабіць сваю справу ў гэты несумленны час. Жадаю ўсім заставацца сумленнымі людзьмі. І… [доўгая паўза] людзі, будзьце пільныя… У свой час я зайздросьціў людзям, якім пры такім стаўленьні ўлады і грамадзтва хапала духоўных сілаў і вытрымкі займацца нацыянальнай справай. Гэта трэба нарадзіцца такім чалавекам — стаць такім немагчыма… Апошняе: найлепшая кансьпірацыя — гэта адсутнасьць кансьпірацыі.

Гутарыў Барыс Тумар, Осла

Ад аўтара: Калі ты аднойчы працаваў у КДБ, табе ўжо ніколі да канца не паверацъ. У мяне засталося ўражаньне, што Вугляніца нешта ўсё ж хавае. Хавае нейкія свае матывы, не раскрывае нічога з часоў сваёй працы «па спэцыяльнасьці», уласна па ахове канстытуцыйнага ладу. Было б вар'яцтвам лічыць яго агентам, засланым у нетры Захаду на дзесяцігодзьдзі наперад, але ўсё ж — чаму з падлеткамі-краёўцамі? Той, хто адкажа на гэтыя пытаньні, напіша адну з найцікавейшых кніг новага стагодзьдзя.

На ростанях

PHOTO: BYMEDIA.NET

Юры Хадыка

Пасьля 17 кастрычніка Лукашэнка закрыў для сябе шлях да паразуменьня з апазыцыяй. Тым самым ён аддаў свой лёс у рукі ўласных клеўрэтаў.

Юры Хадыка — прафэсар, доктар фізыка-матэматычных навук, намесьнік старшыні Партыі БНФ

Кароткая, але бурлівая кампанія 2004 г. па выбарах ПП НС і правядзеньні рэфэрэндуму скончылася. Хутка зьнікне з экранаў тэлевізараў Лідзія Ярмошына і часьцей загучаць рэпартажы пра гаспадарчыя праблемы. Жыцьцё вяртаецца ў звыклае рэчышча. Народу прапанавалі паверыць у нешта непраўдападобнае але пажаданае для адных і ненавіснае для другіх. Сацыёлягі хутка назавуць іншыя, больш праўдападобныя лічбы тых, хто паверыў, і тых, хто не. Але гэта ня будзе мець ніякіх наступстваў. Стабільнасьць па-беларуску. Тэма палітычнага самаадчуваньня ППРБ, аднак, з гэтага часу робіцца найважнейшаю.

Як гэты чалавек пакіне самую высокую дзяржаўную пасаду ў Беларусі? Добраахвотна? Прымусова? Ці будзе разарваны паўсталым народам дзеля выкупленьня грахоў? Ніводная з гэтых магчымасьцяў ня выключаная. Нават першая, найменш імаверная, улічваючы любоў Аляксандра Рыгоравіча да ўлады. Але ж ён можа стаміцца. Можа расчаравацца, бо цяжкасьцяў будзе паўставаць перад ім усё болей. Міжнародная ізаляцыя, эканамічныя санкцыі, неразуменьне ў Крамлі. Урэшце, ён можа проста зразумець тупіковасьць абранага шляху. Можа падумаць пра будучыню сваіх дзяцей і ўнукаў. Выбраць мяккі талерантны спосаб разьвітаньня з уладаю ніколі ня позна. Ёсьць жа прыклад Аўгуста Піначэта. Таго, праўда, натхніў на гэты мужны крок Папа Рымскі. Неймаверна, каб Патрыярх Маскоўскі зрабіў нешта падобнае ў адносінах да Аляксандра Лукашэнкі. І справа ня толькі ў розным стаўленьні вышэйшых ярархаў усходняй і заходняй хрысьціянскай царквы да дыктатуры як формы ўлады. Вялікае значэньне мае і сіла веры саміх дыктатараў. А.Лукашэнка да сёньняшняга дня не дэзавуіраваў сваё самаазначэньне як «праваслаўнага атэіста».

Вядома, нэафіты часам адрозьніваюцца большай рэлігійнасьцю, чым звычайныя вернікі. Але ж ні фанатызму, ні простага выкананьня нормаў хрысьціянскай этыкі ў паводзінах тройчы першага прэзыдэнта РБ да сёньня не праглядалася. Таму і добраахвотны сыход у адстаўку пакуль што застаецца выключна віртуальнай магчымасьцю.

Супрацьлегласьцю гэтаму варыянту зьяўляецца народны бунт. Так, беларусы цярпімыя і цярплівыя. Іх гэтаму навучыла гісторыя. Так, інтэлігенцыі, у адрозьненьне ад бюджэтнікаў, мала, і яна запалохана. Інтэлігенцыя — сумленьне нацыі, якое пакуль сьпіць. Так, улада скансалідаваная і бессаромная. Але ўсякаму цярпеньню бывае канец. І сумленьне можа нечакана абудзіцца. Дый улада ня ўсёмагутная. Што ж можа падштурхнуць Беларусь і яе ашалелы рэжым на шлях крывавай бойкі? Зразумела, у першую чаргу эканоміка. Не дарма ППРБ ператварыў краіну ў вялізны картэль, дзе ўсё схоплена і кіравана. Гэткая жорсткасьць сыстэмы і небясьпечная. Наша эканоміка — эканоміка адкрытага тыпу. Санкцыі наўрад ці можна абысьці дзякуючы сувязям з краінамі-ізгоямі. Ад павольнага эканамічнага ўдушэньня ня выратуе і Расея, тым больш што платаю за яе дапамогу можа быць толькі аншлюз. Лукашэнка гэтага ня хоча. Таму нішто ня можа замінаць краіне каціцца да эканамічнага каляпсу.

Магчымасьць зьмены ўлады праз бунт залежыць у многім ад уладных рэсурсаў, якія могуць быць супрацьпастаўлены народнаму абурэньню. І ў гэтым сэнсе лёс Аляксандра Рыгоравіча незайздросны. Войска не адчувае да яго ні любові, ні пашаны. Што, акрамя ўсьмешак, можа выклікаць у кадравых афіцэраў чалавек, які апрануўся ў форму генэралісымуса, але выйграў у сваім жыцьці толькі вайну з апазыцыяй? Малая імавернасьць і падтрымкі ў крызіснай сітуацыі з боку МУС і КДБ. Адзінай структурай, адданай прэзыдэнту, ёсьць яго Служба аховы. Але менавіта яна і адмовіцца ад яго пры ўзьнікненьні рэальнай небясьпекі. Выпэленгаваныя дзецюкі прыдатныя толькі для распраў з моладзьдзю на мітынгах.

Аднак галоўная прычына малой імавернасьці бунту ў тым, што людзі будуць цярпець і працаваць, абы толькі «не было вайны». У гэтым шчасьце і гора Беларусі. Але падобна як у паравым катле заўжды прадугледжаны клапан, каб выпускаць залішнюю пару, так і ў любым дыктатарскім рэжыме ёсьць людзі, якія пільна сочаць за станам сацыяльнай напружанасьці. Гэта — клеўрэты. Прысьпешнікі, гатовыя дагаджаць свайму гаспадару ва ўсім. Калі гаворка не аб іх жыцьці. Бяз гэтай катэгорыі людзей ня можа існаваць ніякая дыктатура.

Аляксандар Лукашэнка, які, на думку эўрапейскіх назіральнікаў, брутальна сфальсыфікаваў вынікі рэфэрэндуму і выбараў, закрыў для сябе шлях да паразуменьня з апазыцыяй. І зрабіў гэта сьвядома — аб'явіўшы мэтай «не пакінуць ад апазыцыі каменя на камені». Ён лічыў, што гэтым спрасьціў сытуацыю. Насамрэч ён аддаў свой лёс у рукі клеўрэтаў. Яны яшчэ ў большай ступені, чым А.Р., імкнуцца захаваць бескантрольную ўладу і не падпарадкоўвацца Маскве. Яны перажывуць забароны на ўезд у цывілізаваныя краіны, але не перажывуць рэальнай эканамічнай бляклады. Вось яны — пагроза жыцьцю і ўладзе Лукашэнкі. Іх зброя — яд і кінжал, змова і пакаёвы пераварот. Яны адначасна і пагроза свабодзе ды дабрабыту беларускага народу. Беларусь у выніку «рэфэрэндуму» апынулася ў адчайным цугцвангу. Клеўрэты зрабілі ўсё, каб заблытаць і замаскаваць, за што менавіта галасавалі людзі. За Беларусь? За Лукашэнку? Ці за іх, любімых?

Нашаму народу больш за хлеб і відовішчы патрэбна аб'ектыўная інфармацыя. Яна патрэбна тэрмінова. Каб прэзыдэнцкія выбары 2006 г. ня сталі апошнім цьвіком у труну нашай свабоды.

Фонд, Рух, перадвыбары

Лёгіка дзеяньняў уладаў апошнія гады накіравана на тое, каб пазбавіць грамадзтва веры ў выбары. Пачынаючы з 1999 г., пры новым Выбарчым кодэксе, уладамі робіцца ўсё магчымае, каб выбаршчыкі ня мелі магчымасьці зрабіць асэнсаваны выбар. Але толькі сёлета ўлады ўпершыню пайшлі на масавыя фальсыфікацыі праз дзейнасьць участковых камісій. Тое, што было раней апрабавана ў буйных гарадах, стала масавай практыкай у правінцыі.

Калі спытаць: «За колькі баксаў прадаецца сумленне?» — то адказ будзе вельмі просты: «сто». Менавіта па 220 тысяч рублёў атрымалі ўзнагароды старшыні і сакратары камісій за забесьпячэньне «ашаламляльнай» перамогі. І пры гэтым яны мелі магчымасьць працаваць на асноўным месцы работы, дзе таксама ў пераважнай большасьці атрымалі свае заробкі.

Пры гэтым мала ўвагі зьвернута на мэханізм запалохваньня выбаршчыкаў пры датэрміновым галасаваньні. Члены камісій, кіраўнікі сярэдняга зьвяна, мелі неабмежаваны доступ да сьпісаў галасуючых датэрмінова. Праз гэты доступ вызначаліся работнікі, якія не зрабілі датэрмінова свайго выбару і якіх трэба загнаць на ўчастак. Упершыню вельмі вялікі працэнт галасуючых прыпаў на суботу, калі стала відаць, што чатыры дні датэрміновага галасаваньня не далі неабходных 35% яўкі. Але верхам непрыстойнасьці зьяўляецца рашэньне ЦВК дастаўляць сьпісы галасуючых у райвыканкамы, каб іх кіраўніцтва магло «аналізаваць» сьпісы грамадзян, якія ўхіліліся ад датэрміновага галасаваньня.

- Верхам непрыстойнасьці зьяўляецца дазвол ЦВК падаваць сьпісы галасуючых у райвыканкамы, каб іх кіраўніцтва магло «аналізаваць» сьпісы грамадзян, якія ўхіліліся ад датэрміновага галасаваньня.

Ход апошняй кампаніі засьведчыў, што апазыцыя, на жаль, не змагла пераадолець расьцярушанасьць сваіх захадаў. Дзеяньні «Пяцёркі+» раскардынаваліся ў час выбарчай барацьбы. Праблемы з рэгістрацыяй ініцыятыўных груп, кандыдатаў, удзел у кампаніі лідэраў партый, якія сталі кандыдатамі, не дазволілі сабраць у адзіны кулак сілы ў акругах, пакінуўшы аднаго кандыдата. З пазыцыі сёньняшняга дня відаць, што гэта не дало б перамогі — бо выбараў не было — нікому з дэмакратычных кандыдатаў, але дадало б выбаршчыкам веры ў адзінства апазыцыі. На жаль, адзінства дзеяньняў у акругах не назіралася.

- Адзінства дзеяньняў у акругах не назіралася. «Пяцёрка+» ня здолела абмежавацца адным кандыдатам на акругу. Гэта не дало б перамогі — бо выбараў не было, — але дадало б выбаршчыкам веры ў адзінства апазыцыі.

Цяпер настае час асэнсаваньня палітычных вынікаў 2004 г. і далейшых плянаў. Ілюзіі пра магчымасьць зьмены ўлады шляхам выбараў разьвеяліся канчаткова. Рэжым уступіў у стадыю свайго таталітарнага разьвіцьця, і рэпрэсіі супраць іншадумства будуць узмацняцца. У гэтых варунках, па-першае, вельмі важна праяўляць салідарнасьць з кожнай ахвярай палітычнага перасьледу. Патрэбны Фонд салідарнасьці, які б дапамагаў ахвярам.

Па-другое, нам трэба рэальна згуртавацца ў народным руху «За Беларусь», які аб'яднаў бы як вядомых асоб накшталт Вайтовіча, Машэравай, Фралова, так і ўсе рэальныя дэмакратычныя партыі, прафсаюзы, НДА. Першым крокам да гэтага мог бы стаць Сход актыўных грамадзян. Папярэднічаць яму маглі б сходы па абласьцях з абмеркаваньнем плянаў далейшай барацьбы.

Па-трэцяе, нам, канечне, трэба выйсьці на праймэрыз па выбарах адзінага кандыдата ад дэмакратаў Беларусі на прэзыдэнцкіх выбарах 2006 г. І зрабіць гэта, па магчымасьці, у першай палове 2005 г.

Міхась Лагор, Гарадок

Тэрыторыя без чужога слова

Колішні «дзень без чужога слова», зладжаны «НН», паціху занік. Але без стварэньня «тэрыторый без чужога слова» нам не стварыць душэўнага камфорту для беларускамоўных.

Неяк, седзячы з плястыкавым куфлем квасу пад парасонам вулічнага бару, мой добры знаёмы стомлена паскардзіўся. Паводле яго слоў, быць нацыяналістам ва Ўкраіне лягчэй, чым у Беларусі. Бо ў суседзяў ёсьць Львоў, куды кожны патрыёт, стаміўшыся ад змаганьня, спаняверыўшыся, можа паехаць. Тамака можна адпачыць ад расейскай мовы, шыльдаў, папсы. Тамака ў барах б'юць за расейскія песьні. Тамака наноў можна адчуць сябе ўкраінцам, усмактаць у сябе дух і навакольную атмасфэру, якой хопіць потым на далейшае змаганьне.

Потым знаёмы запытаўся ў мяне: «Дзе ў беларуса свой Львоў? Куды можна паехаць адпачыць стомленаму душою?» Толькі некалі ён адчуў нешта падобнае, калі трапіў гандляваць у Гайнаўку і ўбачыў на кожнай камяніцы намаляваны бела-чырвона-белы сьцяг і надпіс «Жыве Беларусь!».

У беларусаў няма свайго Львова, але няма й свайго Крыму. Хаця калі б за Саветамі мы не пазбавіліся Беластоку, дык маглі б атрымаць і Калінінградзкую вобласьць з выхадам да мора і наступныя праблемы з прыбышамі-расейцамі й выгнанцамі-немцамі. Зусім як ва Ўкраіне зь мясцовымі татарамі й расейскім насельніцтвам у Крыме.

Нехта скажа, што Вільня магла б стацца беларускім Львовам, бо гэтыя гарады-легенды маюць падобны лёс. Абодва лічыліся да 1939 г. польскімі местамі. Абодва стаяць, адпаведна, сярод украінска- і беларускамоўнага навакольля. Але з прычыны гістарычных умоў, якія склаліся, украінскай інтэлігенцыі й сялянам з навакольля пашчасьціла апанаваць Львовам. Вільню ж літоўцы цалкам не ператравілі дагэтуль.

Аднак ня будзе ніякага выніку з усіх гэтых перакройваньняў мапы ў мроях. Мы маем, што маем. Таму, каб адпачыць душою, беларусу сапраўды няма куды паехаць. Але ці трэба некуды падарожнічаць? Колішні «дзень без чужога слова», зладжаны «НН», быў вельмі цікавай задумкаю, якая паціху занікла, як і большасьць беларускіх праектаў. Прызнацца, сам ні разу не пратрымаўся тады на 100% — нейкія праблемы, праца, дый нават сарамлівасьць перад блізкімі, што ведаюць цябе «інакшым». Але тая ідэя пакінула па сабе высновы.

Свой Львоў, свой горад-мара павінен стварацца тамака, дзе ты стаіш. Беларускасьць не жыве ў нейкім месьце ці мястэчку. Яна жыве ў душы… Усё далейшае залежыць ад таго, колькі зьбярэцца такіх душ разам у адным горадзе, мястэчку, вуліцы, камяніцы. Бо душа расейца ці малароса з Днепрапятроўску не адпачывае ў Львове. Для іх душы там існуюць толькі дадатковыя праблемы.

Пакуль што сьвядомым беларусам застаецца толькі зьбірацца гурткамі — за кавай, півам, гарэлкаю ці проста так… Сярод іх зьяўляецца, як прывід, наш, беларускі адпаведнік Львова.

Руслан Равяка, Баранавічы

...Цалаваньне даганяючы

Працяг са старонкі 2.

Багата людзей у Беларусі ня маюць аніякіх падстаў любіць цяперашнюю ўладу, яны спадзяваліся хоць на нейкія зрухі да рэалістычнай палітыкі, але цяпер амаль ні на што не спадзяюць. Апазыцыя ня сталася прыладаю нацыі. І вялікая віна ў гэтым партыйных босаў.

Беларуская апазыцыя заўсёды, калі пачынаецца паляваньне, пачынае карміць сабак, то бок сігае ў народ, «бо прыйшоў час пазнаёміцца». Ясна, што такія сваты ні да чога не прыводзяць: даганяючы не нацалуешся. Сёлетнія не выключэньне.

З 1995 г. у нашай краіне ствараецца фашысцкі рэжым. Лукашэнка адкрыта сказаў, што ня толькі кепскае было ў Гітлера. Апазыцыя не адважылася назваць рэчы сваім імем.

Год таму былі мясцовыя выбары. Перад гэтым прайшлі прэзыдэнцкія. Здавалася б, аналізуй, рабі захады, мацуй партыйны рух і шэрагі, гадуй крытычную масу, гартуй народ, рыхтуйся да выратавальных выбараў. Тут наш Родас, тут нам і сканаць. Дык жа не! Ідыёцкае чаканьне «няўмольнай хады гісторыі», якая за нас зробіць справу. Вядома, паехаць у Лёндан, у Страсбург, у Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку куды прыемней і лягчэй, чым у Баранавічы, Кобрынь, Полацак, Бабруйск, Жлобін.

Ня ведаю, які плён ад тых партвізытаў, а вось ад ненаведваньня пералічаных мясьцін ды шмат іншых — багата благога. З усяго, што рабіла апазыцыя, мабыць, толькі кампанія па прыцягненьні ўвагі да лёсу зьніклых палітыкаў была слушная. Анатолю Лябедзьку пабілі рэбры і ныркі. Забіць яны ўжо не адважыліся.

Па сутнасьці, мабыць, не адна мая партыя дэзарганізаваная і ў значнай ступені дэмаралізаваная. Калі хто і застаўся між актыўных шыхтоў, то гэта выключна энтузіясты, сапраўдныя нацыяналісты, якія рабілі апазыцыйную справу цалкам аўтаномна, без істотнай дапамогі і парады зь Менску. Такім чынам, верхняе кіраўніцтва нам як бы і не патрэбна. Цяпер ягоная функцыя — «aus dem Not Tugend machen», то бок растлумачыць urbi et orbi, якая кака дыктатура і як яна паскудна выйграла. Як гэта абрыдзела!

Мне здаецца, правадыры мусяць пяціплюсова пайсьці прэч. Разам з падсадною качкаю ад сацыял-дэмакратыі.

Гэтыя «выбары» ня вырашылі і ня вырашаць балючых праблем нашай любай Айчыны. У нас няма іншага выйсьця, як вымусіць рэжым гуляць па дэмакратычных правілах і падзяліцца ўладаю. Дзеля гэтага трэба часова пакінуць напханыя падслухоўвальнай кадзбісцкай апаратурай офісы ды пайсьці ў народ, каб адказаць яму на некалькі простых пытаньняў, накшталт «Калі не Лукашэнка, то хто?», «Што і як будзе, калі яго ня будзе?», «Як жыць далей?». Трэба змусіць рэжым ліквідаваць найбольш адыёзныя пункты выбарчага махлярства, аказваць уціск на «палатнікаў і палатніц», трэба знайсьці яго болевыя пункты і ўзьдзейнічаць на іх.

І, вядома, надаць працы ў моладзевым асяродку мае першаступеннае значэньне. Сёлета рэжым абыходзіўся з навучэнцамі як зь дзяржаўнымі рабамі ці быдлам. («Хто зь першага абшчажыцця? Устаць і на галасаваньне!» — фізкультурны факультэт, Мазыр.)

Партыйныя кіраўнікі мусяць генэраваць прадукцыйныя ідэі, знаходзіць шыфр да ўзламаньня сыстэмы. Калі яны гэтым не займаюцца, то гэтым павінен заняцца нехта іншы.

Шкада, што партайбонзы творча не перачыталі твораў Леніна ды іншых дыктатараў, каб правільна рвацца да ўлады. Пакуль што гэта не прарыў, а крактаньне на гаршку.

Спачуваючы лёсу апазыцыі, я мушу выказаць сваю нязгоду зь ейнымі верхаводамі. Спадзяюся, я не адзіны.

Сьветлагорац (адрас у рэдакцыі)

P.S. Калі перад прэзыдэнцкімі выбарамі яны абвесьцяць пра стварэньне кааліцыі «Шасьцёрка з гакам», я лопну ад сьмеху.

Пакуль ёсьць «Крыжачок»

Пакуль у продажы ёсьць «Крыжачок» па 1 тыс. за 0,7 л, добрых зьмен у нашым жыцьці ніколі не адбудзецца. Такія высновы мы з мужам зрабілі пасьля 17 кастрычніка. Я хадзіла на выбарчы ўчастак, і вялікая колькасьць п'яных твараў там кідалася ў вочы. А муж 17 кастрычніка дзяжурыў у прыёмным пакоі адной з бальніц, і, калі вярнуўся ранкам дахаты, першыя яго словы былі: «Ніякай фальсыфікацыі не было». Ен прыняў тады каля 30 хворых, сярод якіх было толькі некалькі «цьвяразых». Пры гэтым добрая частка зь іх «ужывала» на той момант ня першы дзень. Амаль усе яны ўжо з прыметамі духоўнай і інтэлектуальнай дэградацыі. За што і за каго ім галасаваць?

За апошнія 10 год беларускі народ пачаў катастрафічна сьпіваца. На маю думку, гэта адзін з галоўных адмоўных вынікаў 10-гадовай эпохі.

Прэзыдэнт вядзе здаровы лад жыцьця, ганяе шайбу, гарэлкі не ўжывае. Такі «станоўчы герой», узор для нацыі. Але яго электарат ціха п'е і дэградуе.

Кал пытаеш у хворага: «П'еш?» — самы часты адказ: «Як усе».

Я раблю выснову, што ўлада мэтанакіравана спойвае народ танным чарнілам, узрошчваючы сабе электарат. Калі б прэзыдэнт падпісаў дэкрэт аб «сухім законе», ён страціў бы значную частку таго электарату. Але трэба прымусіць уладу пачаць барацьбу з п'янствам.

Трэба распачынаць усебеларускі рух супраць п'янства, гімнам якога можна ўзяць песню «Зэту» «Танец сьмерці».

Ірына Чатырка, inbox.ru

ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

26 кастрычніка суд Жыткавіцкага раёну задаволіў пазоў Свабоднага прафсаюзу мэталістаў да адміністрацыі Жыткавіцкага матарабудаўнічага заводу (ЖМЗ): актывістку СПМ **Раісу Плюшчакову** незаконна звольнілі з прадпрыемства сёлета ўлетку. Па 100 тыс. руб. ёй заплаціць адміністрацыя ЖМЗ і прафсаюз заводу. 1 лістапада Беларускі кангрэс дэмпрафсаюзаў зьвярнуўся ў Вярхоўны суд з просьбай адмавіць Плюшчакову на працы. У Менску за ўдзел у акцыі 28 кастрычніка асуджаны **Сяржук Мацкойць** (15 с.), **Ірына Патанава** (3 с.). Прадстаўніцтва дабрачыннай карпарацыі **«Каўнтэрпарт Інтэрнэшнл»** у Беларусі зачынена 29 кастрычніка. Старшыню БСДП (НГ) **Мікалая Статкевіча** 29 кастрычніка, заміж каб выпусьціць пасьля арышту, сьпярша завезьлі ва ўправу сьледчага камітэту МУС па Менску — дапытвалі як сьведку акцый 18—20 кастрычніка. 67-гадовая пэнсіянэрка з Ваўкавыску **Валянціна Салдатава** 29 кастрычніка абвясьціла галадоўку: яна патрабуе перагледзець вынікі выбараў у Ваўкавыскай акрузе. Уначы з 30 на 31 кастрычніка абрабаваны офіс **філій БНФ** і **БХК** у Маладэчне — скрадзена аргтэхніка. 1 лістапада журналіст **Павал Мажэйка** быў асуджаны на 7 сутак за несанкцыянаваны пікет 4 кастрычніка; у залі суду ён абвясьціў галадоўку. 29 кастрычніка былі затрыманы ўдзельнікі таго ж пікету журналісты **Наталя** і **Анатоль Макушыны**. 1 лістапада суд не задаволіў скаргі адвакаткі Веры Страмкоўскай на незаконнае падаўжэньне тэрміну ўтрыманьня пад вартай **Міхаіла Марыніча**. У Сьвіслачы (Гарадзеншчына) 1 лістапада пачаўся суд над **Віктарам Сазонавым**, **Сяргеем Мальчыкам**, **Вадзімам Саранчуковым**, затрыманых падчас ушанаваньня памяці братоў Каліноўскіх. У Воранаве пэнсіянэр **Юзаф Кірвель**, абвінавачаны ў распаўсюдзе газэты «Тут і цяпер», атрымаў папярэджаньне ад адміністрацыйнай камісіі. **Аксана Новікава** 1 лістапада атрымала выклік у пашпартна-візавую службу Савецкага раёну Менску: там захоўваюцца дакумэнты на імя Ірыны Шынгаровай з фатаздымкам Новікавай. БАЖ 1 лістапада зьвярнуўся з адкрытым лістом да міністра інфармацыі Ўладзімера Русакевіча з просьбай адмяніць загад аб прыпыненьні выхаду «Местной газеты», галоўны рэдактар якой **Андрэй Шантаровіч** галадае ў знак пратэсту.

АШ

АДНА БАБА СКАЗАЛА

Журавіны і КДБ

Паводле чутак, Масква наводнена радыяактыўнымі журавінамі. Партыя ягад, забруджаных радыянуклідамі, паступіла на сталічныя рынкі зь Беларусі, дзе ў гэтым годзе журавінны ўраджай выдаўся на славу. Крыніцы «МК» зьяўленьне радыяактыўных ягад зьвязваюць з рэфэрэндумам, які правёў Лукашэнка. Маўляў, усе праваахоўныя органы былі мабілізаваны на тое, каб забясьпечваць палітычны парадак. Таму беларусы і змаглі назьбіраць радыяактыўных журавін у месцах, дзе рабіць гэта забаронена.

«Московский комсомолец»

Пяць частак беларусаў

Бутафорскі рэфэрэндум вачыма магілёўскага назіральніка

Рэфэрэндум быў заканамерным. Іншага шляху надаць рэжыму бачнасьць легітымнасьці не было. Заканамерны, але супрацьзаконны.

Усё вырашаюць дзьве апошнія ночы перад днём галасаваньня, калі адмысловыя людзі кідаюць бюлетэні за адмысловага чалавека ў скрыню. А потым па-рознаму сябе паводзяць. Адны пачынаюць дыхаць з палёгкай, што яны выканалі «сваю чыста тэхнічную працу», іншых жа пачынае душыць сумленьне й боязь. Сумленьне таму, што яны чарговы раз дапамаглі гэтаму адмысловаму чалавеку чыніць беззаконьне ў краіне, а боязь таму, што раптам усё тое, што яны зрабілі, выкрыецца. Як тады глядзець у вочы суседзям? А калі гэта школьныя настаўнікі, дык як глядзець у вочы вучням? Бо яны ж схлусілі! А ў школе вучаць не хлусіць. Потым дакажы гэтаму дзіцяці, што кожны зь іх чалавек і кожнаму трэба жыць. А тая завуч школы, якой засталося два гады да пэнсіі, ні аб чым больш думаць ня можа. Ёй бы дапрацаваць свой стаж і ўсё. Таму жывёльны жах перамагае справядлівасьць. Таму яны адзяваюць маску. А потым, адзеўшы гэтую маску й трасучыся за сваю будучыню, ідуць выбіраць цяперашняе жыцьцё, спадзеючыся пры гэтым, што хлусьня іхняя ніколі не раскрыецца.

Так было й на маіх пяці ўчастках, дзе я, зьяўляючыся даверанай асобай Васіля Аўраменкі, назіраў за выбарамі. Гэта былі ўчасткі №105, 106, 107, 108 і 109 Магілёўскай Кастрычніцкай выбарчай акругі №73, дзе кіраўніком округовай камісіі зьяўляецца Халецкая Натальля.

Калі я прыйшоў у першы дзень, чальцы камісій пачалі мяне «прамацваць на свойскасьць». Рабілі нездаволеныя міны: як гэта ім не давяраюць. Яны імкнуцца, каб усё было «чэсна», а тут нейкія назіральнікі зьявіліся.

На другі й трэці дзень я таксама не праяўляў актыўнасьці, заскокваючы на ўчасткі на тры гадзіны перад абедам і дзьве гадзіны пасьля. Рабіў шаблённыя заўвагі наконт тых ці іншых «дробных» парушэньняў, атрымліваючы шаблённыя адказы накшталт «Дзядзенька, прасьціця, мы больша ня будзем». На трэці дзень, прыйшоўшы з раніцы, заўважыў, што дзьверы ўчастку былі адчыненыя яшчэ да яго адкрыцьця, а ў памяшканьні знаходзіўся міліцыянт.

На чацьвёрты дзень, у пятніцу, прыйшоў з мабільным тэлефонам і дыктафонам, што насьцярожыла чальцоў камісіі. Маленькая надзея на маю «тэхнічнасьць» усё ж была. А таму ў канцы дня старшыня камісіі 105-га ўчастку запрасіла мяне на «каву й ня толькі», і, калі я адмовіўся, а потым запытаў: «А што, дзьверы памяшканьня, дзе знаходзяцца скрыні, ня будуць запячатаныя?» — яна яшчэ больш насьцярожылася. Пачалі тлумачыць: «Ёсьць загад з УУС, узгоднены з аблвыканкамам, які дазваляе не запячатваць памяшканьня дзеля лёгкага доступу супрацоўнікаў міліцыі, якія павінны ахоўваць, а значыць, прысутнічаць у памяшканьні, дзе знаходзяцца запячатаныя скрыні».

Я адправіўся пісаць скаргі ў пракуратуру й акруговую выбарчую камісію: чальцы камісій не запячаталі дзьвярэй участку, бюлетэні для галасаваньня выдаюцца ня толькі па пашпартах, але й па полісах сацыяльнага страхаваньня й даведках са спэцкамэндатуры.

Расплата настала адразу. Раніцай пятага дня старшыня 106-й камісіі сказала, што ў яе маці пры сьмерці, а яна вымушаная сядзець тут на ўчастку. Потым накінулася на мяне, як быццам бы за тое, што я ня ведаю кодэксу, а кіруюся апазыцыйнымі інструкцыямі. Урэшце прыехала Халецкая, якая запыталася, якія праблемы ў мяне з чальцамі камісій. У гэты час паміж намі адбываўся наступны дыялёг:

— Вы сьцьвярджаеце, што ў памяшканьні, дзе знаходзяцца скрыні, ноччу знаходзіўся міліцыянт?

— Так.

— Ён выйшаў.

— Калі? Чаму я ня бачыў?

— Ён выйшаў! Чальцы камісіі пацьвердзяць, што гэта было пры вас. Нас шмат, а вы адзін.

Тут Халецкая заўважыла ў мяне дыктафон, і ейны голас зьмяніўся на гістэрыку. Са словамі: «Гэта што?!» — як быццам бы я выцягнуў бомбу ці пісталет — яна выхапіла яго ў мяне й

> «Ёсьць загад з УУС, які дазваляе не запячатваць памяшканьне для галасаваньня ў суботу дзеля лёгкага доступу супрацоўнікаў міліцыі».

панесла, каб аддаць міліцыянту, сказаўшы пры гэтым, што дыктафон я атрымаю ў яго пасьля. Ня ведаю, дзе ў Выбарчым кодэксе запісана, што забаронена ўжываць дыктафон. Там наадварот напісана, што назіральнік вядзе назіраньне ўсімі падручнымі сродкамі.

Вярнуўшыся, яна абвясьціла мне, што я перашкаджаю камісіі працаваць і пазбаўляюся на дадзеных участках акрэдытацыі. Пасьля Халецкая загадала міліцыянту вярнуць мне дыктафон у якім, як высьветлілася пасьля, была пашкоджана (перагрызена) стужка.

Добра, што я быў не шараговы назіральнік, а давераная асоба кандыдата. Пагналі мяне з аднаго ўчастка, а я пайшоў на другі, дзе ўсё было «законна» й без скандалаў.

Далей усё адбывалася па вядомым сцэнары, у выніку якога яўка склала 98%, зь якіх 80 «прагаласавалі за Лукашэнку». Сумленьне й жах, якія адчуваюць чальцы камісій, падмацоўваецца 150—200 тысячамі, а таксама залівае гарэлкай.

Калі падзяліць беларусаў па перакананьнях, дык атрымаецца прыкладна пяць роўных частак.

Першая — гэта тыя, якія падзяляюць меркаваньні й думкі ўлады, якая б яна ні была.

Другая — гэта тыя, якія ў апазыцыі. Якім здаецца, што трэба нешта мяняць, і свой пункт гледжаньня яны будуць адстойваць да канца.

Трэцяя — гэта тыя, якім не падабаецца ўлада, але праз боязь і інстынкт самазахаваньня яны гатовыя заўсёды прыстасоўвацца.

Чацьвёртая — гэта тыя, якія ў корані нязгодныя з уладай, але асабістыя праблемы ў іх стаяць на першым пляне і таму яны ня могуць эфэктыўна змагацца.

Пятая — гэта тыя, каму ўсё роўна.

Шкада гэтых людзей зь першай і трэцяй часткі, бо яны не разумеюць, што адказваць будуць яны. Ім здаецца, што калі яны прыстасаваліся да гэтай улады, дык прыстасуюцца й да іншай. Што так будзе заўжды.

Але ўсё скончаецца, і за свае злачынствы кожны будзе несьці адказ. Калі ня тут, не перад зямным судом, дык перад судом божым, што нашмат страшней, бо няма надзеі. Таму лепш адзін раз пацярпець за праўду й мець чыстае сумленьне, чым усё жыцьцё баяцца, а потым усё ж атрымаць належную адплату.

Сяргей Гіркін, Магілёў

ЖАРТ

Ляцяць у самалёце Пуцін, Кучма і Лукашэнка. Раптам загараецца рухавік, і самалёт пачынае падаць. Усе трое шукаюць ратавальныя сродкі, але аказваецца, што ёсьць толькі адзін парашут на трох.

Лукашэнка гаворыць:

— Давайце правядзём рэфэрэндум. Хто пераможа, той і скочыць з парашутам.

Кучма і Пуцін пагадзіліся. «Пашанцавала», натуральна, Лукашэнку, і той выскачыў з парашутам.

Самалёт працягвае падаць, а Кучма кажа Пуціну:

— Нешта, Валодзя, я не разумею: нас тут было трое, а Рыгоравіч выйграў у нас зь перавагаю ў 10 галасоў.

Даслаў Віталь Панамароў, Кіеў

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні.

З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

Ці будзе на Лагойшчыне Нацпарк

Паводле міжнародных нормаў, рэкрэацыйныя зоны нацпаркаў не павінны перавышаць 10% агульнай плошчы, а ў праекце яны займаюць амаль 26%. Прадугледжваецца таксама пракладка 20 км аўтадарог і 26 км пешаходных і роварных дарожак, што аўтаматычна павялічыць нагрузку на лес. Эколягі і лагойцы крытыкуюць праект нацпарку «Белая Русь».

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Гарналыжны курорт «Лагойск», пабудаваны летась, прастойвае без наведнікаў.

У беларускіх падручніках па геаграфіі 1985 г. выданьня расказвалася, што ў хуткім часе ў Лагойскім раёне будзе створаны першы ў рэспубліцы нацыянальны парк «Белая Русь». Прайшло 20 гадоў, у краіне створаны чатыры нацыянальныя паркі, а падручнікі не памяняліся, і чуткі пра парк па-ранейшаму бянтэжаць мясцовых жыхароў.

29 кастрычніка ў Лагойску прайшлі грамадзкія слуханьні, ініцыяваныя Міністэрствам прыроды, аб стварэньні нацыянальнага парку. Упершыню ў Беларусі праводзілася працэдура грамадзкіх слуханьняў адпаведна патрабаваньням міжнародных інструкцый — апытваліся і інфармаваліся мясцовыя жыхары, на жыцьці якіх у першую чаргу адаб'ецца стварэньне парку.

Агульная плошча нацыянальнага парку, паводле праекту, складзе больш за 25 тысяч га. Мяркуецца, што ў яго склад увойдуць землі Лагойскага лясгасу, калгасаў «Плешчаніцкі», «Кастрычніцкі», імя Машэрава, «8 сакавіка» і мэмарыяльнага музэю «Хатынь».

Паводле падлікаў праектантаў з Акадэміі навук, чысты прыбытак ад турызму складзе 90—95 тыс. у.а. штогод. Аднак пачатковы капітал, неабходны для стварэньня парку, складае 6,5 мільёна у.а.

У пляне парку — рэканструкцыя Хатыні і этнаграфічных вёсак, правядзеньне народных сьвятаў, тэматычныя маршруты. На тэрыторыі мяркуецца стварыць турысцкія летнікі, пляцоўкі для пікнікоў, пункты пракату інвэнтару. Меркаваная колькасьць наведвальнікаў — 30—40 тыс. чалавек за год.

Распрацоўшчыкі праекту (Інстытут заалёгіі НАН і Міністэрства прыроды) зыходзяць з таго, што ўтварэньне парку дасьць магчымасьць стварыць новыя працоўныя месцы. Цяпер у Лагойскім раёне кожны трэці працаздольны жыхар езьдзіць на заробкі ў Менск.

Аднак стварэньне парку азначае перадачу земляў іншаму карыстальніку — кіраўніцтву спраў прэзыдэнта. Супрацоўнікі лясгасу баяцца, што яны застануцца бяз працы. Паводле слоў дырэктара лясгасу, многія ўжо пытаюцца ў яго, ці не пісаць заяву на звальненьне. З 500 супрацоўнікаў лясгасу многія — зь лясніцкіх дынастый, дзе ў лесе працавалі бацькі і дзяды.

Лясгас на сёньняшні момант зьяўляецца бюджэтаўтваральнай гаспадаркай раёну і плаціць самыя вялікія падаткі. У жыхароў раёну выклікаюць таксама сумненьні пляны па разьвіцьці экалягічнага турызму. Паводле іх слоў, не карыстаецца папулярнасьцю горналыжны курорт «Лагойск», пабудаваны ў мінулым годзе. Ён прастойвае. Таму скептыцызм выклікаюць заявы распрацоўшчыкаў пра 95 тыс. у.а. чыстага прыбытку штогод.

Крытыкаваў праект таксама супрацоўнік Дзяржаўнай інспэкцыі па ахове жывёльнага і расьліннага сьвету пры прэзыдэнце Андрэй Родзічаў: паводле міжнародных нормаў, рэкрэацыйныя зоны нацпаркаў не павінны перавышаць 10% агульнай плошчы, а ў праекце яны займаюць амаль 26%. Прадугледжваецца таксама пракладка 20 км аўтадарог і 26 км пешаходных і роварных дарожак, што аўтаматычна павялічыць нагрузку на лес.

Прадстаўнік грамадзкай арганізацыі «Ахова птушак Беларусі» Аляксандар Вінчэўскі зазначыў, што, улічваючы ўсе складанасьці, больш мэтазгодна было б стварыць там ляндшафтны ці біялягічны запаведнік. Выраз «нацыянальны парк», як заўважыў Вінчэўскі, ужо выклікае нэгатыўную рэакцыю.

Лёс Лагойшчыны будзе вырашацца далей пасьля таго, як Міністэрства прыроды перадасьць падрыхтаваную дакумэнтацыю і пратакол грамадзкіх слуханьняў у Савет Міністраў. Рашэньне аб стварэньні нацыянальнага парку, згодна з заканадаўствам, прымаюць прэзыдэнт і ўрад РБ.

Вераніка Дзядок, Лагойск

Тузаніна вакол бел-чырвона-белых

У мястэчку Сьвіслач упершыню за 9 гадоў затрыманы ўдзельнікі традыцыйнага ўшанаваньня памяці братоў Каліноўскіх.

Штогод гарадзенскія й сьвіслацкія фронтаўцы ўшаноўваюць на Дзяды памяць братоў Кастуся й Віктара Каліноўскіх. Сёлета каля 30 чалавек зь бела-чырвона-белымі сьцягамі й сьвечкамі сабраліся ля магілы Віктара Каліноўскага. Узгадаўшы ягоную памяць хвілінай маўчаньня й усклаўшы кветкі, удзельнікі працэсіі рушылі да помніка Кастусю Каліноўскаму. Зьявіліся супрацоўнікі міліцыі, а таксама аўтамабіль з прыцемненымі шыбамі. Удзельнікаў ушанаваньня пачалі здымаць на відэа.

Калі грамада падышла да помніка паўстанцу Рамуальду Траўгуту, міліцыянты запатрабавалі спачатку згарнуць сьцягі, а потым наагул зьняць іх з дрэўкаў. Удзельнікі падпарадкаваліся, бо ўжо выканалі задуманы плян і зьбіраліся яшчэ наведаць Якушоўку — сядзібу Каліноўскіх.

Аднак, нягледзячы на міралюбівы настрой ушанавальнікаў, міліцыянты пачалі спрабаваць выхопліваць іх па аднаму па дарозе да аўтамабіляў. Удзельнікі адбілі сваіх, але міліцэйскія машыны заблякавалі ім выезд. Міліцыя запатрабавала, каб усе ўдзельнікі зьявіліся ў РУУС самі.

Сяргей Мальчык, Вадзім Саранчукоў і Віктар Сазонаў правялі ў РУУС некалькі гадзінаў.

Прысутны

У лес па дровы для БелДРЭС

Пасьля лютаўскага газавага канфлікту з Расеяй у краіне зноў пайшлі размовы аб неабходнасьці павелічэньня долі выкарыстаньня мясцовых відаў паліва. Так, у Арэхаўску (Аршаншчына), дзе разьмешчаны першынец беларускай энэргетыкі БелДРЭС, ужо пачалі распрацоўваць праект па ўстаноўцы новага катла, які будзе працаваць на торфе ды дровах і стане выдаваць за адну гадзіну па 20 тон гарачай пары. Побач плянуецца ўстанавіць невялікую турбіну магутнасьцю ад 1,5 да 2 мэгават, што дазволіць выпрацоўваць ток на працягу ўсяго году, а ня толькі ў аціпляльны сэзон, як цяпер. Вось толькі ці хопіць дроў у навакольных лясах і колькі будзе каштаваць іх нарыхтоўка?

Пільнавалі ня тое, што трэба

Тыдзень перад сёлетнімі выбарамі ды рэфэрэндумам яшчэ доўга будуць успамінаць супрацоўнікі Аршанскай раённай міліцыі. Колькасьць іх невялікая, таму на выбарчыя ўчасткі прыпадала па аднаму міліцыянту. Стаяць жа на ахове трэба было суткамі бязь зьмены. Трэба адзначыць, што на ахоўныя урны ніхто ня квапіўся, ня тое што на вясковыя крамы. Колькасьць тых, што былі абрабаваныя за гэты пэрыяд, значна ўзрасла.

Яўген Жарнасек, Ворша

Музыка ВКЛ у Полацку

Я ехаў на канцэрт «Старога Ольсы» з пэўнай трывогай: ці зьбяруцца людзі? З раніцы зарадзіла непрасьветная імжака, дый музыка «Ольсы» на аматара. Мая трывога разьвеялася, калі я ўбачыў сьціжму людзей, якія штурмавалі глядацкую залю полацкага ГПК.

Канцэрт пачаўся невялікімі «сьпічамі» наваполацкага музычнага прадусара Сяргея Анішчанкі і пастара царквы Царства Божага ў Наваполацку Аляксандра Герасімовіча. 31 кастрычніка пратэстанты адзначаюць Дзень рэфармацыі, канцэрт і быў прымеркаваны да гэтае падзеі. Акрамя «Старога Ольсы» ў ім узяў удзел менскі пратэстанцкі гурт «Псальмяры» (паводле стылю штосьці накшталт BIA).

Ладная частка выступу «Ольсы» складалася з твораў паводле «Полацкага сшытку». Гучалі і хіты — танцавальная музыка XVI ст. і ваярскія песьні, у тым ліку «Аршанская бітва». Музыкі так спраўна і імпэтна іграли на дудзе і лютні, што гледачы адбілі сабе далоні. На канцэрце прысутнічаў увесь нацбамонд Полаччыны — прадстаўнікі партый, рухаў, моладзевых арганізацый, рыцарскіх і фальклёрных клюбаў.

Зьдзівіла «ольсаўцаў», што полацкая публіка імкліва разабрала ўсе прывезеныя з сабой CD-выданьні. «Хто мог падумаць, што гэтага ня хопіць!»— апраўдваўся Сасноўскі перад незадаволенымі фанамі, якім не хапіла кружэлак.

Васіль Кроква, Полацак

Былы шпіталь не па кішэні бізнэсоўцам

Два гады таму ў горадзе закрылі вайсковы шпіталь з чатырох капітальных двух- і трохпавярховых будынкаў, узьведзеных у 30-я гады мінулага веку, калі прымежны горад абрастаў вайсковымі гарадкамі. Сёлета гарвыканкам вырашыў прадаць гэтыя забудовы з аўкцыёну. Стартавы кошт іх перавысіў 1 млрд 400 млн рублёў. Аднак заявак ад прэтэндэнтаў на такі «падарунак» не паступіла. І ня толькі праз дарагоўлю — адштурхнулі ўмовы продажу былога шпіталю. Пакупнік павінен быў унесьці гэтую суму разавым плацяжом і стварыць на базе набытага комплексу дзіцячы лекава-аздараўленчы прафілякторый. На такую прапанову сьмелых не знайшлося.

Слуцку наканаваны «Дажынкі-2005»

Дзяржсакратар Рады бясьпекі Генадзь Нявыглас у ходзе аднадзённай паездкі на Случчыну ў час наведваньня перапрацоўчых прадпрыемстваў заявіў, сярод іншага, што ўлады рэспублікі маюць намер чарговыя «Дажынкі» ў 2005 г. правесьці ў іхнім горадзе. А гэта, як заведзена ўжо, зьвязана будзе з выдзяленьнем немалых бюджэтных сродкаў на парадкаваньне і ўпрыгожваньне вуліц, на аднаўленьне закінутага гарадзкога стадыёну.

У райбольніцы — абновы мэдарсэналу

З пачатку году слуцкае тэрытарыяльнае мэдыцынскае аб'яднаньне за кошт бюджэтных сродкаў і дапамогі Міністэрства аховы здароўя выдаткавала на набыцьцё больш дасканалых і сучасных мэдпрэпаратаў каля 120 млн рублёў. Для радзільні набыты УГД-сканэр і два маніторы да яго, у аддзяленьні функцыянальнай дыягностыкі зьявіўся энцэфалёграф, якім можна абсьледаваць галаўны мозг чалавека, вызначыць зьмены ў ягоных сасудах. Хірургічнае аддзяленьне набыло электрахірургічны высокачастотны апарат, які выкарыстоўваецца як скальпэль. На чарзе — замена ўстарэлых рэнтгенаўскіх апаратаў.

Міхась Кутнявецкі, Слуцак

Круглае ў змроку

Вуліцы Круглага «патанаюць» у змроку. Нягледзячы на абяцаньне раённых улад уключыць асьвятленьне, вуліцы пакуль асьвятляюцца вокнамі дамоў, разьмешчаных непадалёку. На цёмных вуліцах зарэгістраваны ўжо выпадкі нападзеньня на жанчын і дарожна-транспартнае здарэньне, у якім пацярпела старшакласьніца.

Зінаіда Мялешчанка, Круглае

Дыплямаваны конь

Шэраг платных паслуг прапанаваў мясцовым жыхарам аддзел адукацыі Крычаўскага райвыканкаму. Асабліва незвычайнымі падаюцца «паслугі гужавога транспарту» па цане 1000 рублёў за гадзіну. Сярод іншых прапаноў — выраб фатаграфій, правядзеньне дыскатэк. Сама больш каштуе вывучэньне замежнай мовы: 305 рублёў за 3 хвіліны.

Андрэй Пархоменка, Крычаў

Да нас едзе Кавэрдэйл

«Deep Purple» абмінулі нашу краіну, хоць 31 кастрычніка гралі ў Кіеве. Але 10 лістапада Менск наведае другі рок-монстар — група «Whitesnake» на чале з Дэвідам Кавэрдэйлам.

«CLASSIC ROCK»

Праз «Whitesnake» прайшлі зоркі першай велічыні. У гурце гралі Джон Лорд, Ян Пэйс, Стыў Вай, Джымі Пэйдж з «Led Zeppelin».

Кавэрдэйл трапіў на рок-сцэну ў 1973 г. Пасьля сыходу Яна Гілана «Deep Purple» шукалі праз аб'явы новага вакаліста. Адзін з найлепшых рок-салістаў сучаснасьці ў той час меў 22 гады і гандляваў адзежай, аднак вырашыў паспрабаваць свае сілы і быў залічаны ў склад. Пасьля легендарнага дыску «Burn» «пэрплы» пакарылі Амэрыку — грандыёзныя канцэрты (на іх шоў у Каліфорніі ў 1974 г. сабралася 200000 чалавек), шматмільённыя кантракты. Аднак праз год сышоў Рычы Блэкмар, новы гітарыст Томі Болін памёр ад перадазіроўкі наркотыкаў, і «Deep Purple» вырашана было распусьціць.

Такім чынам паўстаў «Whitesnake», куды Кавэрдэйл перацягнуў рытм-сэкцыю «Deep Purple» — Лорда і Пэйса. Пры канцы 80-х песьні гурту «Is This Love» і «Here I Go Again» акупавалі сусьветныя чарты.

Кавэрдэйл, як і любая рок-зорка, асоба скандальная і супярэчлівая. У музычных колах яго называюць адным з галоўных лавэласаў у гісторыі року. Гістарычны факт: з 1984 па 1987 г. Кавэрдэйл жыў у пэнтхаўсе — на паддашку аднаго з галівудзкіх гатэляў. Разгул цягнуўся аж пакуль музыка не ажаніўся. Але з мадэлькай і кіназоркай Таняй Кітэн яны не зжыліся. Кавэрдэйл разьвёўся і ажаніўся зь іншай. З тых часоў, як ён сам кажа, ён пасталеў, таму назіраньне за тым, як расьце ягоны сын, прыносіць больш задавальненьня, чым музычныя туры. Аднак Кавэрдэйл не пакідае сцэны. 6 лістапада рок-легенда сьпявае ў Рызе, 7-га — у Вільні. 10 лістапада — у менскім Палацы спорту. Пачатак а 19-й. Квіткі — 55000—165000 руб.

Сяргей Будкін

«ТТ-34» стрэльнулі

Экстрэмальна-пазытыўны гурт «ТТ-34» працягвае гомельскія музычныя традыцыі, закладзеныя колішнімі мэталёвымі лідэрамі «Gods Tower».

Так, на альбоме можна пачуць голас Міхалка, трызьненьні Сашы і Сірожы, чытанкі гомельскага рэпера Сярогі, скрэтчы культавага ды-джэя Яўгена Лур'е і гукі «забароненых бубначоў» з «Drum Xtc».

Сярод галоўных гітоў альбому – «Джэк». Менавіта пад рыфы з гэтае песьні ў кінамэгаціце «Начная варта» адрываецца галава Лагуценкі-вампіра.

29 кастрычніка «ТТ-34» прэзэнтавала сваю праграму ў родным горадзе. 10 і 11 лістапада група грае ў Менску. 10-га яе пачуюць тыя, хто наведае канцэрт сусьветнай рок-легенды «Whitesnake». Гомельская каманда будзе граць у іх на разагрэве. 11 лістапада «ТТэшнікі» абяцаюць жорстка раскілбасіць сваёй музыкай кожнага на сольным канцэрце ў «Рэактары» ў 20.00. У канцэрце бярэ ўдзел таксама «Індыга». Цана квітка – 8000 (танцпол), 12000 (столік).

Помнік Пачопку ў Целяханах

6 лістапада, у суботу, аб 11-й гадзіне ў Целяханах на каталіцкіх могілках адбудзецца асьвячэньне помніка беларускаму грэка-каталіцкаму сьвятару а.Баляславу Пачопку (аўтар помніка з дрэва — мастак з Баранавіч Мікола Колас). Абрад і паніхіду ў 120-я ўгодкі з дня нараджэньня а.Б.Пачопкі зьдзейсьніць апостальскі візытатар для грэка-каталікоў Беларусі архімандрыт Сяргей (Гаек).

Баляслаў Пачопка быў рэдактарам першай беларускай каталіцкай газэты «Bielarus» (1913—1915), стваральнікам першай беларускай настаўніцкай сэмінарыі ў Сьвіслачы (1915—1918). Б.Пачопка — аўтар адной зь першых граматык беларускай мовы, напісанай на лацініцы (1915).

Кантакт у Івацэвічах: т. 2-25-11 (Вячаслаў Гарчакоў).

Тэатры, канцэрты

Опэра

6 (сб) — «Вечар старадаўняга рамансу».
9 (аўт) — «Набука».
11 (чц) — «Лючыя ды Лямэрмур».
13 (сб) — «Хаваншчына».
14 (ндз) — «Чароўная флейта».

Тэатар імя Янкі Купалы

5 (пт) — «Ажаніцца — не журыцца».
6 (сб) — «Паўлінка».
8 (пн) — «Памінальная малітва».
10 (ср), **11** (чц) — «Чорная панна Нясьвіжу».
12 (пт) — «Каханьне ў стылі барока».
13 (ср) — «Івона, прынцэса Бургундзкая».
14 (ндз) — «Я не пакіну цябе».

Малая сцэна

6 (сб) — «Баляда пра каханьне».
13 (сб) — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».
14 (ндз) — «Саламея».

Тэатар беларускай драматургіі

5 (пт) — «Містэр Розыгрыш».
6 (сб) — «Жанчыны Бэргмана».

Тэатар імя Горкага

5 (пт) — «Дэтэктар хлусьні».
6 (сб) — «Амфітрыён».

Манюшка і ягоны час

11 лістапада а 19-й варта быць у Камэрнай залі Белдзяржфілярмоніі (касьцёл сьв. Тройцы (сьв.Роха), дзе ансамбль салістаў «Кляськ-авангард» прадставіць праграму «С.Манюшка і ягоны час», прысьвечаную юбілею беларускага кляськa. У праграме музыка як самога юбіляра, так і іншых айчынных і «блізказамежных» аўтараў XIX ст. (М.Глінкі, А.Дворжака, К.Ельскага, М.Ельскага, А.Концкага, А.Курпіньскага, Ф.Міладоўскага), а таксама твор нашага сучасьніка Віктара Капыцькі.

Памідораў у акустыку

9 лістапада акустычным выступам парадуе Аляксандар Памідораў. Ён зайграе сольны канцэрт у клюбе «Графіці» ў 20.00. Квіткі трэба замаўляць загадзя праз тэл. 671-58-65.

Алег Міцяеў

12 лістапада ў канцэртнай залі «Менск» выступае Алег Міцяеў з праграмай «Зь нічаганерабленьня». Квіткі: 24000—30000 (балькон), 32000—50000 (партэр).

Выставы

Міжнародная гільдыя жывапісцаў

Да 17 лістапада ў Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Ф.Скарыны, 47) працуе выстава работ Міжнароднай гільдыі жывапісцаў. Уваход вольны.

З прыватнай калекцыі Ксяневіча

З 9 лістапада да 1 сьнежня ў гарадзкой мастацкай галерэі твораў Л.Шчамялёва (пр.Ракасоўскага, 49) працуе выстава твораў з прыватнай калекцыі Яўгена Ксяневіча. Уваход вольны.

Калекцыі Радзівілаў у Мастацкім музэі

З 5 лістапада да 5 студзеня Нацыянальны мастацкі музэй запрашае на выставу «Нясьвіскія калекцыі Радзівілаў». Квіткі — 2000.

Выстава аб першай сусьветнай

У Нацыянальным музэі гісторыі і культуры **да 21 лістапада** працуе выстава фатаздымкаў «Сутокі: праз 90 гадоў і лінію фронту». Выстава прысьвечана першай сусьветнай вайне. Квіткі — 2000.

«Дзе паветра бэжавее»

Да **3 сьнежня** ў галерэі ЭГУ (пр.Ф.Скарыны, 24) працуе выстава жывапісу Леаніда Мядзьведзкага «Дзе паветра бэжавее». Уваход вольны.

PTS'2004

З 9 да 12 лістапада ў Нацыянальным выставачным цэнтры (вул.Я.Купалы, 27) адбудзецца 6-я Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Пэрспэктыўныя тэхналёгіі і сыстэмы: інфарматыка, тэлекамунікацыі, бясьпека» (PTS'2004).

Клюбная афіша

Graffiti Club (693-74-16)

10 (ср), 20.00 — вечар джазу «Залатая труба».
11 (чц), 20.00 — вечар аўтарскай песьні. Сьпявае Кацярына Варкалава.
12 (пт), 20.00 — вечар ROCKавай музыкі. Гурт «Flame».

Рэактар (286-71-07)

12 (пт) — прэзэнтацыя новай рэгі-праграмы «Кон-Цікі». Квіткі — 17000 руб. да 01.11, 19000 руб. да 11.11 (танцпол), 23000 у дзень канцэрту; столікі: 17000 — партэр (1-ы шэраг), 24000 — партэр, 27000 — балькон.

Bronx (288-10-61, «Velcom»: 103 і 105)

4 (чц), 22.00 — dj-bar.
5 (пт), 22.00 — жывая музыка.
6 (сб), 23.00 — dj Chak.

Белая вежа (284-69-22, 239-16-00)

4 (чц). 22.00 — «White Tower Party»: dj Dee, dj Top, dj Gryzzly.
5 (пт), 22.00 — dj Міхель.
6 (сб), 22.00 — «Red Party»: dj Палены, dj Дуброўская.
7 (ндз), 22.00 — dj Alex.

Гудвін (226-13-06)

4 (чц), 21.00 — жывая музыка.
5 (пт), 21.00 — жывая музыка.
6 (сб), 21.00 — жывая музыка.
7 (ндз), 21.00 — жывая музыка.
8 (пн), 21.00 — жывая музыка.

Бліндаж (219-00-10, 671-58-65)

5 (пт), 23.00 — resident dj Egor.
6 (пт), 23.00 — «Blind Rave»: dj Shushukin.
7 (ндз), 23.00 — resident dj Egor.

X-Ray (223-93-55)

5 (пт), 22.00 — dj-bar.
6 (сб), 22.00 — dj-bar.

Менская кінаафіша з 5 да 7 лістапада

«Аўрора» (253-33-60)
«Нябесны капітан і Сьвет будучыні» (прэм'ера): **5** (пт) 14.00, 16.20, 18.40, 21.00; **6, 7** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.20, 18.40, 21.00.
«Пярэпалах у інтэрнаце»***: **5—7** (пт—ндз) 17.00, 19.00, 20.50.
«Чалавек-павук-2»: **5—7** (пт—ндз) 14.30.

«Берасьце» (272-87-91)
«Паляўнічыя на розум»***: **5** (пт) 16.10 (іл), 18.30 (іл), 21.00; **6, 7** (сб, ндз) 18.30, 21.00.

«Дружба» (240-90-13)
«Хронікі Рыдыка»: **5** (пт) 18.00 (іл), 20.00; **6** (сб) 18.00, 20.00; **7** (ндз) 18.00, 20.00 (іл).

«Кастрычнік» (232-93-25)
«Нябесны капітан і Сьвет будучыні» (прэм'ера): **5** (пт) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00 (пд); **6, 7** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00 (пд).

«Масква» (223-27-10)
«Нябесны капітан і Сьвет будучыні» (прэм'ера): **5** (пт) 17.00 (пд), 19.00 (пд), 21.00 (пд); **6, 7** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00 (пд), 19.00 (пд), 21.00 (пд).

«Мір» (284-37-71)
«Пярэпалах у інтэрнаце»***: **5—7** (пт—ндз) 17.30, 19.10, 21.00.
«Хронікі Рыдыка»: **5—7** (пт—ндз) 18.10, 20.30.
«Вакол сьвету за 80 дзён»: **5—7** (пт—ндз) 16.00.

«Перамога» (223-77-66)
«Адкрытае мора»: **6, 7** (сб, ндз) 17.00 (іл), 19.00
«Шлюха»**** (прэм'ера): **5—7** (пт—ндз) 21.00.
Творчая сустрэча з выпускнікамі Акадэміі мастацтваў майстэрні М.Пташука і В.Нікіфарава: **5** (пт) 18.00

«Піянер» (227-64-87)
«Дзевяць ярдаў-2»: **5—7** (пт—ндз) 17.00, 19.00, 21.00.

«Цэнтральны» (220-34-16)
«Хронікі Рыдыка»: **5—7** (пт—ндз) 17.00, 21.00.
«Эўратур»***: **5** (пт) 15.10, 19.10; **6, 7** (сб, ндз) 15.10 (іл), 19.10.
«Скарбы Амазонкі»: **5** (пт) 13.00.
«Пасьлязаўтра»: **6, 7** (сб, ндз) 13.00.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
(пд) — падоўжаны сэанс
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

Для дзяцей

Опэра

6 (сб) — «Чароўная музыка».

Купалаўскі тэатар

5 (пт) — «Ажаніцца — не журыцца».
6 (сб) — «Паўлінка».
14 (ндз) — «Афрыка».

Тэатар юнага гледача

5 (пт), **7** (ндз) — «Паліяна».
6 (сб) — «Дзень нараджэньня ката Леапольда».
7 (ндз) — «Гісторыя каханьня Паласатага Ката і сэньярыты Ластаўкі».
9 (аўт) — «Маленькія трагедыі».
10 (ср) — «Апошняя дуэль».
11 (чц), **12** (пт) — «Паганага нораву варты плён».
13 (сб) — «Шлях на Батлеем».
14 (ндз) — «Парсюк, які сьпяваў».

Тэатар беларускай драматургіі

5 (пт), **6** (сб) — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй».

Тэатар імя Горкага

6 (сб) — «Джэльсаміна ў Краіне Хлусаў».

Кіно

«Аўрора»
«Два браты»: **5—7** (пт—ндз) 11.30.
«Чароўны востраў»: **5—7** (пт—ндз) 12.30.
«Шрэк»: **5—7** (пт—ндз) 10.40.

«Берасьце»
«Мур-р-лі» (прэм'ера): **5—7** (пт—ндз) 12.00.
«Шрэк-2»: **5—7** (пт—ндз) 14.00.
«Дунечка»: **5—7** (пт—ндз) 16.10.

«Дружба»
«Прадвесьнікі буры»: **5, 7** (пт, ндз) 13.00.
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **5, 7** (пт, ндз) 11.00; **6** (сб) 13.00.
«Пітэр Пэн у Нідэрлянды»: **6** (сб) 11.00.

«Масква»
«Лебядзінае возера»: **7** (ндз) 13.00.

«Мір»
«Шрэк-2»: **5—7** (пт—ндз) 12.00, 14.00.
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **5—7** (пт—ндз) 13.00.
«Гары Потэр і вязень Азкабану»: **5—7** (пт—ндз) 15.00.

«Перамога»
«Прадвесьнікі буры»: **5—7** (пт—ндз) 13.00, 15.00

«Піянер»
«Чароўны востраў»: **5** (пт) 14.20; **6, 7** (сб, ндз) 10.20.
«Братка медзьведзянятка»: **5** (пт) 10.20; **6, 7** (сб, ндз) 12.00.
«Гары Потэр і вязень Азкабану»: **5** (пт) 12.00; **6, 7** (сб, ндз) 14.00.

Рэнэсанс сынт-попу

Папулярны ў сярэдзіне 80-х музычны кірунак адраджаецца

Мода мае ўласьцівасьць вяртацца. Немудрагелістыя, але запамінальныя мэлёдыі, пабудаваныя на сынтэзатарным гучаньні, 15—20 год таму скарылі ўвесь сьвет. Менавіта на той час прыпала папулярнасьць такіх груп, як «А-На», «Duran Duran» і «Camouflage». Апошнія ўпершыню за сваю амаль 25-гадовую гісторыю зайграюць у Менску. Лідэр гэтай групы Хейке Майль у інтэрвію засьведчыў гатоўнасьць прасьпяваць па-беларуску, калі толькі хто-небудзь возьмецца перакласьці ягоную лірыку.

Пачуць піянераў нэарамантызму можна будзе 12 лістапада ў клюбе «Экстрым» (вул.Сурганава, 47/1). У імпрэзе таксама возьмуць удзел беларускія каманды «Лёгіка мэтро», «Атлянтыка» і «Тэорыя». Пачатак у 21.00. Кожнаму, хто набудзе ліцэнзійны дыск «Camouflage», абяцаецца сустрэча з групай напярэдадні канцэрту.

Сяргей Будкін

КІНО Ў МЕНСКУ

Робаты ўжо прыляцелі

Прыгоды няўрымсьлівай журналісткі Полі Пэркінс (Гвінэт Пэлтроў) і авіятара Джо (Джуд Лоў), якія шукаюць злобнага доктара Татэнкопфа, здымаліся ў адным павільёне, на блакітным фоне, а горныя пэйзажы, нябесныя караблі і зграі паветраных робатаў былі зроблены на кампутары.

Сьвет будучыні ў гэтым коміксе — гэта рэтра 40-х з адпаведнымі прычоскамі, машынамі, дыялёгамі і сьцертым кінаколерам. А гераічныя трэш-шэдэўры эпохі халоднай вайны, зь іх падводнымі бойкамі і навуковымі лябараторыямі, набываюць у карціне XXI ст. новую плоць, падмацаваныя сынэфільскаю настальгіяй і ганаровымі цытатамі з «Мэтропалісу» і «Кінг Конга».

Жывыя акторы арганічна ўлучаны ў кампутарную карцінку, але некаторыя крытыкі зьедліва заўважылі, што іхнія ролі магла б разыграць і машына. Галоўная нягодніка ў фільме грае знаны Лоўрэнс Аліўе. Цымус у тым, што Аліўе даўно памёр, а пасьмяротнае выкананьне ролі даручылі кампутару, які і прымусіў актора блюзьнерыць і марыць пра зьнішчэньне чалавецтва.

WWW.MOVIEWEB.COM

«Нябесны капітан і Сьвет будучыні» («Sky Captain and the World of Tomorrow»)
ЗША—Вялікабрытанія—Італія, 2004, каляровы, 107 хв.
Жанр: Коміксрэтрафантастыка
Адзнака: 7 (з 10)

«Нябесны капітан і Сьвет будучыні» — гэта трыюмф ужо ня толькі тэхналёгій, але й стылю. Новы Вялікі стыль — гэта асучаснены фантазійны трэш, дзе ўсё магчыма, «адновакая» Анджэліна Джолі ў прыкідзе, скрадзеным у мадэльераў SS, і пасьмяротнае існаваньне ў якасьці кампутарных іміджаў.

Гледачы сумаваць ня будуць.

Андрэй Расінскі

Сяржук Сокалаў–Воюш: «У мяне

Ён бард. Для адных найперш аўтар хітовага тэксту да палянэзу Агінскага «Разьвітаньне з Радзімай». Для другіх — настальгічны голас бурлівых мітынгаў канца 80-х, а пасьля голас радыё «Свабода». Для трэціх — аўтар песьні «Мне краёў чужых ня трэба», які аддана дэклямаваў «не хачу чужога хлеба», а пасьля пры першай нагодзе эміграваў у ЗША. Гэтым суайчыньнікам ён адказвае той жа манэтай: «Цяперашні ўзровень беларускага грамадзтва невысокі. Нармальных людзей хапае, але ўсе яны вельмі пасіўныя».
Наша гутарка зь Сержукам Сокалавым-Воюшам адбылася ў сьвятая сьвятых беларускае амэрыканскае эміграцыі — Фундацыі Крэчэўскага ў Нью-Ёрку — і мела некалькі інфармацыйных зачэпак. Зусім нядаўна ў менскім выдавецтве «Беларускі кнігазбор» выйшла ў сьвет першая кніга ягонай прозы — «Крывавы памол», а 3 лістапада мела быць названа імя ляўрэата новай літаратурнай прэміі імя пісьменьніка-эмігранта Янкі Юхнаўца, адным з заснавальнікаў якой зьяўляецца С.Сокалаў-Воюш.

УЛАДЗІМЕР ШЛАПАК

Сяржук Сокалаў-Воюш падчас аднаго з апошніх прыездаў на Радзіму. Палац мастацтваў. Інтэлігенцыя абмяркоўвае варыянты дзяржаўнага гімну. Сярод варыянтаў — палянэз Агінскага з словамі С.Сокалава-Воюша.

Грошы за літаратуру

— У 2004 годзе нарадзілася новая літаратурная прэмія імя Янкі Юхнаўца. Хто спрычыніўся да яе зьяўленьня?

— Ідэя стварэньня прэміі належыць супрацоўніку Беларускага інстытуту навукі й мастацтва ў Нью-Ёрку Лявону Юрэвічу. Сябрамі прэміяльнага камітэту зьяўляюцца крытык зь Вільні Андранік Антанян, стваральнік «Беларускай палічкі» ў Інтэрнэце (knihi.com) Андрусь Жвір і рэдактар нью-ёрскае газэты «Беларус» Марат Клакоцкі. Стартавы фонд прэміі — 500 даляраў — мы пакуль стварылі сваімі сіламі, але спадзяёмся на падтрымку іншых эмігрантаў. Для Беларусі гэта адчувальная сума. Сёньня нам даслана на разгляд чатыры дзясяткі працаў рознага памеру й формы. І якраз у гэтым палягае праблема. Як параўнаць двухтомную прозу Макса Шчура з Прагі й невялічкі вершык, што быў напісаны, мабыць, хвілін за 15? Таму, магчыма, у будучым нам прыйдзецца ўводзіць нейкія крытэры, каб нікому пасьля не было крыўдна.

— Ці трапляліся нейкія незвычайныя працы?

— Акрамя галоўнага пераможцы, адзін чалавек заслугоўвае прыз. Хлопчык зь Берасьця даслаў нам свой верш, і, думаю, вельмі важна было б яго сёньня падтрымаць. Заўжды важна атрымаць дапамогу менавіта ад сваіх, як гэта найчасьцей бывае, напрыклад, у габрэяў ці баптыстаў… Беларусы першай эміграцыйнай хвалі ў ЗША дапамогу атрымлівалі ад расейцаў ці ад палякаў (у залежнасьці ад веравызнаньня). Таму сёньня возьміце любую адрасную кнігу, і вы знойдзеце мноства нашых прозьвішчаў. Праўда, іх носьбіты пра сваё беларускае паходжаньне й не здагадваюцца.

Дарэчы, у зьвязку з гэтым прыгадваецца гісторыя, якая адбылася некалькі гадоў таму. Адзін амэрыканец вырашыў дазнацца пра свае карані. Усё, што ён памятаў, — аповеды бабулі, якая жыла быццам бы і ня ў Польшчы, і не ў Расеі. Узяў ён тады мапу, паглядзеў, што паміж імі — Беларусь. Чуў ад бабулі таксама, што іхны сваяк быў нейкім вядомым у Беларусі чалавекам. А вось прозьвішча ягонае ведаў толькі прыблізна. Праз Інтэрнэт выйшаў на Беларускі інстытут навукі й мастацтва. Патэлефанаваў Кіпелю, а той і кажа: «Вядома, ведаю!» — і называе прозьвішча. Так чалавек, які амаль нічога й ня ведаў пра свой род, знайшоў сваякоў у Беларусі.

Пра спадчыну

— Помніцца, мінулым годам на форуме «Беларускай палічкі» вы й Лявон Юрэвіч вялі ажыўленыя дыялёг з апанэнтамі зь Беларусі, якія вінавацілі эмігрантаў у бязьдзейнасьці ў справе захаваньня архіваў. У прыватнасьці, гаворка ішла пра спадчыну Натальлі Арсеньневай…

— Лёгка сказаць: забярыце архіў. А як гэта зрабіць? Сын Арсеньневай размаўляе на цудоўнай беларускай мове, але бацьку свайго, генэрала Францішка Кушаля, ён лічыў, мякка кажучы, дзіваком праз яго засяроджанасьць на беларускай ідэі. Яе ўнук размаўляе на ангельскай і пра Арсеньневу амаль нічога ня ведаў. Калі мы з жонкай прыехалі да паэткі, хлопец усё ніяк ня мог зразумець, чым яго бабуля заслужыла такую ўвагу. Калі ж мы расказалі, што ейны «Магутны Божа» сьпяваюць ва ўсіх беларускіх храмах, яго зьдзіўленьню не было межаў.

Цяпер, падобна на тое, праблему гэтую ўдалося вырашыць. Але зусім ня дзякуючы грамадзкаму рэзанансу, а проста праз імкненьне таго боку пазбавіцца ад сьмецьця.

Вядома, добра, калі з архівамі бывае так, як пасьля сьмерці слыннага чэскага перакладчыка Вацлава Жыдліцкага. Яго родныя патэлефанавалі нам і прапанавалі забраць усё беларускае.

— Мы ў Беларусі ўвесь час чуем аб расьцярушанасьці архіваў ці не па ўсёй тэрыторыі расьсяленьня беларусаў у Штатах. А як жа ж вось гэтая Фундацыя Крэчэўскага — ці ня ёсьць яна прыдатным месцам для бібліятэкі-архіву?

— Пакуль тут насамрэч захоўваецца асноўнае, але прасторы катастрафічна не хапае. Калі, да прыкладу, Янка Запруднік пажадае перадаць нам сваю бібліятэку, яна зойме ўсё нашае памяшканьне.

Раней будынак даглядаў старшыня Фундацыі Францішак Бартуль. Цяперака гэтым займаюся я. У найбліжэйшы час належыць зрабіць рамонт, галоўная мэта якога — ня толькі асьвяжыць будыніну, але й добраўпарадкаваць архіў у сутарэньні.

Эмігранцкая адысэя

— За апошняе дзесяцігодьдзе столькі ўсяго адбылося… Чаму вы ўрэшце аселі ў ЗША?

— Напачатку мой ад'езд ня быў выгнаньнем. Беларусь я пакідаў яшчэ да таго, як Лукашэнка стаў прэзыдэнтам, і калі ўсё ішло быццам бы нармальна. Адразу працаваў карэспандэнтам радыё «Свабода» ў Нью-Ёрку. Па закрыцьці аддзелу разам з жонкай Ганнай (дачка беларускіх эмігрантаў Веры й Францішка Бартуляў — **К.Л.**) і сынамі Сьветавітам і Славамірам пераехалі ў Прагу. Мінулым годам праз канфлікт з кіраўніком беларускае службы вымушаны быў пакінуць працу на радыё. Цяпер вось зноўку зь сям'ёй жывём у Амэрыцы.

— Не магу ўстрымацца ад банальнага пытаньня: дамоў не зьбіраецеся?

— 10 гадоў таму мы з жонкай былі гатовы атабарыцца ў Беларусі. Прычым Аня, па прафэсіі зубны тэхнік, была генэратарам гэтае ідэі. Аднак усё зьмянілася… Пакуль на радзіме пануе лукашэнкаўскі рэжым, сэнсу везьці туды сям'ю я ня бачу. Але адно вырашыў дакладна. На сконе гадоў абавязкова вярнуся ў Беларусь. Калі ўдасца ў Штатах зарабіць трошкі грошай, куплю сабе хатку дзе-небудзь у ідыліччным месьцейку й буду пісаць мэмуары. Апроч таго, у мяне па-ранейшаму беларускі пашпарт, хаця я ўжо маю поўнае права на атрыманьне амэрыканскага. Дый сваёй кватэры ў Менску я таксама не прадаваў.

— Спадар Пазьняк мае асьцярогу за сваё жыцьцё на радзіме. А вы?

— Не, я зусім не баюся рэпрэсій з боку ўлады. Па-сур'ёзнаму мяне ніколі не чапалі. Канечне, у вірлівыя 80-я ў міліцыю трапляў не аднойчы, але ненадоўга. Бо заўжды размаўляў зь людзьмі. Незалежна ад таго, хто перада мной — свой чалавек ці супрацоўнік.

Аднаго разу яшчэ на пачатку 80-х на адной зь менскіх кватэр мы ладзілі нелегальны моладзевы сход. Калі ўсе сабраліся, у дзьверы пагрукалі: «Адмыкайце, міліцыя!» Як толькі патрапілі ў кватэру, дык адразу пачалі нас здымаць. Ну й мы выцягнулі камэры й давай фатаграфаваць іх. Калі нас выводзілі з памяшканьня, мы ўзьнялі такі грукат, што людзі павыходзілі на лесьвічныя пляцоўкі. То бок пераўтварылі затрыманьне ў гумарыстычнае шоў. Яны ж і прад'явіць нам нічога не маглі. Скончылася ўсё тым, што мы тых хлопцаў проста разгаварылі і яны прызналіся, што атрымалі загад з КДБ: «Затрымаць!» Каго, што, яны ня ведалі. У аддзяленьні мы не заседзеліся, вярнуліся й усё роўна правялі сход.

— Але ці з усімі можна дамовіцца?

— Ведама, калі нехта стаіць на акцыі і ва ўсё горла раве на амонаўцаў: «Падонкі, сволачы!» — ну што ён можа атрымаць у адказ? Тутака не ўсялякі інтэлігентны чалавек устрымаецца.

Яшчэ ў часе маёй працы ў Празе мы з жонкай і дзецьмі часта наведваліся ў Беларусь. Калі ехалі першы раз, найбольш баяліся таго, каб нашы хлопцы не сказалі: «Ваш прэзыдэнт — дурань». Таксама вырашалі, ці пакінуць выяву «Пагоні» на аўто. Урэшце герб пакінулі, і я неаднаразова пераконваўся ў тым, што з усімі можна знайсьці супольную мову.

Раз спыняюць мяне пад Берасьцем з пратэрмінаванай страхоўкай. Бачу: два тыповыя вясковыя хлопцы. Распавёў, хто я, чым займаюся. А нумар у мяне на машыне быў «BNR 0325», расказаў і пра БНР. Усё зь цікавасьцю слухалі, а напрыканцы, перад тым, як адпусьціць, яшчэ й запыталіся, ці ведаю я Пазьняка.

Другім разам, напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў, везьлі ў менскі дзіцячы дом свае цацкі. Нашы хлопчыкі напісалі беларускім дзецям цёплыя цыдулкі: «Гэтыя цацкі становяцца жывымі, калі размаўляеш зь імі па-беларуску, але, калі хто ведае ангельскую мову, яны яе таксама разумеюць». Спыняюць нас на берасьцейскай мяжы: «Выгружай!» — «Што, усе цацкі?» — а выцягваць усё, зразумела, ахвоты няма. Адчынілі яны багажнік, пачыталі цыдулкі, пасьмяяліся і на

па-ранейшаму беларускі пашпарт»

разьвітаньне спыталіся: «Падкажы, за каго галасаваць?»

— Ну няўжо ані разу не хацелася кагосьці кудысьці пасласць ці зьезьдзіць па твары?

— Заўсёды можна зламаць становішча, адказаць на хамства хамствам. Але нічога акрамя агрэсіі не сустрэнеш. Чым чалавек больш злосны, тым спакайней зь ім трэба размаўляць. Аднойчы раніцай на беларуска-польскай мяжы таўшчэзны мытны начальнік аб нечым у мяне пытаецца. Адказваю яму, ведама, па-беларуску, а ён як зараве: «Почему на белорусском отвечаешь?!» Зусім спакойна: «Родная мова». — «Ну, дзякую за родную мову», — і цісьне мне руку.

Асабліва важна ў кожнай пэўнай сытуацыі знайсьці патрэбныя словы. Вяртаўся неяк зь Беларусі ў Чэхію й за перавышэньне хуткасьці быў спынены даішнікам. Ведаю, што спрачацца зь імі ня мае сэнсу, таму адразу пытаю: колькі? Паглядзеў ён на мае дакумэнты: «А туды чаго едзеш?» — «На радыё «Свабода» працую». — «Ну і што ты там перадаеш?» — «Расказваю пра тое, як вам грошай ня плацяць, як кватэру па 10 гадоў ня можаце атрымаць». — «А, ну добра, едзь тады».

Міліцыянты, даішнікі, мытнікі — таксама людзі, і, натуральна, іх найперш хвалюе тое, што тычыцца саміх.

Філфакаўская эпапея

— Добра, у вас ёсьць талент знаходзіць зь людзьмі супольную мову. Але наўрад ці ў савецкія часы гэтая здольнасьць выратоўвала нацыянальна сьвядомага хлопца, справа на якога была заведзена ў КДБ…

— У БДУ я паступаў пяць разоў! Чаму? Бо аніводнага дня ня быў у камсамоле. Тады існавала няпісаное правіла: выключэньне з камсамолу цягнула за сабой аўтаматычнае выключэньне з ВНУ. Што ўжо казаць пра тых, хто ў камсамоле ня быў зусім. Працаваў некалькі гадоў сьлесарам, адслужыў у войску. У пяты раз пайшоў спачатку на падрыхтоўчае аддзяленьне, якое пры нармальнай здачы іспытаў (а здаваў я амаль заўжды на дзьве «пяцёркі» вусна й дзьве «чацьверкі» пісьмова) паступленьне гарантавала. Да таго ж вельмі дапамагла станоўчая характарыстыка вайсковага афіцэра Павалоцкага, якога я й сёньня ўзгадваю з удзячнасьцю.

— І ад вас адчапіліся?

— Ужо на першым курсе сабралі сход, на якім разглядалі пытаньне майго ўступленьня ў камсамол. Пераконвалі, пакуль наш староста, разумны хлопец, ня ўзьняўся ды не сказаў: «Прапаную пытаньне закрыць. Ён ня ўступіць». Больш мяне не чапалі. Калі ж на трэцім курсе я перавёўся на завочнае аддзяленьне, усю маю групу па чарзе выклікалі ў КДБ, дазнаваліся, ці распаўсюджваў я забароненую літаратуру, ці выказваў антыдзяржаўныя ідэі…

Але ніводзін з аднагрупнікаў нічога благога пра мяне не сказаў. Нават тыя, з кім у мяне былі халодныя адносіны. І я ведаю чаму. Бо за ўвесь час сумеснага навучаньня я не зрабіў анікому нічога дрэннага і амаль з усімі стараўся быць у добрых адносінах.

Пра паплечнікаў і ідэю

— Сяржук, больш чым 10 гадоў вы жывяце на эміграцыі. Наколькі за гэты час зьмянілася кола вашых сяброў, паплечнікаў?

— Маімі найлепшымі сябрамі былі й ёсьць Вінцук Вячорка й Сяргей Дубавец. Паміж намі ўсё так, як было раней, з той толькі розьніцай, што яны жывуць і працуюць на беларускую ідэю там, а я — тут.

Наша жыцьцёвая пазыцыя заўжды абапіралася на своеасаблівы пяцікутнік: дзяржава — мова — культура — палітыка — эканоміка. Кожны з гэтых складнікаў ёсьць незаменным, але будавацца любое нармальнае грамадзтва мусіць вакол слова «нацыянальнае». Для тых, хто ўспрымае гэты панятак як нешта абстрактнае, замяню яго зразумелым кожнаму словам «сваё».

— Для вас, Дубаўца, Вячоркі й яшчэ некалькіх тысячаў гэта «сваё». А што рабіць з астатнім «тутэйшым» людам? Кожнаму ж мэнтальна цьвярозаму чалавеку зразумела, што Пазьнякоў вобраз вольналюбівага й нацыянальна сьвядомага беларускага народу, якому хтосьці чагосьці ўвесь час не дае, ня мае нічога супольнага з рэчаіснасьцю…

— Пасьля заканчэньня філфаку ў 1985-м я тры гады настаўнічаў у родным Наваполацку. За тым жа часам у горадзе пачалі ладзіцца першыя рок-канцэрты. Зразумела, амаль усе тэксты мясцовых гуртоў былі расейскамоўнымі. З крытыкай у гэткіх выпадках трэба быць асьцярожнымі, каб ня выклікаць у людзей супраціву. Таму лепей пераконваць аргумэнтамі, чым мы з маімі паплечнікамі па літаратурным аб'яднаньні «Крыніца» (Арловым, Баршчэўскім, Лапаткам, Гальпяровічам…) і займаліся. Запрашалі хлопцаў на нашы творчыя вечарыны, разам абмяркоўвалі іх тэксты, давалі парады. Хай не адразу, хай праз некалькі гадоў, але наваполацкія рокеры засьпявалі па-беларуску. Некаторыя з тых пачаткоўцаў і дагэтуль граюць у беларускіх гуртах. А, да прыкладу, Сяргей Анішчанка добра вядомы як арганізатар рок-фэстаў.

— Але ж часам сустракаюцца й складаныя выпадкі.

— Быў у тым моладзевым наваполацкім асяродку адзін хлопец, які ўсё ніяк ня верыў у беларускасьць. Аднойчы вечарам мы зь Вячоркам зайшлі да яго. Вінцук, майстар пераконваньня, як заўсёды, распачаў размову пра нацыянальнае, а той адчыніў пустую лядоўню й спытаў: «У вашай краіне мая лядоўня будзе поўнай?» — «Так!» З таго часу ягоны гурт засьпяваў на роднай мове.

Вядома, цяпер часы іншыя — за табой ніхто ня пойдзе, калі абвесьціш, што са стварэньнем нацыянальнай дзяржавы прыйдзе нармальнае жыцьцё. Таму трэба шмат езьдзіць па краіне, гутарыць, тлумачыць, пераконваць.

Творчасьць

— Яшчэ летась у Інтэрнэце зьявіліся фрагмэнты «Крывавага памолу». Сёлета вас можна павіншаваць з выданьнем першай часткі твору. Адразу кідаецца ў вочы надзвычай складаная мова. Дзеля чаго?

— Гаворачы агулам, «Крывавы памол» — першы беларускі трылер. Вінцук Вячорка знайшоў у нашай гісторыі свайго Дракулу, я вырашыў пакласьці гэтую страдаўнюю легенду на паперу. Але трошкі адступіўся ад прынятых стандартаў.

Цяперашні ўзровень беларускага грамадзтва невысокі. Таму ў нас пранейшаму няма элітарнае мовы, як няма й слэнгу. То бок таго, чым па азначэньні мусіць валодаць любая разьвітая й паўнавартасная мова. Свой «Памол» я імкнуўся пісаць менавіта гэткай элітарнай мовай, няпростай для ўспрыманьня й разуменьня, але патрэбнай нашай літаратуры.

> Калі нехта на акцыі ва ўсё горла раве на амонаўцаў: «Падонкі, сволачы!» — ну што ён атрымае ў адказ? Тут і інтэлігентны чалавек не стрымаецца.

— Сокалаў-Воюш вядомы яшчэ й тым, што ўсяляк пазьбягае калькаваньня расейскіх словаў у беларускую мову. Для кожнага чужога слова ў нас мусіць быць свой самабытны адпаведнік?

— Менавіта так. Таму падчас напісаньня кнігі я ўжываў усе наяўныя ў мяне слоўнікі, часам знарок выкарыстоўваючы словы рэдкія, дыялекты, замежныя славаформы — усё гэта неймаверна ўзбагачае мову.

Так, як, напрыклад, слова «мінак», якое, падазраю, ва ўжытак запусьціў менавіта я. Але трошкі ў іншай форме — «мінач», якую я ўбачыў у славацкім слоўніку. Праўда, часам бывае й так, што адшукаць адпаведнік запазычанаму слову асабліва складана, як было са словам «цыфэрблят».

Яшчэ ў часы нашага студэнцтва Вячорка правёў цэлае дасьледаваньне — перагледзеў процьму разнамоўных слоўнікаў, выпісваў, супастаўляў, але так нічога й ня выдумаў. Я тады якраз працаваў у Наваполацку й на ўроку паабяцаў вучням: хто перакладзе «цыфэрблят» на беларускую мову — атрымае «пяцёрку». Безвынікова. Паабяцаў «пяцёрку» за чвэрць — вынік нуль. Нарэшце — выдатную адзнаку за год, але ніхто так нічога цікавага й ня вынайшаў. І вось аднаго разу прыехаў да мяне ў госьці мастак Сяргей Цімохаў. Сядзім мы зь яго жонкай Рытай, размаўляем за гарбатай, і вырашыў я ў яе запытацца. Пяць сэкунд думала й адказала: «Падстрэлак». І хай пакуль яно цалкам не ўвайшло ва ўжытак, але гэта, думаю, справа часу.

— З «Памолам» у вас, відаць, вялікія пляны?

— Цяпер працую над другой часткай твору, які пакрысе ператвараецца ў раман. Выданьне першай — не зусім звычайнае. Яго карэктуру Вячорка рабіў, седзячы за кратамі на Акрэсьціна.

Працуючы са слоўнікамі, я звычайна раблю шмат занатовак, якія вырашыў афармляць у адмысловыя кнігі. У другой частцы мае героі трапляюць у Крымскае ханства. Дык на сёньня я ўжо маю больш за 200 старонак тэрмінаў Асманскае імпэрыі (анічога падобнага расейцы ня маюць), слоўнік паняткаў Крымскага ханства, а таксама турэцкіх імёнаў і габрэйскіх прозьвішчаў. Усё гэта па заканчэньні працы варта было б выдаць асобнымі кнігамі. Я цудоўна разумею, што, мажліва, пройдзе 100 гадоў і ніводны беларус да іх не дакранецца. Але я хачу падзяліцца з чытачом тым, аб чым даведаўся сам. І калі хтось пажадае атрымаць гэтую інфармацыю, яму ўжо ня прыйдзецца перагортваць тую велізарную працу, якую зрабіў я.

Калі працаваў над тэкстам, мне выпала зьвярнуцца да паэмы Байрана «Гяур». Той расейскі пераклад, што існуе, мне не спадабаўся, бо ён на 50 радкоў большы за арыгінал. Тады вырашыў перакласьці кляськa на беларускую мову, але гэта найскладанейшая задача. Вельмі цяжка знайсьці беларускія адпаведнікі фантастычна вобразным, але вельмі ляканічным ангельскім словам…

— Раз ужо закранулі творчую тэму, дык раскажыце пра ваш удзел у стварэньні эпахальнай кружэлкі «Я нарадзіўся тут».

— Ідэя напісаньня тэксту да славутага палянэзу Агінскага нарадзілася ў мяне вельмі даўно. За яе ажыцьцяўленьне ўзяўся яшчэ ў Наваполацку. Напісаў некалькі радкоў, патэлефанаваў Вінцуку. Ён уключыў музыку, праслухаў і кажа: «Не, ня пойдзе. Верш на мэлёдыю не кладзецца». Расчараваны, я пакінуў гэтую задуму. Праблема ж палягала ў тым, што ў нас былі дзьве розныя аранжыроўкі палянэзу. А завяршаў тэкст я ўжо пры канцы 90-х у Празе. На гэты раз мы ўжо абодва мелі адзін і той жа гуказапіс.

«Пасіўныя, але нашы»

— Пабыўшы ў Амэрыцы, я пераканаўся ў тым, што эміграцыйкія настроі адносна будучыні Беларусі куды больш аптымістычныя, чымся на радзіме. Якога гледзішча прытрымліваецеся вы?

— У Беларусі нармальных людзей хапае. Іншая справа, што яны ўсе вельмі пасіўныя. Пасіўныя, але нашы. Вось вам паказальны прыклад: неяк у Браславе, убачыўшы маю бела-чырвона-белую стужку, спыняе мяне ля крамы чалавек: «Гэта наш сьцяг!» Разгаварыліся зь ім, і выявілася, што на пачатку 90-х ён быў актыўным сябрам мясцовай суполкі БНФ. Цяперака ў апазыцыйных акцыях удзелу не бярэ нагул: «Ведаеш, мне дзетак сваіх трэба чымсьці карміць. А праз палітыку можна працу страціць, таму я дома. Але калі трэба будзе выйсьці на вуліцу ў апошні раз, я выйду. І знаёмыя мае выйдуць».

Людзей трэба найперш любіць і паважаць, кожнага трэба разумець. У нас жа найчасьцей адбываецца найгоршае: чалавек на хвілінку спыніўся, задумаўся, а яго ўжо абвясьцілі здраднікам.

Надзея на сьвятло ёсьць, бо дзе б я ні быў у Беларусі, з кім бы ні гутарыў, кожны сустрэчны імкнецца хоць слова, хоць два сказаць па-беларуску — хто колькі можа. Вядома, яны пасьля зноўку пяройдуць на расейскую, але стварыце ўмовы — і беларусы пачнуць размаўляць па-свойму.

Гутарыў Кастусь Лашкевіч, Нью-Ёрк—Менск

Разьня бэнзапілой у Балотных Ялінах

Гэты раман як матрунка: апавядальнікі хаваюцца адзін за адным, перадаючы слова ад унука дзеду, ад дзеда прадзеду. Галасы іх, дзякуючы, напэўна, сваяцтву, надзіва падобныя. Ажно, раскрыўшы кніжку на сярэдзіне, цяжка здагадацца, хто гаворыць. Аднак гэтак гартаць небясьпечна: ніколі ня ведаеш, дзе апынешся. Разамлеўшы на знаёмых узорах прыгожага пісьменства, раптам патрапляеш у амэрыканскі жудасьцік а-ля разьня бэнзапілой у Тэхасе.

Раман «Крывавы памол» — гэта таксама энцыкляпэдыя займальнага вупразнаўства. Зь яго даведваешся, што вупыры не пераносяць перцу і сонечнага сьвятла, што іх Мэкка — Трансыльванія, што забіць іх можна толькі калом і г.д. Ня горш ад Таранцінавага «Ад зьмярканьня да сьвітанку»: «Габрусь, які быў цяпер з ручніцай, бабэхнуў у камін. Кавалкі дзіцячых целаў пырснулі па пакоі, пакрываючы жоўта-зялёнай вадкасьцю сьцены, рэчы і нашую апратку». Кінэматаграфічна. Пасьля такога раман хочацца тыцнуць у вочы ласьліўцам, якія называюць беларускую літаратуру штучнай ды не адпаведнай выклікам часу і запатрабаваньням масавага чытача.

Але нават гэтыя модныя вупырскія штукі растуць з роднага карэньня. Кніжка (прынамсі, нейкая яе частка) угрунтаваная на клясычных узорах — калі клясыкай хорару лічыць Баршчэўскага, а клясыкай гатычнага раману — Караткевіча. Часам нават здаецца, што замест Дзяржынава апавядальнік зараз прыедзе ў Балотныя Яліны. Або, заблукаўшы ў цемры, скіруецца на агеньчык у акне шляхціца Завальні. Эпізод з нараджэньнем Фэлікса Дзяржынскага, дзе смак клясыкі адчуваецца наймацней, самы дынамічны, выпісаны і месцамі рэальна страшны. Іншае ж выклікае безьліч пытаньняў, зь якімі аўтар нечакана пакідае чытачоў у фінале. Даваць адказы, тлумачыць некаторыя ўчынкі герояў, дамалёўваць закінутыя сюжэтныя лініі, пазбываюцца стылёвае мляўкі і абыякавасьці да жыцьця ён зьбіраецца ў частцы другой.

Яўген Квач



Сяржук Сокалаў-Воюш. Крывавы памол. — Менск: «Беларускі кнігазбор», 2004.

Найтаньнейшая падпіска: сьпіс шапікаў

Найтаньнейшая падпіска на «НН» — на шапікі «Менгарсаюздруку». Каштуе такая падпіска на месяц усяго 1500 рублёў. Забіраць сваю газэту можна ў любой зручнай для вас гандлёвай кропцы «Белсаюздруку» ўжо ў чацьвер па абедзе. Друкуем адрасы пунктаў, дзе можна аформіць падпіску «Да запатрабаваньня».

Участак падпіскі «Белсаюздруку»:
вул.Валадарскага, 16, пак.200 227-88-41
Пункты прыёму падпіскі:
вул.Жукоўскага, 5, корп.1 224-32-03
вул.Раманаўская Слабада, 9 200-83-04
вул.Кашавога, 8 230-29-20

Крамы:

№1	вул.Жукоўскага, 5	224-03-76
№2	пр.Скарыны, 44	284-83-59
№3	пр.Скарыны, 76	232-46-23
№4	вул.Леніна, 15	227-11-92
№5	вул.Енісейская, 6	243-16-30
№6	вул.Філімонава, 1	235-63-11
№7	вул.Коласа, 69	288-30-20
№8	вул.Сурганава, 40	232-45-10
№9	пр.Ракасоўскага, 140	247-30-15
№10	бульвар Шаўчэнкі, 7	233-74-88
№11	пр.Пушкіна, 77	255-80-71
№12	вул.Кіжаватава, 80	278-77-61
№13	вул.Каліноўскага, 82/2	264-06-42
№14	вул.Валадарскага, 22	227-75-55
№15	вул.Танка, 16	203-82-39
№16	вул.Харужай, 24	234-27-25
№17	вул.Някрасава, 35	231-03-28
№18	ст.м. «Плошча Перамогі»	284-31-06
№19	пр.Машэрава, 5/1	223-81-66
№20	вул.Ясеніна, 16	271-87-21
№21	ст.м. «Пушкінская»	255-57-20
№22	вул.Ілімская, 10, корп.2	243-16-83
№23	вул.Славінскага, 39	264-36-33
№24	вул.Жылуновіча, 31	295-05-74
№25	вул.Маркса, 21	227-08-52
№ 26	пр.Скарыны, 113	264-22-91

Шапікі:
№18 БДТУ, вул.Сьвярдлова, 13/4
№18 Пэдуніверсытэт, вул.Савецкая, 18
№78 Гатэль «Юбілейны», пр.Машэрава, 19
№95 Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, вул.Мясьнікова, 39
№136 ст.м. «Плошча Якуба Коласа», выхад да Акадэміі фізвыхаваньня
№187 Гатэль «Беларусь», вул.Старажоўская, 15
№189 Аўтавакзал «Маскоўскі»
№198 БДЭУ, пр.Партызанскі, 26
№209 Прахадная МАЗу, вул.Сацыялістычная, 2
№228 Унівэрсытэт культуры, вул.Рабкораўская, 17
№232 Менскі з-д халадзільнікаў, пр.Машэрава
№245 Бальніца хуткай дапамогі, вул.Кіжаватава, 56
№259 Менскі гандлёвы каледж, вул.Усходняя, 183
№260 пр.Скарыны, 169
№262 Гатэль «Плянэта», пр.Машэрава, 31
№298 пр.Машэрава, 75/1
№302 9-я бальніца, вул.Сямашкі, 8
№313 Слабадзкі праезд, 24

● КРЫЖАВАНКА ●

Па гарызанталі:
1. Контур. 2. Пераважна жаночае адзеньне. 5. Горад маленькіх сабачак. 7. Не заўжды праўдалюб. 8. Ёмістасьць для вадкасьці. 9. Перапынак для «Твіксу». 11. Жывёльны сьвет. 13. Зімовае жыта. 14. Двайнік Сталонэ. 15. Нацыянальнасьць Таркана.

Па вэртыкалі:
1. Магчымасьць пагойдацца ўволю. 2. Элітная цырульня. 3. Фільм з удзелам Кэвіна Костнэра. 4. Вэртыкальнае выкананьне гарызантальных жаданьняў. 5. Чырвоная казюлька з кропінкамі. 6. Руская «ендова». 9. Адмысловец па рагаліках. 10. Дрыготкае дрэва. 11. Выкшталцоныя заляцаньні. 12. Раней асэтыны называлі так выгнанькаў з роду, якія сталі рабаўнікамі.

Склаў Аляксандар Ворвуль, vorvule@tut.by



Адказы.
Па гарызанталі: 1. Абрыс. 3. Кабат. 5. Балоньня. 7. Ілгун. 8. Кадка. 9. Паўза. 11. Фаўна. 13. Азіміна. 14. Рэмба. 15. Турак.
Па вэртыкалі: 1. Арэлі. 2. Салён. 3. Конік. 4. Танга. 5. Багоўка. 6. Яндоўка. 9. Пекар. 10. Асіна. 11. Флірт. 12. Абрэк.

Адказы на крыжаванку, зьмешчаную ў «НН» №40.
Па гарызанталі: **1**. Пяцісотгоддзе. **8**. Разэтка. **9**. Цэ. **10**. Абабак. **11**. Барсук. **12**. Саван. **13**. Ка. **14**. Му. **15**. Ціск. **16**. Кара. **18**. Юс. **19**. Ява. **20**. Шаман. **22**. Го. **21**. Кант. **24**. Бра. **25**. Гвардзеец. **26**. Міт. **27**. Ежа. **28**. Тэлеглядач. **29**. Шнур.
Па вэртыкалі: **1**. Прасцяг. **2**. Стан. **3**. Ода. **4**. Дар. **5**. Дасье. **6**. Злучок. **7**. Дэгустатар. **11**. Барадзед. **13**. Камэдыя. **16**. Капрал. **17**. Анкета. **20**. Шлянг. **23**. Лешч. **25**. Гол.

Запрашаем у падарожжа
7 лістапада (нядзеля)
па маршруце: **Нарач—Паставы—Камаі—Дунілавічы—Лучай—Глыбокае.** 20000
14 лістапада (нядзеля)
Крэва—Баруны—Гальшаны—Дзясятнікі—Вішнева—Валожын. 18000
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)
264-12-38, 776-24-35 (Павал)

Украінскія выданьні ў Менску

У Менску ў продажы зьявіўся шэраг папулярных украінскіх выданьняў: часопіс «Критика» (выпускі 1—6 за гэты год), «Український гуманітарний огляд» (выпускі 5—9), «Україна модерна» (нумары 7—8), а таксама кнігі: Е.Кінан «Російські історичні міти», З.Когут «Коріння ідентичності. Студії з ранньомодерної та модерної історії України», М.Рябчук «Зона відчуження», Я.Грицак «Страсті за націоналізмом», Н.Яковенко «Паралельний світ. Дослідження з історії уявлень та ідей в Україні XVI—XVII ст.», М.Рябчук «Дилеми українського Фауста». Іх можна замовіць праз тэл.: (029) 643-57-33, e-mail: exlibris@tut.by, паштовы адрас: Менск,220050, п/с 333.

Андрэй Хадановіч

ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Halloween

На календар зірнуць — і патрымцець крыху,
на зьмярканьні згадаўшы аб мёртвых
і чараўніцах.
Сёньня калі і вынясуць гарбуза жаніху,
то гарбуза з вачніцамі й сьвечкамі ў вачніцах.

Поўнач яшчэ ня хутка — сьведчыць зімовы час,
ды на замшэлых магілках ажываюць паданьні.
Не пераверў гадзіньніка — і пасьпееш якраз
на вясельны абрад да пекнай нявесты-здані.

Хто рамантызм пасеяў, хутка зьбярэ ўраджай.
Што табе ў тым шкілеце, ваўкалаку, грыфоне?
Можа, усё яшчэ скончыцца добра, толькі
зважай,
з кім займаешся сэксам па тэлефоне...

Хто яшчэ здольны пакінуць у люстэрку сьляды?
Усе мы ахвяры таемнага, халуі Хэлоўіну.
Хто дажыў да сьвітаньня — адсьвяткуе Дзяды,
дый астатнім няблага: зданяў — уся краіна.

31 кастрычніка — 1 лістапада 2004

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ФУТБОЛ

ДЮСШ па футболе «Тарпэда» (г.Менск, вул.Украінская, 5, ст.м. «Аўтазаводзкая») праводзіць набор хлопчыкаў 1992/93 і 1996/97 гадоў нараджэньня. Даведкі праз т. 756-81-99. Трэнэр — Кушнер Алесь

ВІТАНЬНІ

Taniu Kazak vinšuju z narodzinami. Badzioraści duchu i mocy, kab ździejśnić usio zadumanaje. Siamion

Vinšujem Taniu Kazak! Da vinšavańniaū dałučajucca Elfy, Chobity i navat złyja Orki. Mužyki

Шчыра віншуем суседзкую чараду Лебедзяў са зьяўленьнем яшчэ аднаго лебедзяняткі! Саўкі

Дзядзьку Алеся Лагвінца віншуем з маральнай вікторыяй! Уладзь Б., Ганка Ж., Надзейка М., Андрусь В., Тацянка Ф.

КАМПУТАР

Прадаю кампутар Cyrix-200/14 Гц/128/4G/V 214б/M 32/k/m-70; манітор 14 IBM-3D. Т.: 8-029-553-97-34, Зьміцер

КНІГІ, МУЗЫКА

Кніга Аляксандра Фядуты «Александр Лукашенко. Его время, его народ» замест лістапада выйдзе ў студзені 2005 году. Папярэднія замовы можна дасылаць на электронны адрас: feduta-book@mail.ru

Куплю «Архівы БНР» (Менск—Прага, 1998 г. Укладальнік С. Шупа). Т.: 716-04-22

Новыя нумары «Arche», «Расейска-крыўскі (беларускі) слоўнік» Власта, «Беларуска-расейскі слоўнік» Байкова і Некрашэвіча, «Слоўнік мовы Янкі Купалы» (т.1), Энцыкляпэдыя гісторыя Беларусі, іншыя кнігі, часопісы, відэа, аўдыё, CD, майкі з нацыянальнай сымболікай на Румянцава, 13 (ТБМ) з панядзелка да пятніцы, 11.30—17.30

6 лістапада а 13.00 у клюбе філяфаністаў у ДК МТЗ адбудзецца сустрэча зь лідэрам гурту «Троіца» Іванам Кірчуком. У праграме — раздача аўтографаў, адказы на пытаньні.

7 лістапада — он-лайн-канфэрэнцыя з Іванам Кірчуком на сайце www.kraina.by. Пачатак у 19.00.

Увага! Штосуботы з 11.00 да 15.00 у клюбе філяфаністаў у ДК МТЗ (ст.м. «Трактарны завод») працуе гандлёва-абменная кропка беларускай музыкі. Вас чакаюць: сустрэчы зь вядомымі музыкамі, знаёмства з аднадумцамі, музычныя навінкі, прадукцыя па самых нізкіх цэнах, квіткі на канцэрты і шмат іншага. Даведкі: 241-24-74, 766-24-25 (Янак)

Увага! Шточацьвер у офісе Таварыства беларускай мовы (пл.Перамогі, Румянцава, 13) адбываюцца сходы фанклюбу беларускай музыкі

Прадам кнігі: Я.Сямашка «Армія Краёва», энцыкляпэдыі «Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне», «Археалёгія і нумізматыка», «Архітэктура Беларусі», «Этнаграфія Беларусі». Т.: 236-02-15

Прадам кнігі: В.Ластоўскі «Расейска-крыўскі (беларускі) слоўнік» 1924, Байкоў, Некрашэвіч «Беларуска-расійскі слоўнік» 1926, Л.Юрэвіч «Камэнтары», паэзія: П.Элюар, У.Ўітмэн, Г.Гайнэ, В.Маракоў, Я.Пушча, У.Галубок, Я.Дыла ды інш. Т.: 236-02-15

Кнігаабмен. Дапамагу знайсьці патрэбную кнігу. Т.: 8-029-753-91-96

Прадам CD: «NRM» — «Spravazdača» (з аўтографам Вольскага), «Ulis» — «Падарожжа», «Стары Ольса» — «Шлях», «Partyzone» — «Трэба рабіць». Т.:8-029-509-18-23 (Зьміцер)

Шукаюцца распаўсюднікі беларускай музычнай прадукцыі (дыскі, касэты, плякаты, значкі, саколкі). Зьвяртайцеся: 241-24-74, 766-24-25; а/с 5, 220085, Менск

Куплю кнігу І.Марзалюка «Людзі даўняй Беларусі». Т.: 243-98-10, Наталя

Прадаю CD: «Partyzone» — «Трэба рабіць», «Генэралы айчыннага року». Т.: 8-029-509-18-23, Зьміцер

Куплю «Беларускую энцыклапэдыю», т. 1—3, 6, 7; «Энцыкляпэдыю гісторыі Беларусі», т. 4, 5. Т.: 613-70-85, Алесь

Прадам кнігі: «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі», т.1, 2, «Археалёгія Беларусі» ў 4 т., «Беларускія пісьменьнікі» ў 6 т., часопіс «pARTisan» 1/2—2. Т.: 283-37-45

КВАТЭРА

Прыстойны ліцьвін-студэнт здыме з Новага году 1-пакаёвую кватэру. Пажадана ў раёне пл.Я.Коласа. Зьвяртайцеся на тэл.: 678-33-38. Уладзь

Здыму пакой, тэрмінова. Т.: 408-09-25. Андрэй

ПРАЦА

Ладныя пераклады з ангельскай, польскай, францускай, украінскай, расейскай на беларускую/ангельскую. Зьвяртайцеся на тэл.: 678- 33-38. Уладзь

Павал Севярынец шукае працу ў Менску. Грамадзкі мэнэджмэнт, адукацыя, публіцыстыка. Т.: 8-0212-21-45-31

19—21 лістапада
запрашаем у вандроўку
Варшава часоў «Салідарнасьці»
Т.: 661-30-38, 202-23-38 (Алена), 755-03-70 (Зьміцер).
Кошт: 25 у.а. + віза.

НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

Алесю П. зь Менску. Каб стаць літаратарам, трэба лепш спазнаць мову. Прыкладам, па-беларуску «абіраюць» бульбу, «лупяць» яблык, «шмаруюць» чаравікі, а ня «чысьцяць», як пішаце вы. А там, дзе вы пішаце ў двукосьсі «угораздило» — «собіла», як падказвае ў «Жывой мове» Ю.Бушлякоў. Выходзіць: «І собіла ж мне трапіць амонаўцу проста ў шлем».

Студэнту. Гаварыце па-беларуску, і ваша жыцьцё зьменіцца. Тады фэльетоны стануць мацней сьцьвярджаць жыцьцё.

ШУКАЕ МІЛІЦЫЯ



Жлобінскім РАУС устанаўліваецца месцазнаходжаньне зьніклага бязь вестак Драка Ігара, 8.12.1972 г.н., ураджэнца пас. Луцкі, Жлобінскага раёну, пражывае: г.Жлобін, вул. Заслонава, д.25, які 13.10.2003 г. сышоў з дому і да цяперашняга часу яго месцазнаходжаньне не ўстаноўлена.

Прыкметы Драка І.: на выгляд 30—35 гадоў, рост каля 169 см, целаскладу хударлявага, твар авальны, валасы сьветлыя, акругласьць галавы 54 см, памер абутку 40.

Пры сыходзе быў апрануты: куртка бэжавая восеньская з плашчоўкі, нагавіцы цёмна-зялёныя, пантофлі карычневыя скураныя на шнурках.

Просім грамадзян, якім вядома што-небудзь пра месцазнаходжаньне шуканага, а таксама пра акалічнасьці яго зьнікненьня, паведаміць у Жлобінскі РАУС па тэлефонах (02334) 2-88-47, 2-29-90, 3-13-42, 3-13-66 альбо ў найбліжэйшы аддзел міліцыі па тэлефоне 02.

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі	Наста Бакшанская
галоўны рэдактар	Андрэй Дынько
фотарэдактар	Арцём Лява
карэктарка	Настасься Мацяш
нам. галоўнага рэдактара	Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар	Андрэй Чык
мастацкі рэдактар	Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік	Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3514. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 21.00 3.11.2004.
Замова № 6738.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а